ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Ідзе падпіска на IV квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс		на 1 месяц	на 3 месяцы
63850 (індывідуальны)		10600	31800
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)		9990	29970
63858 (ведамасны)		17050	51150
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)		15550	46650
Да запатрабавання (праз газетныя кіёскі РУП «Белпошта»)			
63850 (індывідуальны)		9460	28380
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)		8850	26550
63858 (ведамасны)		14926	44778
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)		13639	40917
Да запатрабавання (праз кіёскі «Белсаюздруку»)			
63850 (індывідуальны)		8410	25230
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)		7830	23490
63858 (ведамасны)		11086	33258
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)		10525	31575

Беларусь і ў далейшым будзе самастойна вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю палітыку

Аб гэтым заявіў журналістам у Тураве Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь да гэтага часу прытрымлівалася шматвектарнай палітыкі і будзе яе прытрымлівацца ў далейшым. Ён чарговы раз нагадаў, што Беларусь не выбірае паміж Расіяй і Захадам, а гатова выбудоўваць канструктыўныя адносіны з усімі. «У нас шматвектарная палітыка, мы аб'явілі яе з першых дзён майго прэзідэнцтва і прытрымліваемся да гэтага часу, падабаецца гэта камусьці ці не. Усё астатняе — гэта пустыя выдумкі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы і ў далейшым прыкладзём максімум намаганняў, каб забяспечыць шматвектарнасць».

«Калі з Расіяй у нас няма практычна ніякіх глабальных праблем, то з Захадам вы ведаеце нашы адносіны. Калі Захад хоча з намі супрацоўнічаць на прынцыпах, на якіх супрацоўнічае з іншымі дзяржавамі, мы з задавальненнем будзем гэта рабіць, — сказаў Прэзідэнт. — Што недапушчальна, я ўжо гаварыў: калі тут тым або іншым чынам хочуць разбурыць краіну і зламаць курс, які ў Беларусі праводзіцца, тады нам не па дарозе ні з адной палітычнай сілай, ні з адной дзяржавай».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь — суверэнная і незалежная дзяржава, якая і ў далейшым будзе вызначаць сваю знешнюю і ўнутраную палітыку самастойна: «Мы будзем слухаць усіх — і на Захадзе, і на Усходзе, але жыць мы будзем сваім розумам». «Ніякіх тут разваротаў, паваротаў няма і быць не можа. Расія заўсёды была, ёсць і будзе нашай брацкай, роднай дзяржавай. Можа, камусьці гэта рэжа слых, але гэта так», — дадаў беларускі лідар. Што ж датычыцца Захада, то «гэта тэхналагічна развіты рэгіён, гэта суседзі, там палавіна тавараабароту». «І гэтым усё сказана», — адзначыў Прэзідэнт.

Прэзідэнт мяркуе, што Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА) зацікаўлена ва ўступленні ў свае рады ўсіх дзяржаў — удзельніц Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. «Пажывём — убачым, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Пакуль, на дэкларатыўным узроўні, у Мытным саюзе ўсё ідзе добра. Калі з гэтага атрымаецца тое, што мы запланавалі, — будзе выдатна, нават калі пакуль мы не ўступім у СГА». «Але мне здаецца, СГА будзе вельмі зацікаўлена ў тым, каб мы былі ў гэтай арганізацыі. Таму што гэта вялікія тэрыторыі, вялікая колькасць людзей і вялікія рэсурсы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь зацікаўлена ў праектах альтэрнатыўных шляхоў паставак энерганосьбітаў, у тым ліку беларускі бок з цікавасцю вывучае прапановы Украіны па ўдзеле ў праекце будаўніцтва нафтаправода «Адэса — Броды». «Адразу адзначу: «Адэса — Броды» — гэта не новы для нас праект», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Дыверсіфікацыя паставак энерганосьбітаў — гэта нармальная, класічная практыка для любой краіны», — дадаў ён.

«Мы не можам залежаць толькі ад аднаго месца (напрыклад, ад Расіі) у спажыванні энергарэсурсаў, — падкрэсліў беларускі лідар. — Тым больш, што былі праблемы ў сувязі з гэтым». «Таму мы пачалі альтэрнатыўныя пошукі. Ці ўвянчаецца гэта поспехам, не ведаю. Будзе вынік, будзе эканамічная эфектыўнасць — тады будзем дзейнічаць у гэтым напрамку. Усё будзем рабіць разумна», — растлумачыў Прэзідэнт. «Адэса — Броды», пастаўкі з Венесуэлы, пастаўкі ў Прыбалтыку, пастаўкі з Каспія да Чорнага мора і прапампоўка сюды — мы розныя шляхі пралічваем», — сказаў ён.

«Пакуль нам выгадна атрымліваць вуглевадароды з Расійскай Федэрацыі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Стане нявыгадна — мы ўжо сёння павінны бачыць іншыя шляхі». Ён падкрэсліў, што няма ніякай надзвычайшчыны, і гэтыя праекты не новыя.

Адносна прапановы Літвы аб развіцці сумесных з Беларуссю праектаў па транзіце тавараў, у тым ліку энерганосьбітаў, праз тэрыторыю нашай краіны Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы таму і ўвайшлі ва «Усходняе партнёрства», што там, акрамя зоны свабоднага гандлю, нам прапанавалі выгадныя транзітныя праекты, аднаўленне гэтых шляхоў. Мы над гэтым таксама даўно працуем». «Калі Прыбалтыка адносна гэтага будзе зацікаўлена (а яны зацікаўлены, зразумела, таму што гэта вялікі грузапаток, загрузка партоў і г.д.), мы таксама ў такім напрамку будзем дзейнічаць, таму што гэта ў нашых інтарэсах», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што названыя праекты не супярэчаць нічыім геапалітычным інтарэсам: ні Расіі, ні Захаду.

Беларусь не будзе браць на сябе крэдытныя абавязацельствы, якія не зможа выканаць. «Усё, што звязана з тым, што не вытрымае наша эканоміка, мы на сябе браць не будзем, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Нам трэба вырашыць галоўнае пытанне — захаванне стабільнасці беларускага рубля».

Што ж датычыцца росту цэнаў, то, як лічыць Прэзідэнт, праблем тут быць не павінна. «Наадварот, у гэтай сітуацыі мы апасаемся падзення цэнаў, таму што гэта ўдар па вытворцах. Мы ўжо зніжаем цэны, каб прадаць сваю прадукцыю», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што па абавязацельствах перад Міжнародным валютным фондам урад і Нацбанк даложаць яму ў найбліжэйшы час. «Тады і вызначымся, якія абавязацельствы мы на сябе бяром, а якія не», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Меліярацыя Беларускага Палесся будзе на 50 працэнтаў субсідзіравана з рэспубліканскага бюджэту. Як чакаецца, для меліярацыі сельгасугоддзяў Гомельскай вобласці будзе выдзелена Br100 млрд, з іх Br50 млрд — з рэспубліканскага бюджэту. «Вы адказваеце галавой за цану кожнага меліяраванага гектара, — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да губернатара Гомельскай вобласці Аляксандра Якабсона. — А то ж у мяне ёсць горкі вопыт работы з будаўнікамі. Помніце, калі яны нічога не рабілі і стаялі на каленях: маўляў, дайце работу. Мы іх поўнасцю забяспечылі работай — і што мы атрымалі? Тры—пяць гадзін у дзень працуюць, а потым жывот грэюць. І гэта ва ўмовах рыначнай эканомікі!» Кіраўнік дзяржавы параіў меліяратарам не браць з іх прыклад.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ВЕРАСНЯ 2009 г. ЧАЦВЕР № 165 (26523)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Сакрэты бянюнскага дудара

Як адраджаецца старажытная музычная традыцыя

Шануй сваё!

Цяпер гэты легендарны інструмент у Беларусі могуць варта зрабіць толькі некалькі чалавек. Сапраўдных майстроў пералічыш па пальцах адной рукі. Але ж у былыя часы нашы продкі не ўяўлялі свайго жыцця без дуды, якая лічылася неад'емнай рысай побыту. Дык чаму шатландцаў атаясамліваюць з валынкай, а ў нас старадаўні інструмент забыты? Адшукаць чалавека, які робіць дуды, было не так проста. Але, напэўна, трэба толькі нечага вельмі захацець і калісьці ўсё абавязкова здзейсніцца. Так атрымалася і з дударом — майстра я знайшоў у невялікай вёсцы Бянюны, што на Ашмяншчыне...

СВЯТАР НА КАПІШЧЫ

Звычайны вясковы дамок, які пафарбаваны ў аранжавы і зялёны колеры, драўляны плот — нічога адметнага. Насустрач выбягае невялічкі сабака і... радасна віляе хвастом. Мабыць, адчувае, што я завітаў сюды з добрымі намерамі. А вось і гаспадар сядзібы з усмешкай у вусах. Юрась Панкевіч — адзін з беларускіх дударoў. Інтарэс да інструмента маюць многія, толькі вось не кожнага да сябе дуда падпускае — містыка ды і толькі.

— Ёсць такія рэчы, якія я для сябе растлумачыць не магу, — заўважае Юрась. — Бывае, што зойдзеш у майстэрню рабіць адну і тую ж аперацыю, якую дагэтуль выконваў неаднойчы, і нічога не атрымліваецца. А ў наступны дзень можаш зрабіць удвая больш, без асаблівых высілкаў. Здараецца, завершыш драўляную дэталь (вытачыш, пафарбуеш, на паліцу пакладзеш), а з раніцы глядзіш — патрэскалася. А іншым разам возьмеш сырое дрэва і ўсё як належыць атрымаецца.

Як заўважае Панкевіч, дуда да нас не прыходзіла з-за мяжы, а «нарадзілася» менавіта тут. Гэта, дарэчы, сцвярджаецца і ў даследаванні славутага майстра Тодара Кашкурэвіча. Заўсёдны край дударскі — паўночная частка цяперашняй Беларусі, дзе ў свой час жылі балцкія плямёны. Узрост дуды на гэтых землях адлічваюць з IX—X стагоддзяў. І дудар тады быў не толькі музыкам, які граў на танцульках, а сапраўдным святаром. Дуда гучала падчас паганскіх рытуалаў, калі людзі збіраліся на капішчы.

— Варта хоць бы ўзгадаць святы, што захаваліся дасюль — усім вядомыя Каляды, — кажа Юрась Панкевіч. — Калі каза памірала, а пасля ператваралася ў іншую істоту. Майстар апрацоўваў скуру жывёлы і да Вялікадня рыхтаваў інструмент. У паганскія часы яго выкарыстоўвалі толькі на працягу года. Пасля дуду разбівалі аб дрэва альбо вешалі на дуб. І рабілі другі інструмент. У калядных, валачобніцкіх песнях захаваліся сведчанні пра тое, як гэты інструмент нараджаўся і як паміраў.

«АНГЛЕЗА ШАГАМ ПРАМЕНАДА»

У Сярэднявеччы дуда пайшла з вёскі ў больш буйныя паселішчы (мястэчкі, гарады). І там атрымала іншае прызначэнне — весяліць людзей. У выніку чаго класічная традыцыя перамешвалася з вясковым густам.

— Гэта асаблівасць беларускага фальклору, — заўважае Юрась Панкевіч. — Простыя людзі прыслужвалі панам у палацах і чулі ўрачыстыя мелодыі, пераймалі іх. У этнографа Міхала Федароўскага мы знайшлі адзін вельмі цікавы танец «Англеза». Там ёсць такія словы — «англеза шагам праменада». Іх даследчыку ўзгадала звычайная бабуля-суседка. Можа карані ў яе былі шляхецкія альбо продкі добра ведалі панскі побыт. Тэкст нагадвае эпоху Адраджэння, музыку замкаў і палацаў.

Юрась скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Здавалася б, спецыяльнасць абраў зусім далёкую ад музыкі. Але аднойчы пачуў дуду на адным канцэрце і моцна захапіўся гэтым інструментам. Яму захацелася самому зрабіць дуду. Панкевіч знайшоў майстра, які дапамог, навучыў, падзяліўся прафесійнымі сакрэтамі. Гадоў 5-6 таму Юрась зрабіў свой першы інструмент. Прычым зрабіў па ўсіх канонах — вырабляў скуру, шыў мех, тачыў драўляныя часткі.

— Я заўсёды пачынаю з меха, — кажа дудар. — Калі я яго зраблю і пастаўлю пераходнікі, то лічу, што палова дуды гатовая. Пасля ўстаўляю гукі, жалейкі, соскі. Можна паступаць паразнаму: набыць скуру ў краме (ужо выбраленую), знайсці дуба меха гортэкс (матэрыял, які выкарыстоўваюць для пашыву вайсковага адзення, ён не прапускае паветра).

— А мех можа быць розны па велічыні?

— Памер меха не рэгламентаваны, можна рабіць як заўгодна, абы зручна пад рукой было. Галоўнае, каб мех добра трымаў паветра. Наконт гэтага кожны майстар свае сакрэты мае. Мех не вечны, таму выкарыстоўваюцца зменныя. У дудзе ёсць невялікі гуказдабывальны элемент — пішчык. Ад яго многае залежыць, інакш дуда — толькі кавалак скуры і палкі, якімі біцца можна. Этнографы ўзгадвалі, што дудары, калі на вяселлі пачыналася бойка, здымалі са сваіх бурдонаў трубкі і біліся. Тое ж і са скрыпкамі: скрыпачы казалі, што калі інструмент не разаб'еш аб каго на якім свяце, то добра граць не навучышся.

ЛЕПЕЛЬСКАЯ, ДВУХБУРДОННАЯ І «МАЦЯНКА»

У Шатландыі гэты інструмент называецца «вялікая шатландская дуда». Яму зрабілі вельмі добрую рэкламу, таму добра вядомы ва ўсім свеце. Чаго не скажаш пра беларускую дуду. Між тым, інструмент мае свае адметнасці — па канструкцыі меха, трубак, аздабленні. Дарэчы, дуды ў нас звычайна аздабляліся металам — як правіла, волавам. Выкарыстоўвалася ліццё, быў своеасаблівы арнамент. У беларусаў бурдоны (ці гукі) — такія доўгія трубкі — заўжды звісалі ўніз, да долу. У шатландцаў іх тры, а на нашых землях, як сведчаць этнографы, у інструментах было да сямі. Але пра канструкцыю такой дуды застаецца хіба толькі здагадвацца, паколькі іх не захавалася. Як узгадваў адзін чалавек: «Трубак было ўсяго сем, а дзве маленькія моцна дурылі галаву». Беларускія дуды мелі свой гукарад (ён адрозніваецца ў кожнай краіне).

— Цяпер у Беларусі дакладна вядома тры тыпы дуды, — заўважае Юрась Панкевіч. — Першы — лепельская дуда. Такі інструмент захоўваецца ў музеі гэтага райцэнтра, з яго майстры здымаюць копіі. У лепельскай дудзе жалейкі завяршаюцца раструбамі. Калі ў іншых краінах іх рабілі з рагоў жывёл, то тут выкарыстоўваецца дрэва. Тачэнне вельмі прыгожае, аздобленае металам. Ёсць апісанне двухбурдоннай дуды, якая, дарэчы, была найбольш распаўсюджаная. Яшчэ адна — напэўна, самая выкшталцоная. Яна мае асабістую назву — «мацянка». Гэта дуда без рагаўнёў, ззаду — тры бурдоны, якія даюць адзін пастаянны гук, «бурдоняць». Раней па такім тыпу людзі спявалі, а пасля з'явілася дуда. Я лічу, што гэта сімвал беларуса, адлюстраванне нашай душы, эмоцый. Мы маем не менш падстаў ганарыцца сваёй дудой, чым шатландцы. Проста нехта ўмее рабіць рэкламу, а нехта не здольны прасоўваць уласныя традыцыі. Але ні ў якім разе нельга забываць пра свае карані.

ДРЭВА ДЛЯ СКУЛЬПТАРАЎ

На выраб дуды майстру звычайна патрэбна не менш за месяц. Мех — гэта паўсправы, а вось з чаго рабіць астатнія часткі? Звычайна выкарыстоўваецца драўніна клёну і ясеню. Рагаўні робяць з больш мяккіх парод — напрыклад, з ліпы, якая, дарэчы, лічыцца дрэвам для скульптараў.

— Дрэва — жывы матэрыял, — упэўнены Юрась Панкевіч. — Адзін майстра кажа, што яно павінна набраць пазітыўных вібрацый, толькі тады інструмент будзе гучаць адпаведным чынам. Калі ж зрабіць дуду і проста пакласці яе на паліцу, то за пару месяцаў яна ссохнецца і не будзе граць. Ёсць такі тэрмін «разыграны інструмент» — яны больш цэняцца. Дуда вабіць да сябе, выклікае цікаўнасць. Яшчэ ў 1953 годзе на ВДНГ у Маскву беларусы пасылалі свайго дудара. Вядома, што тады на выставе граў Ігнат Гвоздзь. Дудары ездзілі і па Еўропе. Вельмі распаўсюджаны калісьці быў інструмент. Пасля настаў час гармонікаў, скрыпачак. Некалькі гэтых музычных інструментаў маглі разам граць. Чаго не скажаш пра дуды — кожны музыка сваю дуду больш на слых настройваў і граць разам яны не маглі.

Затое цяпер майстры могуць настройвацца па частотах з дапамогай камп'ютараў. Аднойчы на фестывалі грала адначасова да двух дзясяткаў дудаў — нічога сабе відовішча, праўда?! Цяпер ёсць і электронная дуда, яе яшчэ называюць «жалейка для практыкаванняў». Тэхніка грання на дудзе надзвычай складаная, асвоіць яе магчыма толькі з дапамогай музыкаў. На жаль, адпаведны прадмет не выкладаецца ў беларускіх ВНУ. А вось пачуць гучанне аўтэнтычнага інструмента магчыма.

— Мы з сябрамі займаліся гістарычнай рэканструкцыяй, — кажа Юрась Панкевіч. — Калі пашылі сабе касцюмы, то захацелася, каб і музыка адпаведная гучала. У выніку арганізавалі групу, якую назвалі «Testamentum terrae». У перакладзе з лацінскай мовы — «Запавет зямлі». Гэта тое, што зямля захавала і запаведала нам несці далей, каб пакінуць для нашчадкаў. Але мы займаемся не столькі рэканструкцыяй аўтэнтычнай музыкі, колькі яе сучаснай аранжыроўкай. Вывучаем літаратуру — розныя зборы, даследаванні этнографаў.

Першы альбом групы называўся «Слаўны паніч», цяпер рыхтуюць другі, якія вырашылі прысвяціць этнографу Міхалу Федароўскаму. Разам з дудой граюць жалейкі, флейты, мандаліны, скрыпкі, бубны, барабаны і нават лютня. Як заўважае Панкевіч, усе інстументы аўтэнтычныя, але з іх дапамогай складаецца сучасная музычная эмоцыя. Слухачам вельмі падабаецца. Гурт існуе пяць гадоў, за гэты час з канцэртамі аб'ездзілі не толькі ўсю Беларусь, выступалі і ў замежжы.

У Бянюнах Юрась пачаў абуладкоўвацца некалькі гадоў таму. Кажа, што вясковае жыццё яму больш даспадобы, хоць нарадзіўся і вырас «на асфальце» — у сталіцы. А вось стаў бліжэй да зямлі і, здаецца, адшукаў для сябе нешта важнае. Заняўся рамонтам хаты, узводзіць лазню. Ну і, вядома, робіць дуды. Цяпер у Панкевіча поўная калекцыя беларускіх дудаў — напэўна, адзіная ў нашай краіне.

— Пакуль што адпаведная музычная традыцыя ў нас хутчэй экзотыка, — адзначае дудар. — Але я спадзяюся, што з цягам часу сітуацыя ўсё ж зменіцца да лепшага. Магчыма, калісьці будзеце ехаць па трасе і ўбачыце шыльду «Вы ўязджаеце ў дударскі рэгіён Беларусі». Завітаеце і пачуеце спрадвечныя матывы, якія абуджаюць сэрца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Ашмянскі раён.

Фота з архіва Юрася Панкевіча.

Пяць гадоў за «скарочаныя» вопісы маёмасці

Упраўленнем КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці заведзена крымінальная справа па арт. 424 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Злоўжыванне ўладай або службовым становішчам») у дачыненні да старэйшага судовага выканаўцы аднаго са сталічных судоў 26-гадовага Аляксандра Чычыкава.

Як паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці, следства вызначыла, што спадар Чычыкаў на працягу 2007—2008 гадоў падчас выканання службовых абавязкаў у працэсе вопісу і канфіскацыі маёмасці грамадзян наўмысна, з карыслівай зацікаўленасці заніжаў кошт апошняй або проста не ўносіў у вопіс пэўныя прадметы. Урон, які нанеслі дзеянні судовага выканаўцы, склаў не менш за 160 млн рублёў. Суд Фрунзенскага раёна г. Мінска прызнаў А.В. Чычыкава вінаватым і прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам 5 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Чацвёра загінулі па дарозе ў Мінск

На 64-м кіламетры аўтадарогі Мінск—Віцебск у выніку лабавога сутыкнення развіталіся з жыццём тры жанчыны і хлопчык, якому 7 верасня павінна было споўніцца два годзікі.

— У ДТЗ, якое адбылося ў Лагойскім раёне, загінулі кіроўца аўтамашыны «Рэно-19» і яе пасажыры — знаёмая, яе дачка і ўнук — удакладніў старшы інспектар УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ. — Усе яны пражывалі на Віцебшчыне. Няшчасце адбылося, паводле папярэдніх звестак, па віне 29-гадовага кіроўцы «Аўдзі-100», які атрымаў правы 2 гады таму. Апошні вырашыў абагнаць «Рэно» па абочыне. Але няўдалая спроба скончылася сутыкненнем. У выніку аўтамабіль «Рэно» выехаў на палосу сустрэчнага руху, дзе сутыкнуўся з фурай. Акрамя пасажыраў і кіроўцы «Рэно», якія загінулі, ахвяраў больш няма. Кіроўца «Аўдзі» знаходзіцца пад вартай.

Надзея ДРЫЛА.

Падпіска-2009

ЗВЯЗДОЎСКІ «ВІЦЯЗЬ» — НА ВІЦЕБШЧЫНУ

Рэдакцыя газеты «Звязда» працягвае раздаваць «па заслугах» сваім чытачам — развозіць каштоўныя прызы, якія нашы людзі выйгралі ў штоквартальнай латарэі.

На гэты раз звяздоўскі маршрут ляжаў у Глыбоцкі раён, дзе ў вёсцы Галубічы каляровы тэлевізар «Віцязь» мы павінны былі ўручыць падпісчыцы са стажам Ірыне Іванаўне Сабыніч. Дарога на Віцебшчыну была цікава яшчэ і іншымі сустрэчамі.

Звяздоўцы з задавальненнем завіталі на Лагойшчыну, дзе нанеслі візіт ветлівасці кіраўніцтву мясцовай «вертыкалі» ў асобе старшыні райвыканкама Івана Магера і супрацоўнікаў паштовай сувязі. Традыцыйна нашы шляхі праходзяць і праз Смалявіцкі раён. І на гэты раз мы мелі добрую сустрэчу з яго кіраўніком Аляксандрам Рулькевічам, які заўсёды з павагай ставіцца да «Звязды». Не менш цёплай атрымалася сустрэча і на Барысаўшчыне. Кіраўнік раёна Уладзімір Мірановіч яшчэ раз падкрэсліў, што «Звязда» займае дастойнае месца ў рэгіёне і пажадаў старэйшаму ў краіне, адзінаму штодзённаму беларускамоўнаму выданню далейшых творчых поспехаў.

На жаль, з-за вялікай занятасці старшыня Глыбоцкага райвыканкама Міхаіл Кандэрскі не змог прыбыць у Галубічы для ўручэння тэлевізара, хоць у тэлефоннай размове з журналістам «Звязды» шчыра пажадаў сваім землякам выйграваць як мага больш.

Ролю сапраўднага тамады ўзяла на сябе старшыня мясцовага сельскага Савета Ганна Цішко. Яна так бойка адрапартавала аб поспехах і праблемах свайго ўчастка адказнасці, што падумалася: гэта якраз той чалавек, які з паўслова знойдзе агульную мову з людзьмі, якія пражываюць амаль у трох дзясятках населеных пунктаў, што тэрытарыяльна ўваходзяць у склад сельсавета. Ганна Платонаўна быццам бы па сакрэце сказала, што мае вельмі мяккі характар, за што часам і церпіць. Тым не менш, зрабіла заключэнне яна, душэўная дабрыня і настойлівасць дапамагае ёй вырашаць многія жыццёвыя задачы.

За настойлівасць перад фартунай была ўзнагароджана і спадарыня Сабыніч. Яна ўжо не адзін дзясятак гадоў з'яўляецца падпісчыцай «Звязды». Ірына Іванаўна прызналася, што даволі часта пасылала ў рэдакцыю купоны на розыгрыш. І вось, нарэшце, выйграла каштоўны прыз. Як яна распарадзіцца каляровым тэлевізарам? Амаль такі ж у яе дома ёсць. Таму, не хавала радасці пенсіянерка, яна з задавальненнем падорыць яго сваёй дачцэ Ганне, што працуе бібліятэкарам у Глыбокім. А то, кажа Ірына Іванаўна, 11-гадовы ўнук Андрэй ужо штодня засыпаў бабулю пытаннем: калі ж прывязуць тэлевізар?

Усю радасць з Ірынай Іванаўнай і яе мужам Леанідам Віктаравічам раздзеляць яшчэ сын Уладзімір, які пражывае ў Мінску, і чацвёра ўнукаў. Павіншавалі звяздоўскую лаўрэатку і работнікі Галубіцкага сельскага Савета, паабяцаўшы, што пасля гэтага прыезду звяздоўцаў колькасць падпісчыкаў у іх акрузе абавязкова вырасце.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота аўтара.

Прамая лінія

АЛЕРГІІ Ў ДЗЯЦЕЙ

Пра гэта можна распытаць **загадчыка кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, прафесара, доктара медыцынскіх навук Уладзіміра Фёдаравіча ЖАРНАСЕКА.** «Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў **чацвер, 10 верасня з 14.00 да 15.30** па нумарах **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах **8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НАТА ПАДОЎЖЫЛА МІСІЮ ПА АХОВЕ НЕБА БАЛТЫІ ДА 2014 ГОДА

Пра гэта паведаміла літоўскае Міністэрства аховы краю. Гэта азначае, што прыняты кампрамісны варыянт: місія НАТА павінна была скончыцца ў канцы 2010-га, а Балтыя прасіла падоўжыць яе да 2018 года.

Нагадаем, Паўночнаатлантычны альянс узяў пад ахову паветранную прастору над краінамі Балтыі 29 сакавіка 2004 года — адразу пасля ўступлення іх у блок. З тых часоў краіны НАТА, змяняючы адна адну, нясуць вахты працягласцю 3-4 месяцы на аэрадроме Зокняй у Шаўлі, дзе размешчаная база Ваенна-паветраных сілаў Літвы. Пры гэтым на аэрадроме базіруюцца, як правіла, чатыры знішчальнікі ВПС краіны, якая выконвае місію. Цяпер дзяжураць прадстаўнікі нямецкага войска са сваімі знішчальнікамі Eurofighter. За ўвесь час тут пабывалі каманды з 15 краін.

ПРЭЗІДЭНТ МАЛДОВЫ САСТУПІЦЬ МЕСЦА ПРАЗАХОДНЯМУ ЛІБЕРАЛУ

Уладзімір Варонін пакідае пасаду прэзідэнта Малдовы і сыходзіць у апазіцыю, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на афіцыйную заяву кіраўніка дзяржавы. Паводле закона, выконваць абавязкі прэзідэнта цяпер будзе спікер парламента Міхай Гімпу — лідар Ліберальнай партыі.

«Я, як старшыня Камуністычнай партыі, не збіраюся ў гэту крытычную для Радзімы і для нашай партыі гадзіну заставацца ў даволі сумнеўным і двухсэнсоўным становішчы выканаўцы абавязкаў прэзідэнта, — заявіў Варонін. — У мяне няма ні маральных, ні палітычных падстаў для таго, каб проста фармальна выконваць гэтую высокую дзяржаўную функцыю». Ён падкрэсліў, што рашуча выступае супраць палітыкі новай кіруючай кааліцыі «За еўрапейскую інтэграцыю».

КРАІНЫ ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ РОБЯЦЬ СТАЎКУ НА ЯДЗЕРНУЮ ЭНЕРГЕТЫКУ

«Некаторыя энергетычныя праекты цяпер перагледаюцца. Аднак попыт на энергію ўсё яшчэ працягвае расці, і рана або позна можна чакаць наступнага развіцця ядзернай, ветранай і сонечнай энергетыкі», — лічыць кіруючы партнёр кансалтынгавай кампаніі Accenture Стывен Вертшульт.

Яркі прыклад — Польшча. Сёння гэтая ўсходнееўрапейская дзяржава на 95 % залежыць ад вугалю. Па ацэнках экспертаў, будаўніцтва атамных рэактараў дапаможа краіне пазбавіцца ад гэтай залежнасці і звесці да мінімуму выкіды вуглякіслага газу ў атмасферу. «Ёсць усе падставы меркаваць, што да 2020 года Польшча пабудуе некалькі ядзерных рэактараў», — адзначае прадстаўнік Fitch Ratings Аркадзіўс Вічык.

Праўда, крызіс унёс свае карэктывы. Напрыклад, Балгарыя, улады якой спрабуюць правіцца з негатыўнымі наступствамі крызісу, замарозіла або наогул адмовілася ад часткі ядзерных праектаў.

Падобная доля напаткала і літоўскія ядзерныя рэактары, паколькі ўлады гэтай прыбалтыйскай дзяржавы дагэтуль не вызначыліся з фінансаваннем праектаў.

УКРАІНА ЎЗНІМЕ КОШТ НА ТРАНЗІТ РАСІЙСКАГА ГАЗУ

Нацыянальная акцыянерная кампанія «Нафтагаз Украіны» чакае ў 2010 годзе росту тарыфу на транзіт расійскага прыроднага газу на 57—60 % у параўнанні з дзейным сёлета тарыфам 1,7 долара за транзіт 1000 куб. м на 100 км. Такім чынам, плата за транзіт газу можа павысіцца на 1 долар — да 2,7 долара за 1000 кубаметраў на 100 км, паведамляе газета «Справа».

«Пачынаючы з 2010 года тарыф будзе разлічвацца па формульным падыходзе з чаканым павелічэннем прыблізна на 57—60 % у 2010 годзе», — гаворыцца ў апублікаванай кансалідаванай справаздачы кампаніі.

Нагадаем, сакратарыят прэзідэнта заяўляў пра тое, што «Нафтагаз Украіны» часткова разлічыўся з расійскім Газпрамам за пастаўлены ў красавіку газ за кошт авансу за транзіт расійскага газу праз тэрыторыю Украіны.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 845,00
▼ 1 еўра	4 043,88
1 латвійскі лат	5 747,47
1 літоўскі літ	1 170,97
1 чэшская крона	157,20
1 польскі злоты	967,05
▼ 1 расійскі рубель	88,98
1 украінская грыўня	335,69

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,9730
UAH	37,7263
1000 BYR	11,2979
EUR	45,4880

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларусь і ў далейшым будзе самастойна вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю палітыку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Кантроль будзе строгі, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба вызначыць дакладна: вось гэты ўчастак меліяравалі варта столькі, і больш, чым гэта сума, ты не атрымаеш». Трэба дакладна ведаць цану кожнага канала, кожнай дрэнажнай трубкі і гэтак далей, дадаў кіраўнік дзяржавы.

З меліярацыяй недапушчальна зацягваць, паколькі «з кожным годам цана падвойваецца», падкрэсліў Прэзідэнт. «Будучы год — гэта год разбегу, уцягванне ў праграму па меліярацыі. Да першага года будучай пяцігодкі мы павінны выйсці на штогадовыя максімальныя аб'ёмы меліявання — дапусцім, 25 тыс. га. І за будучую пяцігодку мы павінны поўнасцю аднавіць меліяваныя землі, не забываючы пра падтрымку тых зямель, якія прыдатныя сёння», — сказаў беларускі лідар.

Меліярацыя набывае асаблівую актуальнасць на фоне росту попыту на сусветных рынках на прадукцыю сельскай гаспадаркі. «Попыт і далей будзе расці неймаверна. І мы павінны быць у гэтай рыначнай нішы, каб выгадна прадаць сваю прадукцыю і атрымаць добрыя грошы. Такім чынам, мы зможам вярнуць тыя сродкі, якія ўклалі ў праграму адраджэння вёскі», — адзначыў Прэзідэнт.

Праграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў Беларусі не падлягае ніякай карэкціроўцы, а тым больш скарачэнню. «Абсалютна не ідзе размова аб скарачэнні і карэкціроўцы гэтай праграмы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што калі «мы вырашылі стварыць квітнеючую дзяржаву, то без развіцця вёскі гэта зрабіць немагчыма». На думку Прэзідэнта, праграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў — гэта прадаўжэнне праграмы адраджэння беларускай вёскі, паколькі ў такіх гарадах у большай ступені сканцэнтравана перапрацоўка прадукцыі, якая вырошчваецца вёскай.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адной з галоўных задач з'яўляецца занятасць мясцовага насельніцтва. Дзяржава і раней, да прыняцця гэтай праграмы, спрабавала вырашыць названую праблему, але гэта рабілася хаатычна. На думку кіраўніка дзяржавы, стварэнне ў малых гарадах прадпрыемстваў, падобных да кансервавага завода ў Тураве, — гэта вырашэнне праблемы занятасці мясцовага насельніцтва. Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што ў гэтым напрамку ў краіне зроблена ўжо нямала.

Сяргей Сідорскі і Уладзімір Пуцін сустрэнуцца ў найбліжэйшы час у Маскве

Прэм'ер-міністры Беларусі Сяргей Сідорскі і Уладзімір Пуцін сустрэнуцца ў найбліжэйшы час у Маскве. Аб гэтым паведаміў у Гданьску журналістам Сяргей Сідорскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«1 верасня мы дамовіліся з Уладзімірам Пуціным аб тым, што ў найбліжэйшы час у верасні, я думаю, праз тыдзень, правядзём рабочую сустрэчу ў Маскве», — сказаў ён.

«Мы дамовіліся абмеркаваць кола праблем, якія наспелі ў эканоміцы ў развіцці тых пытанняў, якія абмяркоўваліся на апошнім саюзным Саўміне, і даручэнняў, якія даў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым», — растлумачыў Сяргей Сідорскі.

Акрамя таго, 1 верасня адбыліся перагаворы Сяргея Сідорскага з прэм'ер-міністрам Літвы Андрусам Кубілюсам. «Мы дамовіліся, што ў верасні правядзём беларуска-літоўскі эканамічны форум», — дадаў ён.

Прайшла таксама кароткая сустрэча Сяргея Сідорскага з прэм'ер-міністрам Італіі Сільвіо Берлусконі ў рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 70-й гадавіне пачатку Другой сусветнай вайны, на могілках абаронцаў Вестэрплатэ.

Беларусь у найбліжэйшы час можа рэалізаваць некалькі буйных праектаў з польскімі кампаніямі, паведаміў Сяргей Сідорскі.

«1—2 верасня я правёў шэраг сустрэч з польскімі кампаніямі, якія хочуць актыўна працаваць на беларускім рынку», — адзначыў ён.

У першую чаргу гэта буйная польская кампанія «Кульчык холдынг». «Мы на працягу паўгода пасля Лонданскага інвестыцыйнага форуму вядзём актыўную работу з гэтай кампаніяй па праекце будаўніцтва вугальнай станцыі. Вугаль польскі, станцыя — у Беларусі з пастаўкай электраэнергіі ў ЕС і часткова ў Беларусь», — растлумачыў Сяргей Сідорскі.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, гэта цікавы эканамічна выгадны праект. «Мы ўчора абмяркоўвалі гэту тэму, яна знайшла падтрымку і ва ўрадзе Дональда Туска. Я лічу, у бліжэйшы час мы выйдзем на рэалізацыю гэтага праекта», — адзначыў Сяргей Сідорскі.

Акрамя таго, беларускі бок прапанаваў кампаніі «Кульчык холдынг» разгледзець яшчэ адзін праект па будаўніцтве вугальнай станцыі ў Лельчыцах. На гэты час разведвальныя работы ў гэтым раёне завершаны. Арыенціровачная магутнасць гэтай станцыі ацэньваецца ў 400 МВт.

Паводле слоў кіраўніка беларускага ўрада, аб'ём інвестыцый у гэтыя два праекты можа скласці $1,5—2 млрд. «Кульчык холдынг» гатовы прыцягнуць гэтыя рэсурсы ад іншых інвестыцыйных кампаній. З беларускага боку спатрэбяцца пэўныя гарантыі.

Сяргей Сідорскі таксама правёў сустрэчы з кіраўніцтвам АТ «Электрабудова», якое выказала зацікаўленасць пастаўляць энергетычнае і электраабсталяванне ў Беларусь для будучай АЭС.

З кампаніяй «Фамур» абмеркаваны пытанні стварэння сумеснай вытворчасці горна-шахтавага абсталявання. Пытанні кансультацыйнага ўдзелу ў прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў і банкаў былі разгледжаны на сустрэчы Сяргея Сідорскага з АТ «AKJ Investments».

«Што датычыцца Гданьска, то мы выказалі жаданне выйсці на порт у гэтым годзе. Праект, які цяпер рэалізуецца ў Брэсце з чэшскай кампаніяй і Беларускай чыгункай па будаўніцтве тэрміналаў, цікавы для польскіх кампаній, якія маглі б працаваць з удзелам гданьскага порта. Гэта нядрэнная перспектыва. Ёсць усе магчымасці, каб працаваць на польскім рынку», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

Акрамя таго, былі праведзены перагаворы з гданьскай кампаніяй «Грыф», якая ажыццяўляе перавозку пасажыраў па гарадскіх і прыгарадных маршрутах на Памор'і. «Па ініцыятыве польскага боку мы абмеркавалі пытанне паставак аўтобусаў МАЗ. Лічу, што 100—150 МАЗаў мы маглі б тут рэалізаваць», — сказаў прэм'ер-міністр.

Загінулыя ў польшчы беларускія лётчыкі будуць пахаваны сёння ў Баранавічах

Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве абароны Беларусі.

Самалёт з целамі загінулых на авіяшоу ў Радаме (Польшча) беларускіх лётчыкаў-снайпераў палкоўнікаў Аляксандра Марфіцкага і Аляксандра Жураўлевіча прызямліўся на аэрадроме ў Баранавічах. У Баранавічах 2 і 3 верасня аб'яўлена жалоба па загінулых, бо менавіта тут жылі і служылі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч. У горадзе адменены забаўляльныя мерапрыемствы, прыспушчаны дзяржаўныя сцягі.

Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА.

ПРЭЗІДЭНТ ПОЛЬШЧЫ ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З ГІБЕЛЛЮ БЕЛАРУСКІХ ЛЁТЧЫКАЎ НА АВІЯСАЛОНЕ Ў РАДАМЕ

На імя кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі паступіла тэлеграма Прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага, у якой выказваюцца спачуванні ў сувязі з катастрофай беларускага знішчальніка Су-27 на авіясалоне ў польскім горадзе Радам і гібеллю пілотаў, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі.

Уладзімір Макей і Ганс-Ёган Шміт абмеркавалі пытанні супрацоўніцтва Беларусі і АБСЕ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей сустрэўся з кіраўніком Офіса АБСЕ ў Мінску Гансам-Ёганам Шмітам, які завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

У час сустрэчы было абмеркавана шырокае кола пытанняў супрацоўніцтва Беларусі з АБСЕ. Ганс-Ёган Шміт падрабязна расказаў аб праводзімай Офісам рабоце па аказанні садзейнічання беларускаму ўраду ў далейшым развіцці дэмакратычных працэсаў у краіне і лібералізацыі эканамічнай палітыкі, а таксама ажыццяўленні праектнай дзейнасці. Кіраўнік Адміністрацыі высока ацаніў намаганні Ганса-Ёгана Шміта, пад кіраўніцтвам якога дзейнасць Офіса набыла апошнім часам устойлівы канструктыўны і ўзважаны характар. Офіс стаў важным інструментам узаемадзеяння Беларусі з інстытуцыянальнымі структурамі АБСЕ, іншымі еўрапейскімі арганізацыямі.

У той жа час Уладзімір Макей выказаў засмучэнне тым, што ў сувязі з абставінамі прынята рашэнне аб датэрміновым пераводзе Ганса-Ёгана Шміта на іншую работу. Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, беларускі бок ясна разумее сутнасць і прычыны выказаных супраць кіраўніка Офіса папрокаў з боку асобных краін — членаў Арганізацыі і прадстаўнікоў радыкальнай апазіцыі, разглядае іх як непрыязныя і беспадстаўныя, мэта якіх — аказаць націск на характар дзейнасці Офіса ў цэлым, падарваць існуючы давер да яго з боку ўлад Беларусі. У гэтых умовах, як было адзначана кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, беларускі бок вымушаны сур'ёзна задумацца над перспектывамі далейшай дзейнасці Офіса АБСЕ ў Мінску, у тым ліку адносна назначэння яго новага кіраўніка. Тым больш што аб'ектыўных падстаў для існавання палявой прысутнасці АБСЕ ў Беларусі няма.

Рэспубліка Беларусь спадзяецца, што такія падыходы будуць адэкватна і з разуменнем успрыняты ключавымі еўрапейскімі партнёрамі, з якімі беларускі бок гатовы і ў далейшым развіваць даверны і адкрыты дыялог па ўсіх актуальных пытаннях, заявіў Уладзімір Макей. На заканчэнне сустрэчы ён выказаў надзею, што багаты прафесійны вопыт і высокія дзелавыя якасці Ганса-Ёгана Шміта будуць запатрабаваны на новым месцы работы, і пажадаў яму поспеху.

НЕ РАЗЛІЧЫЙСЯ — ПАВІНЕН ПЛАЦІЦЬ

Твае правы

Уладкаванне жыхароў рэгіёнаў у больш «грашавітым» Мінску — практыка амаль звычайная. Але не заўсёды ўдалая. Бо не сакрэт: раз-пораз у сталіцы таксама ўзнікаюць праблемы з выплатай зарплаты. Што рабіць у такім выпадку? І як быць, калі затрымліваюць канчатковы разлік пры звальненні? Зрэшты, адказ тут просты — звярнуцца на працягу трох месяцаў у суд. Прычым у тым жа судзе работнік мае поўнае права запатрабаваць спагнання з наймальніка свайго сярэдняга заробку за кожны дзень затрымкі канчатковага разліку або, калі разлік быў праведзены не цалкам, — спагнання заробку прапарцыянальна «недаплачаным» сумам.

Між тым, ці павінна залічвацца ў час абавязковай «адпрацоўкі» маладога спецыяліста інтэрнатура, якой можа быць максімальная працягласць змены і ці заўсёды ёсць сэнс датэрмінова спыняць «дэкрэтны» водпуск дзеля перспектывы заняць больш высокую пасаду? Усё гэта стала тэмамі чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што адбылася ў Пастаўскім раёне.

З чаго пачаць адлік?

Маладога спецыяліста накіравалі на пасаду правізара ў аптэку, працоўны дагавор быў заключаны з 1 жніўня 2007 года, пасля чаго пачалася інтэрнатура. А восенню таго ж года выйшла пастанова аб змяненні парадку размеркавання выпускнікоў медыцынскіх ВНУ. У прыватнасці, пастанова прадугледжвае: час інтэрнатуры ў абавязковую «адпрацоўку» ўжо не ўваходзіць. І ўсё ж, ці «працуе» падобнае правіла ў гэтым канкрэтным выпадку?

— Сёння час інтэрнатуры ў абавязковую «адпрацоўку» па размеркаванні сапраўды не ўваходзіць, што даволі лагічна: стажор — яшчэ не ўрач, — зазначае намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння і нагляду Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Вадзім Браташ. — Разам з тым, паколькі спачатку пачаліся працоўныя адносіны і толькі потым — з'явіліся змяненні ў заканадаўстве, тут могуць узнікнуць падставы для працоўнай спрэчкі. І вырашаць яе трэба ў судзе.

Прывабна. Але без гарантый

Жанчыне, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, прапануюць датэрмінова выйсці на працу, і прычым — на больш высокую пасаду. Варыянт нібыта цікавы. Калі б не адна акалічнасць: прапанаваная пасада вызвалілася ў выніку выхаду іншай супрацоўніцы ў «дэкрэт».

— Асабіста я параіў бы спачатку добра падумаць,— заўважае Вадзім Браташ. — Сутнасць у тым, што тут адбудзецца ўладкаванне на часовае месца паводле тэрміновага працоўнага дагавору. І, па-першае, гэта азначае, што ў такой сітуацыі немагчымыя дадатковыя меры стымулявання па кантракце — «лішнія» дні водпуску і павелічэнне тарыфнай стаўкі ці акладу. А па-другое, трэба мець на ўвазе: тэрміновы працоўны дагавор будзе заключаны толькі да моманту, пакуль не выйдзе на працу асноўны работнік. Прычым зрабіць гэта асноўны работнік можа ў любы дзень, адпаведна, напярэдадні часовы работнік будзе звольнены, нягледзячы на наяўнасць маленькага дзіцяці.

Іншы момант — вяртанне на «сваю» ранейшую пасаду. У такім разе заключаецца кантракт з усімі неабходнымі стымуламі. І да таго ж як мінімум да часу, калі дзіцяці не споўніцца 5 гадоў.

Палова стаўкі з поўнай дапамогай

Датэрміновае спыненне «дэкрэтнага» — з'ява даволі папулярная. Ніякіх перашкод тут быць проста не можа: работнік мае права напісаць заяву на выхад на ранейшае месца практычна ў любы дзень, а абавязак наймальніка — гэту заяву задаволіць. Сумненні ўзнікаюць наконт іншага: ці захаваецца ў такім выпадку за жанчынай права на дапамогу па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў?

— Дапамога выплачвацца будзе, але раскладка тут наступная, — адказвае Вадзім Браташ. — Калі жанчына перапыняе «дэкрэтны» і выходзіць на поўную стаўку, то памер дзіцячай дапамогі змяншаецца на 50 %. А калі не перапыняе водпуск па доглядзе і падчас яго працуе на ўмовах няпоўнага працоўнага часу (не больш чым палову месячнай нормы гадзін), то дапамога працягвае выплачвацца ў поўным аб'ёме.

12 гадзін — гэта «столь»

Работнікі арганізацыі працуюць у дзве змены, прычым працягласць адной з іх — 14 гадзін. Ці можа так быць?

— У нас існуе пералік прафесій, працягласць працоўнага дня па якіх можа перавышаць 12 гадзін, — кажа Вадзім Браташ. — Аднак такіх прафесій няшмат. Таму, каб прывесці працягласць працы ў норму, супрацоўнікі арганізацыі могуць звярнуцца ў міжраённую інспекцыю працы.

Прычым раз-пораз сустракаецца і такая практыка. Каб не парушыць заканадаўства, наймальнік піша ў табелі ўліку працоўнага часу 12 гадзін. У рэальнасці ж змена працягваецца больш. Тады задача работнікаў — даказаць перапрацоўку. Для гэтага неабходна звярнуцца ў суд, які, да слова, можа прыняць да ўвагі нават паказанні сведак.

Абед заўсёды па раскладзе

Працягласць працоўнага часу — тэма сапраўды вострая. Але не адзіная. Бо калі-нікалі ўзнікае і іншае няпростае пытанне — ці павінны ў арганізацыі прадугледжваць перапынак на абед?

— Ёсць прадпрыемствы, дзе прадугледзець перапынак на абед немагчыма з чыста тэхналагічных меркаванняў, але і тут работніку павінны забяспечвацца ўмовы для харчавання, як кажуць, «без адрыву ад вытворчасці», — тлумачыць Вадзім Браташ. — Зрэшты, пералік такіх прадпрыемстваў зноў-такі невялікі. Абсалютная ж большасць арганізацый бесперапыннага цыклу не мае, і тут вызначэнне перапынку на абед — непасрэдны абавязак наймальніка. Заканадаўства ж прадугледжвае, што мінімальная працягласць такога перапынку можа складаць 20 хвілін, а максімальная — 2 гадзіны. Прычым работнік можа выкарыстоўваць гэты час выключна па ўласным меркаванні.

Галоўнае — калдагавор

Працягваць або не працягваць кантракт — права наймальніка. Прычым уплываць на яго рашэнне па сутнасці немагчыма, асабліва калі той жа наймальнік зрабіў своечасовае паведамленне. І ўсё ж пытанні часам узнікаюць. Напрыклад, ці можна «проста развітацца» з работнікам, які аддаў арганізацыі... 27 гадоў?

— Пастановай Савета Міністраў рэкамендавана працягваць кантракты з работнікамі, якія маюць вялікі стаж, на тэрмін, не меншы за 3, а з высокакваліфікаванымі работнікамі — за 5 гадоў, — нагадвае Вадзім Браташ. — Прычым, калі гэта рэкамендацыя замацаваная ў калектыўным дагаворы, ёсць усе падставы дамагацца працягу кантракта. А калі наймальнік супраць, то можна звяртацца ў камісію па працоўных спрэчках або ў суд.

Атэстацыя не тайна

Яшчэ летась работнікі арганізацыі мелі 14 дадатковых дзён водпуску за шкодныя ўмовы працы. Сёлета гэтыя дні «знялі» з тлумачэннем: шкоднасць не пацвердзілася атэстацыяй працоўных месцаў. Чаму «раптам» спатрэбілася гэта атэстацыя? І ці павінны былі пазнаёміць з яе вынікамі работнікаў?

— З 2009 года дадатковы водпуск за працу ў шкодных ці небяспечных умовах даецца толькі па выніках атэстацыі працоўных месцаў, і правесці яе было неабходна яшчэ да 31 снежня, — распавядае Вадзім Браташ. — Прычым азнаямленне работнікаў з вынікамі атэстацыі — абавязак наймальніка. Калі ж гэтага не адбылося, то трэба звярнуцца да кіраўніцтва арганізацыі або ў міжраённую інспекцыю працы. І, дарэчы, варта таксама заўважыць: калі з вынікамі атэстацыі работнікі не згодныя, можна звярнуцца ў экспертызу ўмоў працы ў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама, якая і дасць адказ на пытанне, ці былі тут якія-небудзь парушэнні.

Апошняя надзея — суд

У савецкія часы грамадзянін Беларусі працяглы час працаваў на Крайняй Поўначы. Аднак для таго, каб афарміць датэрміновую пенсію, не хапіла месяца і 14 дзён неабходнага стажу. Што рабіць зараз?

Зрэшты, у гэтым выпадку па сутнасці рабіць ужо нічога не трэба. Магчымасць выхаду на датэрміновую пенсію за працу на Крайняй Поўначы або ў раёнах, што прыраўноўваюцца да яе, існавала ў заканадаўстве Савецкага Саюза. А вось заканадаўства Рэспублікі Беларусь такой магчымасці не прадугледжвае па вельмі простай прычыне — Крайняй Поўначы ў нас няма.

Не такая бязвыхадная сітуацыя — аднаўленне звестак аб ранейшай зарплаце. У пачатку 1990-х гадоў многія жыхары таго ж Пастаўскага раёна працавалі ў расійскіх вайсковых часцях. І дзе шукаць гэтыя часці цяпер — невядома.

Між тым, парада тут наступная. Крок першы — гэта зварот у вайсковы архіў у Падольску. А ў выпадку адсутнасці архіўных звестак, крок другі — гэта зварот у суд. Прычым суд можа ўлічыць такія «другасныя» дакументы, як разліковыя лісткі, прафсаюзныя, партыйныя ці камсамольскія білеты з пазначэннем памераў выплачаных узносаў і вызначыць заробкі за «страчаны» час. У сваю ж чаргу судовае рашэнне стане падставай для перараразліку пенсіі.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Паставы.

ВОСЕННЮ СІТУАЦЫЯ СА ЗНЕШНІМ ГАНДЛЕМ ПАВІННА ПАЛЕПШЫЦЦА

Менавіта так ахарактарызавала журналістам прагназуемыя тэндэнцыі ў эканоміцы нашай краіны на найбліжэйшы час намеснік міністра эканомікі Беларусі Таццяна СТАРЧАНКА.

Адзначаецца, што ў студзені—ліпені сёлета адбылося павелічэнне на 0,4 працэнта ўнутранага валавога прадукту ў параўнанні з леташнім перыядам. Суразмоўца патлумачыла, што пасля істотнага падзення актыўнасці на знешніх рынках айчынная прамысловасць была вымушана знізіць агульныя аб'ёмы вытворчасці сёлета на 3,9 працэнта. Аднак асобныя падраздзяленні галіны сёння нават значна павялічылі свае паказчыкі. Актыўна працягвае развівацца паліўны сектар, нафтаперапрацоўка (плюс 19,9 працэнта) і хімічная прамысловасць, дзе аб'ёмы вытворчасці павялічыліся на 32,4 працэнта.

Галоўная праблема прамысловасці цяпер — зніжэнне вялікіх запасаў гатовай прадукцыі на складах. За лістапад удзельная вага запасаў знізілася на 6,3 працэнта і склала 88,3 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Каля паловы запасаў прадукцыі прамысловасці прыпадае на машынабудаўнічы сектар, галоўным чынам па аўтамабілях.

Індэкс аб'ёму экспарту тавараў і паслуг за першае паўгоддзе склаў толькі 54,6 працэнта ў параўнанні з леташнім перыядам. А вось аб'ём імпарту зніжаецца не так хутка. У выніку дзейнай дынамікі адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі павялічылася і складае ў першым паўгоддзі 3,133 млрд долараў.

Галоўнай задачай усіх структур прамысловасці сёння стала актыўная экспартная палітыка па пашырэнні геаграфіі патэнцыяльных пакупнікоў, прапанаванне ім новых механізмаў сістэмы продажу. Сёння распрацоўваецца новы напрамак лізінгавага інструмента па прасоўванні айчыннай прадукцыі на расійскі рынак. Адпаведны дакумент па стварэнні такой лізінгавай кампаніі па продажы беларускай тэхнікі за межамі краіны ўжо падрыхтаваны Урадам.

Намеснік міністра эканомікі паведаміла, што на будаўніцтва жылых дамоў у студзені—ліпені сёлета выкарыстана 21,1 працэнта ад агульнага аб'ёму інвестыцый. За 7 месяцаў года ўведзена ў эксплуатацыю 3,206 млн квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, што адпавядае 53,4 працэнта гадавога задання. У параўнанні з мінулым годам тэмпы будаўніцтва жылля павялічыліся на 12,4 працэнта. Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, сёлета пабудавана 1,768 млн квадратных метраў жылля, з якіх 1,272 млн кв. метраў узведзена ў шматкватэрных жылых дамах гарадоў. У сельскіх населеных пунктах пабудавана 1,355 млн квадратных метраў жылля, што на 15,3 працэнта больш, чым за адпаведны перыяд летась.

Рэальная заработная плата па рэспубліцы з пачатку года павялічылася на 1,6 працэнта. Разам з тым, за гэты час рэальныя заробкі ў бюджэтных арганізацыях паменшыліся на 1,9 працэнта. Таццяна Старчанка адзначыла, што ў ліпені намінальная налічаная сярэднямесячная плата склала 1 млн 35 тысяч рублёў.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Таццяна Старчанка паведаміла, што вялікае адмоўнае сальда знешняга гандлю не павінна паўплываць на стабільнасць курсу нацыянальнай валюты. Паводле яе слоў, адмоўнае сальда пакрываецца дастатковымі аб'ёмамі знешняй запазычанасці. Больш за тое, сёння рынак краіны працуе стабільна і апасенняў не выклікае. Акрамя гэтага, па апошняй інфармацыі менавіта ў ліпені пачала паляпшацца сітуацыя з экспартам. Намеснік міністра адзначае, што эканамічныя эксперты шэрагу краін свету вядуць гаворку пра спыненне рэцэсіі і ажыўленне сваіх эканомік. У гэтым выпадку і эканоміка нашай краіны пачне зарабляць больш грошай на знешнім рынку.

Сяргей КУРКАЧ.

ІНТЭРНЭТ — НЕ ВОРАГ МАРАЛІ.

Але трэба разумець, што чытаеш

Такую думку выказаў Мікалай Чаргінец, Старшыня грамадскага Савета па маралі, які нядаўна быў утвораны ў Беларусі. Як чалавек і як пісьменнік Мікалай Іванавіч вельмі занепакоены маральным станам нашых суграмадзян, якіх сёння падпільноўваюць безліч спакусаў нават без выхаду з дому.

— Мы павінны навучыцца калі не кантраляваць, то адсочваць інтэрнэт, — падкрэсліў старшыня Савета па маралі. — Бо нават выпадкова можна натыкнуцца на нейкія сайты, дзе прапануюць прадаць непрыстойнае відэа гвалтавання дзяцей ці яшчэ нешта падобнае. І гэта глядзяць нашы дзеці — ім не забароніш сядзець у інтэрнэце. А мы, дарослыя, павінны падумаць, што тут зрабіць. Невыпадкова Еўрасаюз выступіў за кантроль над інтэрнэтам. Маецца на ўвазе не барацьба з інтэрнэтам, а нядопуск туды падобных рэчаў, перакрыццё магчымасці прапагандаваць гвалт, злосць, хамства. Канкрэтныя органы будуць вывучаць, якім чынам можна перакрыць гэтыя сайты. З інтэрнэтам трэба сябраваць, ён дае шмат цікавага. Мой унук павінен быў знайсці адказ на пытанне, хто такі Гай, імем якога названа вуліца ў Мінску. Адказ знайшоўся ў інтэрнэце. І я з задавальненнем пачытаў, што гэта камандзір легендарнага Жукава, які прымусіў яго паступаць у акадэмію.

Акрамя таго, грамадскі Савет па маралі збіраецца найперш паглядзець і вывучыць, дзе корань шмат якіх нашых праблем. Ён будзе імкнуцца паўплываць на вырашэнне праблемы смяротнасці і нараджальнасці, бо наша краіна штогод губляе да 50 тысяч чалавек — гэта насельніцтва невялічкага гарадка. На думку Мікалая Чаргінца, гэтая праблема нумар адзін, якая стаіць перад нашым грамадствам.

— Трэба сёння думаць пра выхаванне не толькі дзяцей, але і бацькоў. Каб яны не лічылі для сябе галоўным зрабіць прыемнае і нарадзіць дзіця, а потым яно расло само сабою. Але не прымусіш чалавека адчуваць сябе бацькам ці маці, — адзначыў Мікалай Чаргінец. — Часам здзіўляюць праявы «клопату» пра дзяцей, якія знаходзяцца ў катастрафічнай сітуацыі, нашых асобаў пры пасадзе, асабліва на месцах. У адным з выканкамаў Мінска чыноўнікі з гонарам дакладалі, што яны ўсё робяць, каб змагацца з неплацельшчыкамі за святло, за ваду, за цяпло. Прывялі прыклады кватэр, у якіх засталіся малалетнія дзеці, а іх маці-адзіночка сышла з дому, некалькі месяцаў яе не было. Старэйшы хлопчык выхоўваў брата і сястру. А чыноўнік кажа: мы адключылі ім святло, ваду, газ. Гэта была зіма. Я яго словамі мардаваў, імкнучыся выклікаць спачуванне, а не радасць ад таго, што ён ускладніў дзецям жыццё...

На думку Старшыні савета па маралі, наспеў час, каб падумаць грамадству: ці не ўвесці ў сістэму адукацыі такі прадмет, як асновы духоўнай культуры? Даць дзецям гісторыю веравызнанняў, не толькі праваслаўя. Гэта цікава і карысна.

— Савет па маралі не ставіць мэты выкарыстоўваць сілавыя рычагі, задзейнічаць адміністрацыйныя метады, — падкрэсліў Андрэй Алешка, загадчык юрыдычнага ўпраўлення Беларускай праваслаўнай царквы. — Савет — не дзяржаўны орган, гэта ініцыятыва Беларускай праваслаўнай царквы і Саюза пісьменнікаў Беларусі пры ўдзеле традыцыйных канфесій краіны. Наша задача — прыцягваць увагу да праблем, выкарыстоўваючы ўвесь спектр магчымасцяў, дазволеных у развітым грамадстве. У нас адкрытае грамадства фарміруецца. І мы спадзяёмся, што стварэнне нашага савета — яшчэ адзін крок у гэтым кірунку. Таму тыя, хто баіцца нейкай цэнзуры ці кантролю, не маюць падстаў для сваіх страхаў.

Дарэчы, Беларусь — першая краіна ў свеце, якой удалося стварыць грамадскі Савет, куды ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх існуючых у краіне канфесій.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Абзац

Новыя нормы ў правілы рускай мовы ў Беларусі ўводзіцца не будуць, заявіў карэспандэнту БЕЛТА дарадца міністра адукацыі па сувязях з грамадскасцю і СМІ Віктар Іўчанкаў, каментуючы ўвядзенне ў Расіі з 1 верасня рэкамендацыйнага спісу слоўнікаў і даведнікаў, што ўтрымліваюць нормы сучаснай рускай мовы. Па яго словах, у Беларусі ніхто не будзе пытацца ў школьніка ці студэнта пра тыя новаўвядзенні, што прапанаваныя ў чатырох зацверджаных даведніках. «Галоўнае, каб навучэнец змог назваць класічную форму, якая прысутнічае ў большасці даведачнай літаратуры. Перавучваць дзяцей гаварыць па-сучаснаму або прымушаць купляць менавіта гэтыя даведнікі для падрыхтоўкі да экзаменаў таксама ніхто з педагогаў не будзе», — заявіў прадстаўнік Мінадукацыі Беларусі.

Грамадзяніна Беларусі змыла хваляй у Балтыйскае мора. Зніклы — 38-гадовы майстарнякі гродзенскага філіяла мінскага ААТ «Прамтэхмантаж». Ён быў камандзіраваны ў Калінінградскую вобласць для мантажу абсталявання на адным з хімпрадпрыемстваў. Мясцовае МНС вяло пошукі беларуса, але пакуль безвынікова.

Тры ўзброеныя напады на таксістаў здзейсненыя за суткі ў Мінску. У ГУУС Мінгарвыканкама па тэлефоне 102 звярнуўся вадзіцель таксі і заявіў, што невядомы, якога ён падвозіў на аўтамабілі «Таёта», пад пагрозай падобнага на пісталет прадмета патрабаваў грошы. Праз некалькі гадзін з падобнай заявай звярнуўся іншы вадзіцель. Зламыснік завалодаў Br150 тыс. і двума мабільнымі тэлефонамі. У ходзе аператыўных мерапрыемстваў затрыманы раней судзімы жыхар Смалявічаў. Высветлілася, што ён паспеў ажыццявіць яшчэ адзін напад. У налётчыка канфіскаваны пнеўматычны пісталет.

Узгаранне смецця стала прычынай закрыцця станцыі метро «Пушкінская». НЗ адбылося 1 верасня ў 17 гадзін 55 хвілін. З-за узгарання смецця станцыя аказалася задымленай, у выніку чаго быў закрыты ўваход у яе. Праз 5 хвілін крыніца задымлення была ліквідаваная, станцыя адчынілася для пасажыраў.

10 аўтамабіляў сутыкнуліся ў ДТЗ на Мінскай кальцавой дарозе. Прычынай аварыі стала перавышэнне хуткасці. На шчасце, абышлося без пацярпелых, чаго не скажаш пра машыны, — большасць з іх узнавіць немагчыма.

Амаль тры гады дырэктар адной з мінскіх прыватных фірмаў выпампоўваў дзяржаўныя грошы з прадпрыемстваў, якія закупляліў яго дызельнае паліва. У поле зроку аператыўнікаў дзейнасць пастаўшчыкоў паліва трапіла, калі ў аўтапарках і аўтагаспадарках вадзіцелі пачалі скардзіцца на частыя паломкі транспарту. Следства Мінскага раёна, на тэрыторыі якога пераважна развярнуў сваю дзейнасць аферыст, выявіла як мінімум 15 фактаў, калі пад выглядам дызпаліва прадпрыемствам было прададзена пячное. У выніку толькі апошніх трох здзелак праз продаж больш як 90 т паліва было скрадзена амаль Br123 млн. Як сцвярджаюць праваахоўнікі, рэальны ўрон, нанесены дзяржаве, быў значна большым: істотна псаваліся аўтамабілі. Падазроны ўзяты пад варту. Да гэтага ён спрабаваў схавацца ад правасуддзя ў Расіі.

Супрацоўнікі ГУУС Бабруйска канфіскавалі ў мясцовага жыхара 740 г марыхуаны і больш за 11 кг канопляў. Наркатычныя рэчывы выяўлены ў ходзе аператыўных дзеянняў па месцы жыхарства беспрацоўнага, раней судзімага 33-гадовага бабруйчаніна. Заведзена крымінальная справа.

Вадзіцель фуры хаваў 80 тыс. пачкаў цыгарэт у вёдрах з тынкоўкай, але лідскія памежнікі выявілі схаваны тавар у пункце пропуску «Беняконі-1» пры даглядзе грузавога аўтамабіля «Сканія», які ехаў у Літву. Вадзіцель фуры, грамадзянін Расіі, схаваў цыгарэты ў 20-літоравыя вёдры з сухой сумессю для тынкоўкі. Цыгарэты і аўтамабіль канфіскаваныя. Сума кантрабанды з улікам аўтамабіля — Br160 млн. Вядзецца праверка.

У Германіі ўвайшла ў сілу забарона на наведванне салярыяў для моладзі да 18 гадоў. Цяпер маладыя наведвальнікі, якія хочуць атрымаць бронзавае адценне скуры, павінны будуць паказваць дакумент, што пацвярджае іх узрост. Штраф для ўладальнікаў салярыяў у выпадку парушэння складзе да 50 тыс. еўра. Урачы сцвярджаюць, што ультрафіялетавае выпраменьванне ўплывае на скуру людзей і можа прывесці да небяспечнай формы раку скуры — злаякаснай меланомы. Асабліва адчувальная да гэтага захворвання скура падлеткаў. Згодна з даследаваннямі нямецкіх спецыялістаў, у людзей да 30 гадоў, якія рэгулярна наведваюць салярыі, на 75 % павялічваецца пагроза небяспечнага захворвання.

Поўны абзац

Супрацоўнік транспартнай міліцыі РФ прайшоў ноччу 18 км, каб знайсці сумку пасажыра, што выпала з акна. Пасажыр, які ехаў цягніком Масква—Махачкала, заснуў на верхняй паліцы, а калі прачнуўся, зразумеў, што сумка з грашыма і дакументамі, якую ён паклаў пад галаву, выпала з акна вагона. Мужчына паведаміў пра гэта ў міліцыю падчас стаянкі цягніка. Неўзабаве старшы оперупаўнаважаны станцыі

аўта аматар

Не ПРЫШПІЛЬНА!

Віск тармазоў разануў паветра — і белая «дзявятка» спынілася як скамянелая. Падчас рэзкага тармажэння дзяўчынка, якая сядзела на заднім сядзенні ў аўтакрэсле, засталася нерухомай. А вось яе старэйшы брацік, які ў гэты момант стаяў, трымаючыся за спінкі пярэдніх сядзенняў, і размаўляў з дарослымі, стукнуўся галавой аб прыборную панель аўтамабіля і страціў прытомнасць...

На шчасце, замест дзяцей у аўтамабілі ехалі пластмасавыя лялькі. А вышэйапісаная сітуацыя — усяго толькі эксперымент, які вырашылі правесці супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі МУС, каб праверыць тэорыю на практыцы.

— Ведаеце, нашаму пасажыру-манекену яшчэ пашанцавала, — кажа **старшы інспектар УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ.** — У рэальнасці здараецца і такое, што непрышпіленае дзіця, як куля, вылятае на праезную частку праз лабавое шкло.

Толькі сёлета на дарозе загінула 29 дзяцей, больш за 400 атрымала траўмы (частка з іх на ўсё жыццё застанецца калекамі). Пакутуюць маленькія пасажыры, якія ў момант экстраннага тармажэння не былі прышпіленыя. Па сутнасці яны становяцца закладнікамі неразумных паводзінаў бацькоў-шумахераў, якія экана-мяць на бяспецы сваіх маленькіх пасажыраў.

Што ж з'яўляецца асноўнай прычынай адмовы бацькоў ад аўтакрэслаў? Адказ на гэта пытанне «Звязда» шукала разам з інспектарамі ДПС спецыяльнага падраздзялення «Страла» на мінскіх вуліцах.

...Сіні «Форд» спынілі на пр-спекце Дзяржынскага. На пытанне інспектара, чаму хлопчык не прышпілены, Леанід Ваўчэцкі толькі паціснуў плячыма.

— Аўтакрэсла засталося дома. Мы ж толькі туды і назад. Навошта прышпільвацца. Іншая рэч, калі б выехалі за горад.

Такой жа пазіцыі прытрымліваецца і Андрэй Казлоўскі, бацька шасцігадовага Сашы і васьмігадовага Славы. У яго жоўтым «Фальксвагене» наогул не прадугледжаны рамяні бяспекі для пасажыраў, якія сядзяць на заднім сядзенні.

Маленькі Жора ўражаны вынікамі эксперыменту.

— Езджу з дзецьмі мала. І, як правіла, на невялікія адлегласці, па вядомых маршрутах. У школу, паліклініку. Жывём тут, недалёка. Ды і не аматар я гонак, еду заўсёды павольна.

— А можа, пасля таго, як атрымалі папярэджанне ад інспектара ДАІ, купіце ўсё ж такі для большай бяспекі сыноў дзіцячыя крэслы, — угаворваем кіроўцу «Фальксвагена».

— Па крэслы не пайду дакладна. За час, пакуль яны ўсядуцца, можна будзе і назад прыехаць. Ды і не хачу аддаваць лішнія грошы. Іх і так заўсёды не хапае. А вось наконт рамянёў бяспекі падумаю.

Не апошнім па папулярнасці адказам быў такі: «За адсутнасць крэслаў не штрафуюць. Вось калі пачнуць — тады і куплю». Сапраўды, у нашай краіне наяўнасць дзіцячых утрымальных крэслаў носіць рэкамендацыйны характар. Але няўжо толькі штрафнымі санкцыямі можна пераканаць бацькоў, што лепш перастрахавацца, чым пасля ад гора рваць валасы на галаве?

■ ■ ■

Апошнім часам, пасля таго, як я стала відавочцай эксперыменту, міжвольна зазіраю ў вокны аўтамабіляў, каб пераканацца ў бяспецы чужых дзяцей. І не паспяваю здзіўляцца, якую свабоду малым даюць дарослыя. Немаўляткі ляжаць на каленях у шчаслівых матуль, старэйшыя дзеткі глядзяць у задняе шкло аўтамабіля, высоўваюцца з бакавых вокнаў і нават бегаюць па салоне! Паважаныя маці і таты, калі вы не ўяўляеце сабе наступстваў такой свабоды, зазірніце, пакуль не позна, ну, хоць бы на зводку няшчасных дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. За сухімі фактамі, якія там знойдзеце, мора слёз некалі такіх жа шчаслівых бацькоў, як і вы зараз.

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.

ДА ЎВАГІ БАЦЬКОЎ

НАВОШТА ПАТРЭБНЫЯ АЎТАКРЭСЛЫ?

— Пры рэзкім тармажэнні з хуткасцю 50 км/г (уявіце, што машыну скінулі з чацвёртага паверха) вага 10-кілаграмовага дзіцяці павялічваецца недзе да 300 кілаграмаў, — адказвае Станіслаў Салавей. — Маці, якая трымае сваю крывіначку на руках, не толькі не зможа засцерагчы яе ад рэзкага ўдару аб пярэдняе крэсла ці шкло, але і, ёсць верагоднасць, раздушыць вагой свайго цела. **Спецыяльнае ж дзіцячае аўтакрэсла, якім грэбуюць многія бацькі, па выніках краш-тэстаў павышае бяспеку дзіцяці ў 6 разоў. Безумоўна, у тым выпадку, калі яно правільна падабранае.**

ЯК ВЫБРАЦЬ КРЭСЛА ДЛЯ МАЛЕНЬКАГА ПАСАЖЫРА?

1) Для таго, каб выбраць аўтакрэсла, неабходна ведаць узрост і вагу дзіцяці. Арыентуйцеся перш за ўсё на вагу, а не на ўзрост, бо адзін хлопчык у тры месяцы важыць чатыры кілаграмы, а другі з такой вагой нараджаецца. **Таму — увага! — калі кансультант у краме цікавіцца выключна ўзростам сына і адразу ж раіць адпаведнае крэсла, ведайце, што вам аказваюць мядзведжую паслугу.**

2) Не палянуйцеся і зазірніце ў апошнія вынікі краш-тэстаў дзіцячых аўтакрэслаў. Звярніце ўвагу на назвы кампаній-вытворцаў, якія лідзіруюць, — пры пакупцы менавіта ім і аддавайце перавагу.

3) Выбірайце аўтакрэсла разам з дзіцем. Памятайце, што нават самае дарагое крэсла не сведчыць аб тым, што вашаму дзіцяці будзе там камфортна. Розныя дзеці любяць сядзець па-рознаму. Гэта таксама трэба ўлічваць.

4) Калі вам новае дзіцячае ўтрымальнае крэсла не па кішэні, то паглядзіце прыватныя аб'явы. Паверце, некаторыя добрыя людзі, дзеці якіх павыраслі, гатовы аддаць вам сваё крэсла за сімвалічную суму. Праўда, улічвайце, што яно таксама мае тэрмін дзеяння. Большасць экспертаў рэкамендуе не выкарыстоўваць адно і тое ж аўтакрэсла больш за 10 гадоў.

5) Да 12 гадоў (менавіта да такога ўзросту рэкамендуецца перавозіць дзіця ва ўтрымальным прыстасаванні) памяняць некалькі крэслаў розных узроставых груп. Аднак цяпер вырабляюць і аўтакрэслы, якія адпавядаюць адразу некалькім групам, — так званыя трансформеры. Яны каштуюць крыху даражэй за стандартнае аўтакрэсла, але ў цэлым вы зэканоміце. Пры выбары такога прыстасавання абавязкова звярніце ўвагу на наяўнасць такіх рэгуліровак, як вышыня падгалоўніка і бакавой падтрымкі.

КАМП'ЮТАРЫ ДЛЯ ВЕРАСНІЦЫ

Вяртаючыся да надрукаванага

Школу ў Верасніцы Жыткавіцкага раёна, самым сэрцы Палесся, сёння не пазнаць. Яшчэ ў канцы ліпеня тут поўным ходам ішла будоўля і мясцовыя жыхары не былі ўпэўнены, што дзеці пойдуць у адноўлены будынак. Сёння давер да абяцанняў улады адроджаны і настрой — толькі добры.

— Нічога дзівоснага няма, гэта агульная палітыка. Сацыяльную сферу развіваем, як і раней, — **старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН** традыцыйна стрыманы ў пачуццях. — Бюджэтнае фінансаванне сацыяльнай сферы практычна не паменшылася. Мы да 1 верасня на Гомельшчыне 3 школы адчынілі. Так што ідзём прыблізна ў тым тэмпе, як і раней — будуем па 3-4 школы ў год. Дзеці — будучыня нашай краіны. Пра гэта трэба клапаціцца, нягледзячы ні на што. Што датычыцца сучаснага выгляду, дык цяпер усе новыя школы такімі робяцца. Гэта 10 гадоў таму здавалася неверагодным — вясковая школа такога маштабу, узору, з такім абсталяваннем. Інтэрактыўныя дошкі сёння ў класах! Я ўспамінаю сваё дзяцінства — тады крэйды не было! Але ж сёння зусім іншыя падыходы і дзеці іншыя: яны з дзіцячага садка валодаюць камп'ютарам. Такі час, без гэтага нельга абысціся сёння. Аднак сапраўды, ведаеце, калі б мне вочы закрылі і прывезлі сюды — я не адразу зразумеў бы, дзе я знаходжуся — у горадзе ці ў вёсцы.

Поціск губернатарскай рукі. Першы падручнік уручае старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН.

Старшыня ААТ «Белаграпрамбанк» Сяргей РУМАС на малой радзіме.

Амаль 160 вучняў, якія селі сёлета за парты ў Верасніцкай агульнаадукацыйнай школе, — гэта перспектыва не толькі для ўстановы, але і для рэгіёна, які калісьці лічыўся «забітай глыбінкай». Між тым, менавіта яна час ад часу дорыць усёй Беларусі таленавітых людзей, якія з'яўляюцца гонарам краіны. Адсюль, з Тураўскай зямлі, родам і **старшыня праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Сяргей РУМАС.** У дзень ведаў землякі з удзячнасцю прымаюць падарунак ад акцыянернага таварыства, якім ён кіруе:

— Мы сёння па даручэнні Прэзідэнта вядзём работу па далучэнні да нашага акцыянернага таварыства, дзе Белаграпрамбанк — асноўны заснавальнік трох гаспадарак Жыткавіцкага раёна, у тым ліку і той, на тэрыторыі якой знаходзіцца Верасніцкая школа. Менавіта таму мы не маглі прыехаць на свята з пустымі рукамі — на працягу найбліжэйшых тыдняў абсталёўваем у школе самы сучасны камп'ютарны клас, які адпавядае ўсім санітарным нормам працы з дзецьмі. Калі з дапамогай банка мы зробім крок у напрамку сцірання межаў паміж горадам і вёскай, я буду вельмі рады. Мы наведалі выпускны клас — па тварах дзяцей сёння бачна, што гэта будучыя студэнты. Безумоўна, было б вельмі добра, каб яны тут, у школе, атрымлівалі такую адукацыю, каб на роўных здаваць тэсты і потым вучыцца з гарадскімі дзецьмі.

Складаная камп'ютарная тэхніка ад Белаграпрамбанка, як і інтэрактыўная дошка, між тым, трапяць у рукі сёлетняй выпускніцы Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта імя Івана Шамякіна, настаўніцы інфарматыкі і матэматыкі Кацярыны Птушко. Яна пакуль хвалюецца, як школьніца, але ж верыць, што і з дзецьмі, і з тэхнікай справіцца. Дзяўчына сама мясцовая — на працу ездзіць з суседняга Столінскага раёна Брэстчыны — але ж гэта 20 кіламетраў — рукой падаць!

Валянціна КАЗАК, дырэктар Верасніцкай школы, якая ў ліпеньскі мой прыезд была зусім нешматслоўнай, зараз пачуцці не стрымлівае.

— Усе задаволеныя. У вёсцы свята. Бацькі, дзеці і настаўнікі радасныя, з такім задавальненнем першы ўрок пра сваю Бацькаўшчыну правялі. Настрой іншы зусім, усе супакоіліся: улады стрымалі сваё абяцанне. Людзі паверылі, што будзе і другі этап — будаўніцтва спартыўнай залы. І прэсе людзі вераць. **Будзем падпісвацца на рэспубліканскую «Звязду» і мясцовую газету «Новае Палессе», якія нас падтрымалі.**

— Глядзіце, які ў нас клас прыгожы! Глядзіце, які ў нас двор прыгожы! — раз-пораз усклікаюць з гонарам і вучні, і настаўнікі.

Здаецца, людзі будуць цаніць і берагчы сваю адноўленую школу, якая мае паўвекавую гісторыю. Хто кветкі нёс, хто дрэўцы, толькі б хутчэй была СВАЯ школа. Літаральна кожны з жыхароў вёскі — ад малога да старога — узялі ўдзел у добраўпарадкаванні памяшканняў і тэрыторыі Верасніцкай школы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

Былыя настаўніцы Верасніцкай школы Лідзія ПЯТРЫЧЫЦ і Ніна БЛОЦКАЯ з унучкай, вучаніцай другога класа Ірынай БЛОЦКАЙ.

Пачынаецца перапрацоўка цукровых буракоў новага ўраджаю

Улічваючы значнае перавышэнне валавога збору цукровых буракоў над наяўнымі сутачнымі магчымасцямі па іх перапрацоўцы сёлета нарыхтоўка пачынаецца ў раннія тэрміны — з пачатку месяца. У верасні сельгасвытворцам і арганізацыям цукровай галіны неабходна нарыхтаваць і перапрацаваць 780 тысяч тон цукровых буракоў. У кастрычніку будзе перапрацавана 1 867 тысяч тон, у лістападзе — 1 353 тысячы тон. Усяго плануецца нарыхтаваць і перапрацаваць 4 млн тон цукровых буракоў, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».

Своечасовы пуск цукровых камбінатаў залежыць ад наяўнасці на заводскіх цукрапунктах двухдзённага запасу цукровых буракоў. Згодна з паведамленнямі арганізацый галіны, раннюю ўборку цукровых буракоў пачнуць 43 раёны, дзе яны вырошчваюцца. Усяго гэта 148 гаспадарак, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 36 гаспадарак, у Гродзенскай — 70, у Мінскай — 35, у Магілёўскай — 5, у Гомельскай вобласці — 2 гаспадаркі. Для стымулявання сельгасарганізацый, што пастаўляюць цукровыя буракі ў раннія тэрміны, а, значыць, з меншым працэнтам утрымання цукру, прадугледжаны надбаўкі да закупачнай цаны ў памеры: з 1 па 10 верасня — 20 працэнтаў, з 11 па 20 верасня — 10 працэнтаў, з 21 па 30 верасня — 5 працэнтаў. На 20 жніўня ўтрыманне цукру ў бураках складала 14,22 працэнта. З улікам дынамікі назапашвання цукру да пачатку верасня гэты паказчык павінен быў павялічыцца да 15,5 працэнта, што на 0,5—1 працэнт больш за леташні.

Прыёмка цукровых буракоў будзе весціся 18 цукрапунктамі і 17 цукрапляцоўкамі, агульная ўмяшчальнасць якіх па адначасовым захоўванні складае 1 600 тысяч тон. Цукрапункты ўкамплектаваныя ўсёй неабходнай тэхнікай, лабараторным абсталяваннем, вагавымяральнымі прыборамі. Каб пазбегнуць чэргаў пры разгрузцы, на ўсіх цэнтральных цукрапунктах прайшла ўкараненне электронная сістэма прыёмкі цукровых буракоў, зацверджаны графікі працы цукрапунктаў. Нарыхтоўка цукровых буракоў павінна быць завершана да 21 лістапада. Закупачная цана на іх захавана на ўзроўні мінулага года — 75 тысяч рублёў за тону. Ранейшымі засталіся і цэны на спадарожную прадукцыю.

У перыяд падрыхтоўкі да сезона праведзена рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў цукровай галіны. За студзень — ліпень было асвоена 87,2 мільярда рублёў інвестыцый. У выніку вытворчыя магутнасці павялічыліся і склалі 26,8 тысячы тон у суткі. Сярэднясутачная вытворчасць па перапрацоўцы цукровых буракоў, згодна з папярэднімі разлікамі, павінна скласці 28,5 тысячы тон. У выніку вытворчасць цукру з буракоў у сезон 2009—2010 гадоў павінна дасягнуць узроўню, што плануецца не ніжэйшым за леташні — 515 тысяч тон. Гэтыя аб'ёмы дазволяць цалкам задаволіць патрэбы ўнутранага рынку і забяспечыць добры экспартны патэнцыял.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЛЬМЫ КАЛЯ ХАТЫ

У вёсцы Міхайлоў, што ў Слаўгарадскім раёне, з'явіліся пальмы. І няхай яны не натуральныя, а выкрабленыя з пластыку, але аўтамабілі нязменна тармозяць каля дома № 17 на адзінай вуліцы невялікай вёскі ў глыбінцы.

Гаспадары Вішнеўскія зрабілі цэлую кампазіцыю: белы лебедзь з пакрышкі, круглыя клумбы з духмянымі кветкамі са старых трактарных колаў і, нарэшце, дзве трапічныя пальмы з пластыкавых бутэлек. Ствалы — карычневыя, лісты — зялёныя і, як і належна, махрыстыя. Канструкцыя трымаецца на драўляных палках і металічных прутах.

Ініцыятарам сямейнага праекта ў рэчышчы Года роднай зямлі стала Святлана Пятроўна Вішнеўская. «Давялося на слаўгарадскіх сметніках шукаць пустыя пластыкавыя бутэлькі патрэбнага колеру», — жартам скардзіцца муж. Але ўжо цяпер Васіль Іванавіч думае, як зрабіць новыя штучныя кветкі — званочкі і ландышы.

Стварэнне пальмаў не вымагала шмат часу і высілкаў: муж з жонкай гавораць, што ўдваіх управіліся за адзін вечар. Затое невялікі вясковы садок стаў тутэйшай славутасцю, якой цікавяцца мясцовыя і прыезджыя. А ўнукі Андрэй і Арцём, якія прыязджаюць у Міхайлоў на канікулы і выхадныя, з задавальненнем гуляюць у вясковых «тропіках».

Ілона ІВАНОВА.
Слаўгарадскі раён.

Не будзь «лохам»

«ШЧАСЛІВЫ» БІЛЕТ НА АДПАЧЫНАК

Скончылася лета ў нашай краіне, аднак за мяжой курорты сезон у самым разгары. Таму турысты, як тыя пералётныя птушкі, будуць мігрыраваць з аднаго кліматычнага пояса ў другі яшчэ да сярэдзіны кастрычніка, пакуль не скончыцца аксамітны сезон і ёсць магчымасць пагрэцца пад цёплым паўднёвым сонцам. Аднак сёння некаторыя турыстычныя агенцтвы прадаюць не якасны адпачынак, а, хутчэй, латарэю на яго без гарантыі на выйгрыш. Хто і як можа сапсаваць вам адпачынак і настрой, высвятляла наш карэспандэнт.

Білет першы. *Незабыўны турэцкі каларыт*

Мінчанка Ірына Скарадзелава ў рэкламнай газеце звярнула ўвагу на аб'яву аб зманліва танным і прыемным адпачынку на беразе Чорнага мора. Вечарам таго ж дня Ірына разам з супрацоўнікам агенцтва ўжо выбірала краіну, горад, гатэль, турыстычную праграму. Усе пажаданні кліента былі ўлічаны, заставаліся фармальнасці — унесці аванс і чакаць, калі агенцтва забраніруе білеты. Шчыра кажучы, Ірына ўжо тады адчула лёгкую насцярожанасць, бо агенцтва збіралася з'ехаць у новы офіс і яго супрацоўнікі былі заклапочаны зборамі. Можа таму забраніраваць білеты для Ірыны ніяк не атрымлівалася. Аднак потым усё вырашылася.

Чамусьці Ірына свой адпачынак правяла не ў турэцкім горадзе Кемер, куды павінна была трапіць, а ў невялікай вёсцы за 10 кіламетраў ад яго. Вёска не адпавядала элементарным турыстычным патрабаванням, напрыклад, дыскатэкі, рэстараны, атракцыёны і крамы ўвогуле адсутнічалі. Так званы «гатэль» таксама вымушаў чакаць лепшага. Шэры трохпавярховы брудны будынак быў абнесены звычайнай металічнай сеткай, чым і вылучаўся сярод іншых вясковых дамоў. Замест аніматараў і афіцыянтаў па двары бадзяліся куры і свінні гаспадароў. І гэта «трохзоркавы» гатэль, у якім згодна з абяцаннямі супрацоўнікаў агенцтва, павінна была з камфортам адпачываць мінчанка.

Вось ужо гэты турэцкі каларыт. Штодня Ірына прачыналася ў пяць гадзін раніцы ад спеваў мясцовых пеўняў і пад акампанемент гучнай малітвы. Гаспадар гатэля Мухамед нейк прапанаваў турыстцы з'ездзіць на экскурсію ў вядомую Анталію, якая, дарэчы, і без таго ўваходзіла ў кошт пуцёўкі. Ірына пагадзілася, бо хацела ўбачыць на свае вочы экзатычную і прыгожую Турцыю, пра што яна марыла ў Мінску. Але замест Анталіі Мухамед завёз яе ў мясцовую краму дарагога адзення са скуры. Пры гэтым рашуча настойваў, каб жанчына абавязкова нешта сабе набыла.

Асобным непрыемным пытаннем было харчаванне ў гатэлі. І прычына не ў незвычайных гастранамічных прыхільнасцях жанчыны або завышаным кошце ежы. Беларускі страўнік проста адмаўляўся прымаць мясцовыя стравы. Напрыклад, суп з мукі і соусу і імам баілда (баклажаны з кавалачкамі мяса) можа вытрымаць толькі сапраўдны турак — такія яны надзвычай вострыя. У гатэлі пражывалі беларусы і расіяне, таму Ірына да гэтага часу не разумее, чаму меню было не адаптаванае для славянскіх спажыўцоў. Увогуле, у асноўным прапанавалі стравы з агародніны, хоць ніхто з турыстаў не замаўляў вегетарыянскай ежы.

Дома Ірына звярнулася ў агенцтва са скаргамі і прэтэнзіямі за сапсаваны адпачынак. Там лагодным тонам ёй растлумачылі, што ў Анталіі ёсць тры гатэлі з аднайменнай назвай, і вынікам няўдалага «вясковага» адпачынку Ірыны стала тое, што кліентка кепска растлумачыла тураператару, куды хоча патрапіць. Вось і выйшла памылка. Маўляў, сама вінаватая. Але прабачце, хто і каго адпраўляе ў адпачынак?! Бо грошы за яго ў агенцтве ўзялі немалыя, за іх можна было выдатна правесці час на беразе цёплага мора. Замест прыемных уражанняў і добрага настрою, якое бывае пасля ўдалага адпачынку, Ірына вярнулася, мякка кажучы, не ў гуморы.

Білет другі. *Вось дык Абу-Дабі, блін!*

Можна бясконца глядзець на тое, як гарыць агонь і цячэ вада. Аляксандр Грынчанка пасля свайго адпачынку ў Арабскіх Эміратах упэўнены, што бясконца глядзець можна і на тое, як працуюць пад'ёмныя краны і бульдозеры. Два тыдні (менавіта столькі ён знаходзіўся ў горадзе Абу-Дабі) такая карціна ўставала перад ім кожны дзень. Рэч у тым, што акурат каля яго гатэля дарожныя службы распачалі будаўніцтва хуткаснай магістралі, і пляж, які размяшчаўся літаральна за два крокі ад гасцініцы, быў закрыты для наведвання. Да бліжэйшага кавалачка мора і пяску трэба было дабірацца шэсць кіламетраў. У саракаградусную спякоту не кожны беларус зможа пераадолець такую адлегласць. У дворыку гатэля быў басейн. На жаль, толькі для дзяцей, таму, як бачыце, вада ў краіне барханаў і зараз сапраўдная каштоўнасць. На тое, што гід аб'явіўся толькі на трэці дзень, Аляксандр проста не звярнуў увагі.

У турыстычным агенцтве з незадаволеным кліентам нават не захацелі размаўляць. Кіраўнік проста выставіў Аляксандра за дзверы, маўляў, гатэль выбраў сам, а мы адкуль можам ведаць, што насамрэч робіцца ў Арабскіх Эміратах. Пытанне ўзнікае само па сабе: хто і для каго працуе. Аляксандр прызнаўся, што не збіраўся вырашаць такую спрэчную сітуацыю праз суд. Аднак пасля такой неадэкватнай рэакцыі агенцтва на яго скаргу проста быў абавязаны давесці справу да лагічнага завяршэння. Тым больш, на адпачынак мужчына фінансаў не пашкадаваў. Яго іскавыя патрабаванні былі задаволены.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Білет трэці. *У Алушту па здароўе?*

Жанна Маслякова пра свой адпачынак у Алушце гаворыць літаральна ў двух словах — «блуканне па пакутах». Лепш і не скажаш. Жанчыне давялося кожны дзень да пляжа цягнуцца 20—30 хвілін пад сонцам па раўніне, а потым пераадольваць бясконцыя прыступкі. Па падліках Жанны, іх бы хапіла, каб узняцца на сёмы паверх! Такое штодзённае выпрабаванне можа і было б карысным для дужых і маладых турыстаў. Аднак толькі не для нашай гераіні, у якой праблемы са здароўем не дазвалялі перанапружвацца на спякоце.

У Алушце Жанна зноў успомніла былое студэнцкае жыццё ў інтэрнаце, калі гарачая вада па графіку і ў абмежаваній колькасці. У яе гатэлі было менавіта так: з сямі раніцы да дзесяці вечара — гарачая вада, а пасля 21 гадзіны, прабачце, халоднай таксама няма. Адным словам, як эканомяць у Алушце, Жанна дазналася, а вось адпачыць па ўсім канонам жанру не змагла. На трэці дзень свайго спартанскага быту яна вырашыла знайсці новы гатэль.

За дзесяць дзён адпачынку тры дні яна спрабавала прыстасавацца да бытавых нязручнасцяў, два шукала новае жыллё і толькі пяць правяла так, як было запланавана. Самае крыўднае ў гэтай гісторыі тое, што ў турыстычнай фірме, у якую звярнулася Жанна, ведалі пра яе праблемы са здароўем і не звярнулі на гэта ўвагі. Безумоўна, на момант заключэння дагавора пра адсутнасць вады і марафонскія дыстанцыі да мора размова не вялася. Жанне паабяцалі вярнуць грошы за сапсаваны адпачынак у канцы жніўня. Месяц скончыўся, а грошы не аддалі.

«95 працэнтаў спраў — выйгрышныя!»

У Мінскае таварыства спажыўцоў скаргаў на сапсаваны адпачынак паступае вялікая колькасць. «Асноўныя скаргі — гэта змена часу вылету без апавяшчэння кліента, прадастаўленне гатэля ніжэйшага ўзроўню, замена нумара люкс на звычайныя апартаменты, адсутнасць гарачай вады, дрэннае харчаванне і многае іншае. Увогуле з мая па верасень такіх скаргаў вельмі шмат. Іх колькасць змяншаецца па меры завяршэння курортнага сезона», — адзначыў юрыст Мінскага таварыства спажыўцоў Андрэй Ермаковіч.

Калі прайсці да мора 15 хвілін замест паабяцаных 10, не думаю, што праз такую недакладнасць турыст пачне біць трывогу, таму што псаваць сабе адпачынак валакітай са шматлікімі адміністратарамі і менеджарамі турагенцтваў ніхто не захоча. А ці шмат людзей прачытвае дагавор ад першага да апошняга слова? Ні для каго не сакрэт, што дакументы такога кшталту надрукаваны дробным шрыфтам, што значна ўскладняе працэс чытання. Менавіта на гэта і разлічваюць несумленныя тураператары, калі загадзя прапаноўваюць паездку, неадпаведную яе кошту.

«Для таго, каб прыемна правесці адпачынак, у першую чаргу трэба дэтальна вывучыць дагавор. Пазначыць у ім літаральна ўсё, уключаючы канкрэтнае апісанне пакоя. Абавязкова застрахуйце сваё жыццё на выпадак паводкі, пажару, землятрусу, ваенных дзеянняў і гэтак далей. Калі па нейкіх прычынах ўмовы дагавора не былі выкананыя, то вы маеце права звярнуцца ў суд і там абараняць свае правы. Выходзячы са сваёй практыкі, скажу, што 95 % спраў такога характару выйгрышныя», — параіў юрыст Андрэй Ермаковіч.

Вольга КОРШУН,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.

Інфарм-укол

ШКОЛА ДЛЯ ГІПЕРТОНІКАЎ

Згодна з сусветнымі звесткамі, каля 30 працэнтаў гіпертонікаў не ведаюць аб сваім захворванні, і яшчэ 11 працэнтаў ведаюць, але не прымаюць ніякага лячэння.

Сэрцу патрабуецца шмат энергіі, і абмен рэчываў у яго клетках павінен адбывацца без парушэнняў. Здаровы арганізм усё гэта забяспечвае. А вось у выпадку хваробы сэрцу не перашкодзіць падтрымка. Ішэмічная хвароба сэрца, артэрыяльная гіпертэнзія, атэрасклероз, сардэчная недастатковасць звычайна характэрныя для людзей старэйшага ўзросту, хоць сустракаюцца і ў «росквіце гадоў».

— Цяпер вылучаюць такое паняцце, як перадгіпертанія, — кажа **галоўны ўрач 18-й мінскай гарадской паліклінікі Сяргей БУГАЁЎ.** — Прадстаўнікі гэтай групы маюць крыху вышэйшы за норму ціск крыві. Многія з гэтых людзей маглі б пазбегнуць захворвання, але ім трэба змяніць лад жыцця — вытрымліваць дыету і забяспечыць арганізму рэгулярную фізічную нагрузку. Для усіх, хто мае так званыя памежныя лічбы ціску — 135/80, 140/80, на базе даўрачэбнага кабінета нашай паліклінікі арганізавана адзіная ў сталіцы Школа прафілактыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі. Спецыяліст тлумачыць пацыентам, што вышэйзгаданыя паказанні артэрыяльнага ціску — «першы званок» арганізма.

У Школе прапануецца наведаць шэсць урокаў, на якіх фельчар даўрачэбнага кабінета даступна і выразна расказвае. Спачатку пра фізіялогію кровазвароту, віды артэрыяльнага ціску, потым — аб правілах вымярэння апошняга, магчымасцях карэкцыі. У Школе навучаць і элементам самадапамогі падчас псіхаэмацыянальных нагрузак. Асаблівая ўвага надаецца фактарам рызыкі развіцця гіпертаніі — курэнню, злоўжыванню алкаголем, лішняй масе цела, месцу і ролі рацыянальнага харчавання, абмежаванню солі ў рацыёне, дазіраванню фізічных нагрузак і г.д.

«Летась Школу наведаў 161 чалавек, — кажа Сяргей Валянцінавіч. — Калі ўлічыць, што наша ўстанова абслугоўвае 47 тысяч чалавек, то лічба, безумоўна, малая. Насельніцтва ў цэлым яшчэ слаба ўсведамляе неабходнасць пастаяннага клопату аб сваім здароўі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Браканьераў паменела?

Пра браканьерства і праблемы выканання прыродаахоўнага заканадаўства мы гутарым з **Віталем ГРЫНЕВІЧАМ, начальнікам Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету:**

— Віталь Іванавіч, па выніках паўгоддзя ў Мінскай вобласці колькасць парушэнняў зменшылася. Гэта вы дрэнна працуеце ці проста парушальнікаў стала менш?

— Гэта значыць, што грамадзяне сталі меней парушаць. Прычым такая тэндэнцыя назіраецца ўжо гады тры. Тэндэнцыя добрая, станоўчая, так і павінна быць. Асабліва змяншэнне бачна па рыбе, бо і ціск на браканьераў узмацніўся, і людзі сталі больш свядомымі. А вось у лесе браканьераў становіцца болей, бо там цяжка выяўляць парушэнні. Ноччу стрэліў, тры метры ў лес — і ўжо нікога не знойдзеш. Нават удзень я чую стрэл, іду у той бок, а чалавека знайсці немагчыма. Добра яшчэ зімой, калі на снезе сляды ёсць...



— У вас ёсць «гарачая лінія» — наколькі яе выкарыстоўваюць грамадзяне? Бо, напэўна, ёсць жа і тыя рыбакі-аматары, якія проста не могуць закрываць вочы на браканьерства...

— Я скажу, што за апошні час актыўнасць насельніцтва стала значна большай, чым, скажам, 10 гадоў таму. Мяркую, павышаецца ўзровень экалагічнага выхавання насельніцтва, ну і плюс ў кожнага рыбака ёсць мабільнік, шмат у каго — машына. І калі рыбак-аматар бачыць, што ў яго нічога не ловіцца, а нехта побач 50 кілаграмаў рыбы сеткай нацягаў, то ён і тэлефануе нам на «гарачую лінію». Наша інспекцыя заўсёды рэагуе на інфармацыю, правярае яе практычна ў любы час сутак. У нас пастаянна працуюць 2-3 аператыўныя групы, а на адкрыцці паляўнічага сезона — 3-4. Наша задача, каб людзі бачылі, што інспекцыя працуе, каб не было парушэнняў на вадаёмах і ў лесе.

— Здавалася б, усе ведаюць: лавіць сеткай, «павукамі» і іншымі браканьерскімі прыладамі нельга. Але ўсё адно ловяць. Чаму так атрымліваецца?

— Я мяркую, тут ёсць некалькі прычын. Па-першае, гэта з-за традыцыйнасці. Напрыклад, у Віцебскай вобласці, ды і ў нас у Мінскай спрадвеку так лавілі рыбу, так па традыцыі ловяць і цяпер. Па-другое, для нідзе не працуючых людзей гэта крыніца існавання. І самім паесці, і на продаж, каб грошай зарабіць. Праўда, у выніку пападаюцца, атрымліваюць вялікія штрафы, а калі паўторна — то і прыгаворы суда. Па-трэцяе, некаторыя займаюцца браканьерствам, каб адрэналін у арганізме з'явіўся. Гэта ж мужыкі, хочацца экстрэмальных сітуацый і вострых адчуванняў.

— Я так разумею, што ёсць выпадкі, калі прыродаахоўнае заканадаўства парушаюць і леснікі, і егеры. Хоць яны павінны, наадварот, сачыць за яго выкананнем. Чаму так?

— Гэта ўсё з-за вельмі нізкай кваліфікацыі. Хто ідзе ў егеры? Людзі, якія без працы, без адукацыі, якія жывуць у вёсках. У іх вельмі слабая юрыдычная падрыхтоўка. І шмат хто з іх спадзяецца на ўдачу, думаюць, што ў лесе акрамя іх нікога няма, а тут бац — наша інспекцыя.

— Як выправіць сітуацыю?

— Ну вось я быў на нарадзе ў абласной РДГА «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». І мы дамовіліся, што кожная з нашых інспекцый папрацуе з егерамі. Іх трэба вучыць і выхоўваць. Ну а з іншага боку — зарплата ў іх малая: 300-350 тысяч у лепшым выпадку. Хто пойдзе працаваць за такія грошы? А як сям'ю карміць? І калі чалавек туды ўладкоўваецца, то ён загадзя настроіваецца, што астатняе дабярэ мясам. Вось і атрымліваецца, што егер — парушальнік.

— Я ведаю, гто ёсць адна цікавая праблема: арандатары ў асноўным карыстаюцца паляўнічымі ўгоддзямі, але не ахоўваюць.

— Чаму не ахоўваюць? А таму што няма добрай арганізацыі. Трэба даць егерам машыну, арганізаваць працу, паставіць задачу. Егер павінен ведаць, што ахова паляўнічых угоддзяў ускладзена на яго, а то некаторыя думаюць, што гэта — задача інспекцыі. Да таго ж ізноў упіраемся ў іх адукацыю. Правільна аформіць адміністрацыйныя матэрыялы не так проста, як было раней. Цяпер трэба аформіць пратакол апытання сведкаў, пратакол апытання парушальніка, пратакол адабрання, пратакол агляду месца правапарушэння, пратакол агляду транспартнага сродку, а таксама зрабіць фота- і відэафіксацыю і гэтак далей. Усё трэба добра падрыхтаваць для суда, каб справу не вярнулі на дапрацоўку і каб па гэтай справе не выйшлі тэрміны...

Няма ў арандатараў грошай на тэхніку, на паліва, на форменнае абмундзіраванне... А наогул, ахоўваць павінны менавіта яны. Гэта прадугледжана і Законам «Аб жывёльным свеце», і дамовай паміж райвыканкамам і паляўніцтвакарыстальнікам.

— Ну і напрыканцы пытанне практычнага характару. Быў выпадак: супрацоўнікамі вашай інспекцыі быў затрыманы аўтамабіль, у багажніку якога знайшлі збітага ў ДТЗ дзіка. У выніку цяпер заводзіцца крымінальная справа на гэтага вадзіцеля за тое, што ён забраў з месца ДТЗ мёртвага дзіка. Я апытаў сваіх знаёмых з правамі на кіраванне аўтамабілем, але ніхто не ведае, што рабіць у такой сітуацыі, калі збіў на дарозе дзікую жывёліну...

— Усё вельмі проста. Пры любым дарожна-транспартным здарэнні выклікаецца ДАІ, а сутыкненне на дарозе з дзіком — таксама ДТЗ. Супрацоўнік ДАІ вызначыць, што рабіць далей. А яны павінны выклікаць паляўнічакарыстальніка, ахову прыроды, працаўніка лясгаса, ветэрынара. Складаецца акт, падпісваюцца ўсе члены камісіі, тушу забірае паляўнічакарыстальнік і ўсё, пытанне закрытае. Нічога складанага, кожны вадзіцель павінны ведаць пра гэтыя правілы.

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

ТЭЛЕФОНЫ «ГАРАЧЫХ ЛІНІЙ»:

8 (017) 289 39 55 — Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі
8 (0162) 23 96 90 — Брэсцкая абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету
8 (0212) 26 85 88 — Віцебская абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету
8 (0232) 74 71 62 — Гомельская абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету
8 (0152) 52 13 38 — Гродзенская абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету
8 (017) 220 53 58 — Мінская абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету
8 (0222) 31 09 86 — Магілёўская абласная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету

Як нас дураць

БАНКІРКА-ЛАХАТРОНКА

«Кручу-вярчу-заблытаць-хачу! Падыходзь, хто больш уважлівы, можна хутка і добра зарабіць!..». Напэўна, многія з нас на пачатку 90-х хоць бы раз траплялі на вуду вулічных махляроў-«напарстачнікаў». За пару-тройку гадоў пры актыўным умяшанні міліцыі народ усё ж скеміў, што ў «лахатрон» выйграюць толькі яго арганізатары і «падсадныя качкі», якія дэманструюць «гарантаваную» ўдачу і імгненнае абагачэнне.

Час «напарстачнікаў» быццам бы мінуў, а людская прага хуткай нажывы засталася, паколькі вечная, як свет. На гэтай чалавечай слабасці пабудавана абсалютная большасць схемаў народнага ашуканства.

А яшчэ кожнаму з нас у глыбіні душы верыцца ва ўласную выключнасць: «Вось божанька цяпер мне дапаможа — і я куплю латарэйку з джэк-потам!». Ці: «Які добры чалавек! Мне як удаве ваеннага проста дадому прынёс і ўсяго за 170 тысяч рублёў прадаў такую дарагую і дэфіцытную біядабаўку да ежы!» І як жа крыўдна бачыць гэтую біядабаўку роўна праз дзень у аптэцы ўсяго тысяч за 15...

Як усім нам пашанцавала, што ведаем «цётку Валю»!

«Шчасліўчыкаў», якія па матэрыялах крымінальнай справы, узбуджанай Смалявіцкім РАУС яшчэ ў лістападзе гэтага года па частцы 3 артыкула 209 КК Рэспублікі Беларусь (махлярства ў буйным памеры), праходзяць не інакш як пацярпелыя, следства налічвае ўжо як мінімум 8 чалавек. І гэта толькі пакуль!

«Цёткай Валяй» мы назавём 51-гадовую вынаходлівую махлярку, паколькі рамкі закона не дазваляюць на старонках газеты зрабіць інакш, пакуль суд над ёй не адбыўся.

Такім чынам, цётка Валя яшчэ з далёкіх 80-х працавала ў банкаўскай сістэме. Апошнія некалькі гадоў з'яўлялася супрацоўніцай Смалявіцкага аддзялення аднаго з банкаў.

Сумы, якія штодня мільгалі перад вачыма, рабілі ўласную зарплату яшчэ больш мізэрнай, абразлівай і часам казыталі фантазію. У рэшце рэшт да 2005 года фантазія «наказытала» такі план, што, наперабой аддаючы свае кроўныя цётцы Валі, грамадзяне яшчэ і пакеты з дарагім каньяком давалі.

Зразумела, ніхто з іх і не здагадваўся, што не толькі каньяк, але і грошы надзейна захрасаюць у шырокай кішэні цёткі Валі...

Яе схема народнага «абдзіралава» працавала бездакорна: «Прывітанне, Верачка (імя выдуманае)! Ну, ты ж памятаеш, што я ў банку працую? Дык вось, ты на свае зберажэнні не спяшайся нічога купляць. Ёсць магчымасць добра зарабіць. Толькі нікому асабліва не расказвай. Карацей, у нас у банку ёсць штосьці кшталту тайнага дэпазітнага валютнага ўкладу аж пад 60 працэнтаў гадавых. Але скарыстацца ім можа толькі супрацоўнік банка. Гэта значыць я — магу, разумееш? Увогуле, ты ведаеш, як я да цябе стаўлюся, дык, калі хочаш...».

Зразумела — хацелі ўсе. Яшчэ б — такі працэнт! І «верачкі» ды «любачкі», дзякуючы Богу за шчасце быць упадабанымі цёткай Валяй, імгненна неслі ёй свае «баксы» на размнажэнне. А каб усё выглядала больш пераканаўча, аперацыя па выгадным укладанні ажыццяўлялася, як і належыць, у банку. Цётка Валя літаральна «ад балды» рабіла прыходны касавы ордэр, дзе нумар рахунку і іншыя лічбавыя рэквізіты з'яўляліся сумбурным наборам лічбаў. Знешне — усё як трэба, а насамрэч — нічога рэальнага. Але, як вы разумееце, шчаслівых абраных укладчыкаў «тайнага дэпазіту» цікавілі зусім іншыя лічбы...

Прагнасць мозгу не сяброўка

Як жа трэба банку любіць сваіх супрацоўнікаў, каб дазволіць з уласных актываў грэбці такія грошы! І ні ў воднага «шчасліўчыка» нават ні разу не ўзнікла падазрэння, што нешта не так.

А такіх дэпазітных ставак проста ў прыродзе не бывае. Як мінімум за апошнія 10 гадоў у Беларусі самая высокая стаўка па валютных дэпазітах была 13 працэнтаў. І то адбылося гэта на пачатку фінансавага крызісу, і пратрымалася такая прапанова ўсяго 2 месяцы. А так — 10 працэнтаў максімум!

Але сярод кліентаў цёткі Валі трапляліся не толькі сяброўкі-прастушкі. Быў адзін вельмі салідны. Ледзь, дарэчы, не стаў сваяком. Выцягнула яна з яго ў перыяд 2008—2009 гадоў цэлых 99 тысяч 500 долараў ЗША. І ён — напэўна, чалавек няпросты ў фінансавым сэнсе — быў упэўнены, што крута ўздымаецца, і нават мезеным пальцам не варухнуў, каб «прабіць» праз сяброўтаварышаў праўду аб «тайным валютным укладзе».

Дарэчы, уласцівыя беларускай нацыі прыродная дабрыня і боязь пакрыўдзіць недаверам спрыяюць усім відам «лахатрона». Тым больш не да твару «прабіваць» сваячку, сяброўку, сяброўку сяброўкі і г.д. Ведаючы гэта, мудрая цётка Валя працавала якраз з такім кантынгентам.

Юрый Дзетачкін і побач не стаяў

Яшчэ добра «пакараць» на 100 штук зялёных супермена з грашыма, маўляў, няма чаго тут шыкаваць, калі «многія дзеці не елі халвы». Нават лагічна (хоць, зразумела, і незаконна) загрэбці ўсе зберажэнні ў сяброўкі, якая гадоў 5 таму звяла твайго кавалера. Але міжволі здзіўляешся, за што банкірка абірала людзей, якія імкліва прадавалі сваю маёмасць, каб стаць абранымі ўкладчыкамі. Не цуралася яна і крэдытных грошай. Так-так, грамадзяне спецыяльна бралі крэдыт у гэтым жа банку і неслі літаральна ў суседняе акно добрай цётцы. Няўжо ўсе пацярпелыя паспелі ёй чымсьці насаліць?! Наўрад ці... Проста калі прыгожыя паперкі самі ідуць у рукі, не ўзяць іх ужо проста немагчыма.

Паколькі энныя сумы ў цёткі Валі на руках меліся, то любыя пажаданні атрымаць ашаламляльныя працэнты імгненна задавальняліся. Безумоўна, гэта наогул уводзіла ўкладчыкаў у экстатычны транс. Праўда, выдаючы працэнты ўжо ў другі-трэці раз, банкірка завастрала ўвагу кліента, што гэта не вельмі разумна з іх боку: «грошы павінны рабіць грошы!» І ў большасці выпадкаў працэнты «вярталіся на рахунак укладу», каб «нараджаць новыя грошы»!

Крэдыт з «адкатам»

Нельга не заўважыць і ўнікальную творчую актыўнасць цёткі Валі. Адна схема — добра, а дзве ж лепш! Наогул, ці то мозг яна размінала, ці то проста хацелася вострага... Але выглядала гэта так.

З яе разумнай падачы бярэ чалавек на сваё імя крэдыт у банку на 10 мільёнаў рублёў і атрымлівае іх на банкаўскую картку, праз якую далей павінен разлічвацца з банкам. З іх 7 мільёнаў аддае цётцы Валі, а тры — у якасці ганарару — бярэ сабе. Пры гэтым добрая банкірка быццам бы бярэцца крэдыт аплачваць. І знешне нават быццам гэта робіць: кожны месяц забірае картку і налічвае на яе патрэбную суму прыкладна ў 300 долараў. З 300 долараў 250 — асноўны доўг, а 50 — працэнты і камісійныя. Атрымлівае чэк аб налічэнні. І ўжо праз хвіліну здымае і кладзе ў кішэню 250 зялёных! Картку і чэк адвозіць наіўнаму кліенту.

Паўтара года (!) атрымальнік крэдыту думае, што своечасова і ў поўным аб'ёме разлічваецца з банкам. Пазней ужо разам са следчым ён адкрывае баланс рахунку: на картцы сіратліва «боўтаецца» ўсяго 7 «баксаў».

На жаль, а магчыма, і на шчасце, але мы ўжо не даведаемся, як збіралася надалей выкручвацца з гэтым крэдытам смалявіцкая банкірка. Цяпер яна пераконвае следства, што ўсім і ўсё абавязкова збіралася аддаць. Як жа... Усе 180 тысяч амерыканскіх долараў — менавіта такая сума ў цэлым сёння ўжо высвечваецца па яе справе. Толькі куды яны падзеліся — пакуль пытанне без адказу.

Цётка Валя раптам «захварэла»

«Нічым табе, міленькая, не магу дапамагчы. Ніводным доларам. Я ўжо ў банку не працую! — аднойчы адказала цётка Валя кліентцы, якая пажадала зняць усю суму з рахунку. — А ў кантору ты, глядзі, не лезь: уклад жа тайны. Я вельмі рызыкавала, табе дапамагаючы...».

Здарылася гэта ў ліпені 2009 года. На гэты раз цётка Валя амаль не хлусіла: з банка яна звольнілася. Як адзначана ў дакументах, «па ўласным жаданні».

А вось не на жарт перапужаная кліентка ў банк усё ж такі пайшла. Зразумела, пададзены ёю прыходны ордэр вельмі здзівіў супрацоўнікаў банка сваім мякка кажучы, міфічным зместам. Гісторыя пра тайны ўклад наогул увяла іх у працяглы ступар. Развіццё наступных падзей ужо банальнае: супрацоўнікі Смалявіцкага РАУС прафесійна і хутка пазнаёміліся з цёткай Валяй.

Як кажа начальнік аддзялення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Смалявіцкага РАУС маёр міліцыі Аляксандр Дарашэвіч, «звычайная яна зусім! Знешне нічым асаблівым не выдзяляецца. Аўтамабіля няма. Кватэрка ў Смалявічах самая звычайная, непрыгожая. Наогул, мы не ўбачылі таго, чаго чакалі...».

Дададзім толькі, што 30 працэнтаў заяўнікаў звярнуліся ў міліцыю, калі гарадок ужо на ўсю моц гудзеў аб кемлівай банкірцы. І абавязкова яшчэ будуць звяртацца. А пакуль, відаць, працэнты па тайным укладзе нарошчваюць...

Марына ЭВЕРСМАН.

ЗЛАДЗЕЙКІ ПАД ВЫГЛЯДАМ САЦЫЯЛЬНЫХ РАБОТНІЦ

27 жніўня раніцай у кватэру 80-гадовай магіляўчанкі прыйшлі дзве незнаёмыя жанчыны, якія назваліся сацыяльнымі работніцамі. Пасля іх адыходу гаспадыня недалічылася 1 мільёна 600 тысяч беларускіх рублёў і 495 долараў. Зніклыя грошы і злодзеек шукае міліцыя.

Алена КАЗЛОВА.

КАМП'ЮТАРНАЯ ТЭХНІКА БЫЛА «ШЭРАЙ»

30 вадкакрышталічных манітораў без маркіроўкі ідэнтыфікацыйнымі знакамі, а таксама 2080 камплектавых да камп'ютараў без таварасуправаджальных дакументаў агульным коштам амаль 40 мільёнаў рублёў выявілі аператыўнікі УУС Гродзенскага аблвыканкама і падатковай інспекцыі па Ленінскім раёне г. Гродна.

Камп'ютарная тэхніка трапіла ў абласны цэнтр са сталіцы і прызначалася для рэалізацыі ў мясцовых фірмах, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама. На вадзіцеля, які яе перавозіў аўтамабілем «Івека», складзены адміністрацыйны пратакол, яму пагражае сур'ёзны штраф. Цяпер высвятляецца, чаму грузаадпраўшчыкі не афармілі належным чынам дакументацыю. На частку прадукцыі яна наогул адсутнічала, што можа сведчыць пра ўвоз тавару на тэрыторыю Беларусі ў абыход вызначаных патрабаванняў.

НАРКАЎРАДЖАЙ У СКІДАЛІ

Буйную партыю марыхуаны выявілі аператыўнікі Гродзенскага райаддзела міліцыі ў Скідалі.

«Плантацыя» дзікарослых канапель на вуліцы Клубнай знаходзілася побач з агародамі мясцовых жыхароў і займала 50 квадратных метраў, вага знішчанага зелля — 30 кілаграмаў. Але гэта была дробязь у параўнанні з безгаспадарным полем на вуліцы Паштовай, дзе наркаўраджай размяшчаўся на плошчы каля 500 квадратных метраў. Агульная вага экзатычных індыйскіх канапель склала 220 кілаграмаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У сувязі з паступіўшай у **суд Ляхавіцкага раёна** заявай аб прызнанні адсутнай без вестак **ЕРМАКОВАЙ Анжэлы Генадзьеўны,** 17 верасня 1975 года нараджэння, ураджэнкі г. Баранавічы Брэсцкай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Баранавічы Брэсцкай вобл., вул. Наканечнікава, дом 41, корпус 3, кватэра 10, просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра месцазнаходжанне грамадзянкі, паведаміць іх суду Ляхавіцкага раёна (Брэсцкая вобл., г. Ляхавічы, вул. Першамайская, дом 6) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У рыбгасе «Волма» Чэрвеньскага раёна платная рыбалка арганізавана належным чынам.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6

У мінулым выпуску мы аб'явілі шосты конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік — Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы, а таксама суддзя і каардынатар конкурсу, і лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам, трэба быць пільным і не прапусціць выпадкі, калі будуць у пазіцыях пабочныя разгалінаванні альбо якія не развязваюцца. Таму за ўказанне такіх істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Норма ж другога разраду — рашыць усе 12 заданняў, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно ачко.

А цяпер падаём другое заданне:



Белыя: a5, c5, e7, f6, g5, g7 (6). **Чорныя:** a7, b6, c3, c7, e3, h4 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

АДЗІНЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

20 жніўня спартыўная грамадскасць адзначыла 70-годдзе з дня нараджэння Леаніда Вітошкіна — адзінага ў рэспубліцы гросмайстра СССР па шашачнай кампазіцыі. Далучаемся і мы да віншавання юбіляру, дасягненні якога робяць унушальнае ўражанне: трохразовы чэмпіён Савецкага Саюза па стварэнні эцюдаў-64 і 100, прызёр па складанні эцюдаў і задач-64 і эцюдаў-100, 29-разовы пераможца першынстваў Беларусі ў раздзелах эцюдаў, задач, праблем і іх міні-64 і 100, аўтар Анталогіі эцюдаў па міжнародных шашках (сем тамоў) і рускіх (пяць). Ім апублікавана ў сродках масавай інфармацыі нашай краіны і за яе межамі 1500 эцюдаў, 850 камбінацыйных канцовак і 250 задач. Таму ён з'яўляецца правадзейным членам Санкт-Пецярбургскай акадэміі шахматнага і шашачнага мастацтва.

Славуты маэстра актыўна супрацоўнічае і са звяздоўскай шашачнай рубрыкай. Для нашага бліца-50/1 даслаў свой новы эцюд-100:



Белыя: 9, 22, дамка 5 (3). **Чорныя:** 35, 38, дамка 47 (3). Перамога белых.

Па-за конкурсам разгледзьце і яго эцюд-64:

Белыя: дамкі a7, g1 (2). **Чорныя:** a5, b4, h8, дамка c7 (4).

h2 (c3 AB) b8 (b2) b6, a1x. A (d8) c7, a3 (g7) b2 (h6) c3 (g5) d2 (h4) e1x. Варыянты жа пасля B (b8) пашукайце самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Па прафесіі Леанід Сяргеевіч — настаўнік гісторыі. Вывучае ён і шашачныя архівы. Менавіта яму належыць самая багатая ў свеце картатэка эцюдаў і задач, дзякуючы якой ён зрабіў агляд стогадовых твораў. Вось адзін з прыкладаў:

Белыя: c1, e1, e5, f6, g1, g7, h4, дамкі a3, a7, b2, f2 (11). **Чорныя:** h2, h6, дамка f8 (3).

Замкнуць дамку і дзве простыя чорных: fe7 (g3 A) cd2, e7, e5, ae3#. A (f4) ed2, g7, cb2, g5, ae3, e1#. Канструкцыю 11 на 3 Аляксандра Іванавіча Шошына, які стаў заснавальнікам сучаснай задачы, змясціў на сваіх старонках часопіс «Лісток шашыста» (Пецярбург, 1909).

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

Аўтарскі-8/14 (П. Шклудаў): h2! (b4 A) b8 (f2 BC) a5 (b2) c3, f4 (c3) c1x. A (b2) e3, a3x. B (b2/c3) e5, a1x. C (e3) a5 (b2) c3, f4 (c3) c1x.

Бліц-49/4 (Л. Вітошкін): 1 (39) 3, 37, 21 (43 A) 49x. A (16) 27x.

Па-за конкурсам (Л. Вітошкін): 1 (32) 15, 39, 49x.

г. ВИТЕБСК **9 октября 2009 г.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ФОНД «ВИТЕБСКОБЛИМУЩЕСТВО», телефон в г. Витебске (0212) 47 60 96

№ лота	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель	Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена объекта, рублей	Сумма задатка, рублей
3.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Дубровенский р-н, 608 км автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)–Минск–граница РФ (Редьки) левая сторона, кадастровый номер 222400000001000272. Арендодатель – Витебский облисполком, тел. в г. Дубровно (02137) 4 17 30; (02137) 4 10 63	Лесные земли, ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 В	0,9794	50	Для строительства и обслуживания автостоянки и гостиничного комплекса с развлекательным центром	- произвести вырубку древесно-кустарниковой растительности с реализацией древесины в установленном порядке; - возместить в установленном порядке потери лесохозяйственного производства в сумме 10279,99 тысяч рублей, связанные с изъятием 0,9794 га земель лесного фонда для нужд, не связанных с ведением сельского хозяйства; - осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок со дня предоставления этого участка; - получить в установленном порядке разрешение Дубровенского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта приступить к занятию данного участка; - снять на занимаемом земельном участке растительный слой почвы и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	**95 730**	**9 573**
4.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Дубровенский р-н, 584 км автодороги М1/Е30 Брест (Козловичи)–Минск–граница РФ (Редьки) левая сторона, кадастровый номер 222400000001000271. Арендодатель – Витебский облисполком, тел. в г. Дубровно (02137) 4 17 30; (02137) 4 10 63	Древесно-кустарниковая растительность. Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии связи	1,1672	50	Для строительства и обслуживания автостоянки и гостиничного комплекса	- произвести вырубку древесно-кустарниковой растительности с реализацией древесины в установленном порядке; - осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок со дня предоставления этого участка; - получить в установленном порядке разрешение Дубровенского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта приступить к занятию данного участка; - снять на занимаемом земельном участке растительный слой почвы и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	**456 362**	**45 636**

1. **Аукцион состоится 9 октября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо подать заявление в фонд «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителям индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. **Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 5 октября 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 9 октября 2009 г. с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642301000014** в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, Витебский областной исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

6. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту); внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с Дубовенским райисполкомом, действующим от имени Витебского облисполкома, договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

8. **Контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты: www.fondgosim.vitebsk.by, www.gki.gov.by, E-mail: fondvitebsk@tut.by.**

Наш гардэроб

ГАЛОЎНАЕ, КАБ КАСЦЮМЧЫК СЯДЗЕЎ...

Касцюм — гэта менавіта той прадмет, які абавязкова павінен знаходзіцца ў гардэробе кожнага мужчыны, нават калі той і аддае перавагу спартыўнаму стылю адзення. Але выпадкі ў жыцці, як кажуць, бываюць розныя, таму нярэдка даводзіцца бачыць у гандлёвых секцыях разгубленых мужчын, якія не ведаюць, з якога боку падступіцца да вешалкі. Паспрабуем ім дапамагчы.

Пры выбары касцюма спецыялісты раяць звяртаць увагу на тканіну, з якой ён пашыты. Інфармацыю аб складзе тканін можна знайсці на мяккай маркіроўцы, размешчанай ва ўнутранай кішэні падкладкі пінжака і на поясе штаноў. Апошнімі распрацоўкамі ў галіне палегчаных шарсцяных тканін з'яўляюцца тканіны з маркіроўкай Super 100, Super 120 і Super 150 (гэтыя лічбы паказваюць, якая колькасць кіламетраў нітак атрымліваецца з аднаго кілаграма шэрсці). Вырабы з такіх тканін маюць падкрэслены элегантны знешні выгляд. Каб правільна выбраць касцюм, неабходна ведаць, што чым даражэйшы касцюм, тым менш клеявых матэрыялаў выкарыстоўваюцца пры яго вытворчасці і тым большая доля ў вытворчасці традыцыйных нітачных швоў і ручных аперацый. Пры выкарыстанні якасных матэрыялаў і тэхналогій касцюм не можа выглядаць «склееным», спрасаваным ці нават «фанерным». Наадварот, ён павінен стварацца ўражанне «жывога». Яго лацканы павінны натуральна ляжаць на паліцы.

Вялікае значэнне мае тое, якімі ніткамі пашыты касцюм: ніткі павінны быць трывалыя і не даваць усадку. Знешне пра гэта можна меркаваць па адсутнасці зборак па швах. Увогуле наяўнасць зборак па швах — гэта прыкмета дэфектнасці вырабу. Але якім бы дарагім і якасным ні быў касцюм, ён ніколі не будзе ўпрыгожваць свайго ўладальніка, калі не будзе правільна падабраны па памеры. Правіла першае — касцюм не павінен абмяжоўваць рух, але і не павінен быць занадта свабодным. Каб вызначыць свой памер, трэба ведаць тры значэнні. Першае — гэта даўжыня акружнасці грудзей у сантыметрах. Другое — рост. І трэцяе — даўжыня акружнасці таліі ў сантыметрах. Паўната вызначыцца розніцай паміж даўжынёй акружнасці грудзей і даўжынёй акружнасці таліі.

Лацканы каўнера на пінжаку павінны шчыльна прылягаць да плячэй, а каўнер кашулі — выступаць прыкладна на паўтара сантыметра над каўнерам пінжака. Звярніце ўвагу, каб на спіне паміж лапаткамі не было гарызантальных складак — звычайна гэта сігналізуе пра тое, што пінжак або маленькі, або вялікі.

САКРЭТЫ ЭЛЕГАНТНАСЦІ:

З касцюмам можна насіць толькі кашулю з доўгімі рукавамі. Нельга апранаць пад паласаты касцюм паласатую кашулю ці гальштук у палоску. Гальштук таксама трэба насіць толькі пад кашулю з доўгімі рукавамі.

Правільна завязаны гальштук шырокім канцом перакрывае пояс штаноў прыкладна на 2 сантыметры. Шырыня гальштука павінна суадносіцца з шырынёй лацканаў касцюма.

Рамень для штаноў павінен быць просты і элегантны, з якаснай скуры, супадаць з колерам абутку, звычайная шырыня рэменя — 3 сантыметры, пражка — адной шырыні з рэменем і таго ж колеру, што і іншыя металічныя аксесуары.

Шкарпэткі трэба выбіраць з натуральных валокнаў, у тон да касцюма ці ўніверсальныя чорныя. Іх даўжыня павінна быць дастатковай для таго, каб ногі не агаляліся, калі мужчына сядзіць.

Дзелавы стыль вымагае насіць абутак толькі з натуральнай скуры цёмнага колеру на шнурках і на тонкай падэшве.

Памятайце, што сярэдні гузік павінен знаходзіцца непасрэдна насупраць вашага пупка, аднак за кошт варыяцый з яго размяшчэннем можна візуальна падоўжыць ці пакараціць даўжыню ног. Самы нізкі гузік на пінжаку звычайна не зашпільваецца. Па даўжыні край пінжака павінен прыкрываць ягадзіцы, інакш вы рызыкуеце зрокава страціць у росце. Зусім іншая рэч — кароткія пінжакі спартыўнага сілуэта, пад якія трэба апранаць шырокія штаны. Які выбіраць пінжак — з адным ці двума шліцамі, або зусім без іх — залежыць ад формы ягадзіц. Пры плоскіх ягадзіцах добра падыходзяць і дзве, і адзін шліц. А калі ягадзіцы ў вас выступаюць, лепш увогуле адмовіцца ад шліцаў. Пінжак з гладкай спінкай схавае гэту асаблівасць вашай фігуры. У ідэальным варыянце даўжыня рукава пінжака павінна быць карацейшая за манжэт кашулі на 1,5 сантыметра. Калі вашы рукі намнога даўжэйшыя, шукайце касцюм большага росту, а калі карацейшыя — пакіньце пінжак у майстэрні, дзе вам падгоняць даўжыню рукавоў. Крой касцюма, у першую чаргу, павінен быць натуральны і па-майстэрску падкрэсліваць усё лепшае, што ёсць у фігуры. Плечы пінжака павінны плаўна аблягаць лінію вашых плеч, а не натапырвацца. Шво на месцы спалучэння рукава з плячом павінна быць ідэальна гладкім і не маршчыніць пры хадзе. Пройма павінна быць размешчана дастаткова высока, быць зручнай пад пахамі і забяспечваць камфорт. Нізкая пройма — прыкмета таннага касцюма. Як правіла, на пінжаку размешчаны тры кішэні. Першая — на грудзях, а дзве іншыя — ніжэй за талію. У знешнія кішэні нічога класці не рэкамендуецца, акрамя насоўкі, паколькі выраб з цягам часу можа страціць свой знешні лоск.

Даўжыня штаноў, таксама як і даўжыня пінжака, залежыць ад росту і камплекцыі чалавека. Класічнае правіла: штаны

падшываюцца так, каб знешні іх край свабодна ляжаў на туфлях, утвараючы адзін невялікі эстэцкі залом. Даўжыня штаноў павінна быць вышэйшая за лінію падлогі на 0,5-1 сантыметр. У класічных штанах без манжэтаў ніжні край звычайна адразаецца са скосам. Штаны павінны добра сядзець у таліі і без рэменя. Па-першае, у гэтым выпадку ён з'яўляецца дэкаратыўным элементам. А, па-другое, у вобласці таліі не будуць збірацца складкі, здольныя сапсаваць уражанне. Калі на штанах ёсць шлёўкі, то абавязкова павінен прысутнічаць і рэмень.

А для таго, каб ваша пакупка радавала вас як мага больш, трэба правільна даглядаць свой касцюм. Асноўнае правіла — не заношваць яго: калі даваць адпачыць касцюму некалькі дзён, то ён самастойна адновіць сваю форму і без вашых намаганняў. Праўда, здольнасць да самааднаўлення ў вялікай ступені залежыць ад якасці матэрыялаў і тэхналогій, якія прымяняліся пры пашыве касцюма. Перш чым павесіць мужчынскі пінжак у шафу, трэба дастаць усё з яго кішэняў і прайсціся па ім са шчоткай з натуральнай шчаціны. Бруд хутка збіраецца на адваротах штаноў, таму іх трэба ачышчаць як мага часцей, да таго ж штаны неабходна ачышчаць шчоткай яшчэ і з адваротнага боку. Касцюм можна таксама «асвяжыць» парай, калі павесіць яго ў ванным пакоі і ўключыць гарачую ваду, каб утварылася вільготнае паветра. Гэта дапаможа расправіць заломы на тканіне і выдаліць непрыемныя пахі.

Час ад часу касцюм трэба прасаваць, выкарыстоўваючы спецыяльную тэфлонавую насадку ці проста вільготную баваўняную тканіну. Раз у сезон (перад працяглым захоўваннем) касцюм трэба здаваць у хімчыстку. Значэнне мае і форма вешалкі, на якой ваш касцюм «адпачывае» ў шафе. Існуюць аб'ёмныя вешалкі, якія паўтараюць форму касцюма і спецыяльна прызначаны для працяглага захоўвання. Вешалка не абавязкова павінна быць драўлянай, галоўнае — каб яна правільна запаўняла аб'ём пінжака. Штаны павінны вісець на спецыяльнай вешалцы для штаноў, якая захоплівае ніжні край штанін і яны прымаюць патрэбную форму пад уздзеяннем уласнай вагі. Асабліва дарагія пінжакі пры захоўванні не страцяць сваёй формы, калі асцярожна напоўніць рукавы змятай тонкай паперай. І апошняе: для таго, каб не камечыцца, у шафе касцюмы павінны размяшчацца дастаткова вольна.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГ ЦЭНЫ

Выпуск № 6 (50)

ПРАЎДА ЗА СПАЖЫЎЦОМ

Наша арганізацыя гандлюе сотавымі тэлефонамі. Яны сертыфікаваныя і маюць гарантыю на сэрвіснае абслугоўванне ў Рэспубліцы Беларусь. Аднак сэрвісны цэнтр знаходзіцца ў горадзе Мінску, а наша арганізацыя — у раённым цэнтры. Пры продажы тэлефона мы папярэджваем пакупніка, што ў выпадку няспраўнасці ён можа звярнуцца да нас з просьбай аб перадачы тэлефона для рамонту ў сэрвісны цэнтр, бо мы перыядычна, прыкладна раз на тыдзень, туды наведваемся. Так і адбываецца. Пакупнікі звяртаюцца да нас. Але потым і прэтэнзіі маюць да нас, што мы не прывезлі ім тэлефон назад у 14-дзённы тэрмін. Аднак рамонт — гэта ж не наш абавязак, мы толькі прадаём тэлефоны. На што нам спасылацца ў размове з пакупнікамі?

Тамара, *Віцебская вобласць.*

Правы і абавязкі як пакупнікоў, так і прадаўцоў падрабязна распісаныя ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 9.01.2002 г. № 90-З «Аб абароне правоў спажыўцоў» (у рэд. ад 08.07.2008 г.). У адпаведнасці з артыкулам 14 гэтага Закона вытворца тавару павінен забяспечыць магчымасць рамонту і тэхнічнага абслугоўвання тавару, а таксама выпуск і пастаўку запасных частак у гандлёвыя і рамонтныя арганізацыі не менш, чым на працягу тэрміну службы тавару, а пры яго адсутнасці — на працягу дзесяці гадоў з дня рэалізацыі спажыўцу.

Прадавец, згодна з гэтым артыкулам, павінен забяспечыць магчымасць тэхнічнага абслугоўвання (за выключэннем нерухомай маёмасці) і рамонту тавару на працягу гарантыйнага тэрміну, а калі ён не вызначаны або меншы за два гады, — на працягу двух гадоў з дня рэалізацыі тавару, калі больш працяглыя тэрміны не вызначаныя заканадаўствам і (або) дагаворам. Калі прадавец — фізічная асоба, што ажыццяўляе рэалізацыю тавараў у рамках рамеснай дзейнасці або разавую рэалізацыю тавараў на рынку, то на яго гэта патрабаванне не распаўсюджваецца.

Артыкулам 20 Закона пералічаны правы спажыўца на выпадак набыцця тавару неналежнай якасці, калі яго недахопы не былі загадзя абумоўлены прадаўцом. Так, спажывец мае права патрабаваць замены недабраякаснага тавару таварам належнай якасці (а калі тавар тэхнічна складаны або дарагі — толькі ў выпадку выяўлення ў яго істотных недахопаў); суразмернага змяншэння цаны, па якой быў набыты тавар; неадкладнай бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару; пакрыцця выдаткаў на ліквідацыю недахопаў тавару. Таксама замест усяго гэтага спажывец мае права скасаваць дагавор куплі-продажу, вярнуўшы недабраякасны тавар, і патрабаваць вяртання выплачаных за яго грошай.

Спажывец мае права (але не абавязаны) прад'явіць патрабаванне аб неадкладнай бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару рамонтнай арганізацыі, якая ўпаўнаважана вытворцам (прадаўцом, пастаўшчыком, прадстаўніком) на ліквідацыю недахопаў тавару на працягу гарантыйнага тэрміну. Таксама спажывец мае права звярнуцца з такім патрабаваннем і да вытворцы тавару. Вытворцу ён можа прад'явіць і патрабаванні аб замене недабраякаснага тавару таварам належнай якасці, аб пакрыцці выдаткаў на ліквідацыю недахопаў тавару. Гэта вызначана пунктамі 5 і 7 артыкула 20. Толькі выбар, да каго звярнуцца, належыць спажыўцу.

Прадавец у любым выпадку абавязаны выканаць патрабаванне спажыўца, якому быў прададзены недабраякасны тавар (або адмовіць у выпадках, прадугледжаных Законам), калі спажывец вырашыў звярнуцца менавіта да яго з патрабаваннем аб замене тавару або ліквідацыі яго недахопаў ці інш.

Пасля задавальнення абгрунтаваных патрабаванняў спажыўца прадавец, згодна з артыкулам 15 Закона, можа сам патрабаваць замены тавару неналежнай якасці, вернутага спажыўцом, ад вытворцы або пастаўшчыка, які рэалізаваў яму такі тавар, а таксама пакрыцця страты, панесенай ім у сувязі з узнаўленнем парушаных правоў спажыўца.

Недахопы, выяўленыя ў тавары, згодна з артыкулам 22, прадавец (вытворца, пастаўшчык, прадстаўнік, рамонтная арганізацыя) павінен ліквідаваць бязвыплатна і неадкладна. Максімальны тэрмін ліквідацыі не павінен перавышаць чатырнаццаці дзён. Прадавец павінен сачыць за тэрмінам. За парушэнне тэрміну артыкулам 26 Закона прадугледжана адказнасць. Прадавец (вытворца, пастаўшчык, прадстаўнік, рамонтная арганізацыя), які дапусціў парушэнне, выплачвае спажыўцу за кожны дзень пратэрміноўкі няўстойку ў памеры аднаго працэнта цаны тавару.

Заходзіш у краму — ЗІРНІ НА ПЛАКАТ

Міністрам гандлю падпісаны загад аб зацвярджэнні тэксту плаката «Аб правах спажыўцоў». Гэты плакат будзе размешчаны на інфармацыйных стэндах у гандлёвых аб'ектах. У ім, у прыватнасці, у адпаведнасці з новай рэдакцыяй Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», дакладна і папулярна патлумачаны правы спажыўца і абавязкі прадаўца пры набыцці і продажы якаснага і няякаснага тавару. Мяркуецца, што дзякуючы плакату пакупнік зможа хутка зарыентавацца ў заканадаўстве.

ЧЭК І СПАЖЫВЕЦКАЯ ЎПАКОЎКА — НЕАБАВЯЗКОВЫЯ

Напрыклад, калі гаварыць аб правах спажыўца, дык пакупнік мае права на абмен ці вяртанне (на працягу 14 дзён з моманту набыцця) нехарчовага тавару належнай якасці, які не быў ва ўжыванні. Выключэнні складаюць нехарчовыя тавары належнай якасці, што не падлягаюць абмену і вяртанню згодна з пастановай Савета Міністраў № 778 ад 14 чэрвеня 2002 года. Патрабаванне спажыўца аб вяртанні грашовых сродкаў падлягае задавальненню прадаўцом неадкладна ці на працягу 7 дзён. За парушэнне гэтага тэрміну прадавец выплачвае спажыўцу за кожны дзень пратэрміноўкі няўстойку ў памеры 1 працэнта цаны, вызначанай на дзень рэалізацыі тавару. Адсутнасць у спажыўца дакумента, што пацвярджае факт набыцця тавару, не з'яўляецца падставай для адмовы ў задавальненні яго патрабаванняў аб абмене ці вяртанні тавару належнай якасці. Харчовыя тавары належнай якасці абмену і вяртанню не падлягаюць.

У выпадку набыцця тавару неналежнай якасці, калі яго недахопы не былі агавораны прадаўцом, на працягу гарантыйнага тэрміну ці тэрміну прыдатнасці, а ў дачыненні да тавараў, на якія гарантыйныя тэрміны ці тэрміны прыдатнасці не вызначаны, або гарантыйныя тэрміны складаюць менш за два гады — на працягу двух гадоў на свой выбар спажывец можа патрабаваць: замены недабраякаснага тавару таварам належнай якасці; супамернага зніжэння пакупной цаны тавару; неадкладнага бязвыплатнага выпраўлення недахопаў тавару; пакрыцця выдаткаў па выпраўленні недахопаў тавару; скасавання дагавора рознічнай куплі-продажу і вяртання выплачанай за няякасны тавар грашовай сумы.

Названыя патрабаванні падлягаюць задавальненню прадаўцом неадкладна або на працягу 7 дзён (пры заяўленні патрабаванняў аб зніжэнні пакупной цаны, кампенсацыі выдаткаў па выпраўленні недахопаў тавару, вяртанні грошай), або на працягу 14 дзён (пры заяўленні патрабаванняў па замене недабраякаснага тавару таварам належнай якасці, бязвыплатнага выпраўлення недахопаў, а таксама пры неабходнасці правядзення экспертызы).

Спажывец мае права вярнуць тавар неналежнай якасці без спажывецкай тары (упакоўкі). Таксама ён мае права на кампенсацыю ў поўным аб'ёме стратаў, шкоды, нанесеных з-за недахопаў тавару, недастатковай і непраўдзівай інфармацыі аб тавары.

А ЎПАКОЎКУ ДЛЯ ТАВАРУ ХАЧУ БЯСПЛАТНА!

Спажывец будзе ведаць, якія абавязкі ў прадаўца. Апошні, скажам, павінен даць яму зваротны чэк: на вывесцы і (ці) інфармацыйнай таблічцы — пра сваё найменне (фірменнае найменне), найменне гандлёвага аб'екта, яго рэжым працы, для гандлёвых аб'ектаў — таксама іх тып і нацэначную катэгорыю; у гандлёвым аб'екце — пра нумар, дату атрымання ліцэнзіі, тэрмін яе дзеяння, пра орган, што выдаў яе; праз цэннікі, маркіроўку, этыкеткі, дакументацыю, што дадаецца да тавару, аркушы-укладышы — пра найменне тавару, асноўных спажывецкіх уласцівасцях тавару, цану тавару і ўмовах набыцця, гарантыйныя тэрміны, тэрміны прыдатнасці ці тэрміны захоўвання, тэрміны службы, дату вырабу, найменні і месцы знаходжання вытворцы, імпарцёра, прадстаўніка рамонтнай арганізацыі, правілы і ўмовы эксплуатацыі, колькасць ці камплектнасць тавару, іншыя звесткі, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам ці заключанымі дагаворамі абавязковыя для прадастаўлення спажыўцу, у тым ліку звесткі, што адносяцца да дагавора па просьбе спажыўца; пры рэалізацыі канфіскаванага ці звернутага ў даход дзяржавы іншым спосабам тавару спажывец павінен быць праінфармаваны наконт таго, што тавар з'яўляецца канфіскаваным ці звернутым у даход дзяржавы.

Таксама прадавец павінен даць спажыўцу звесткі пра пералік тавараў працяглага карыстання, у тым ліку камплектавых частак вырабаў і складнікаў асноўнага вырабу, якія па заканчэнні пэўнага тэрміну могуць быць небяспечнымі для жыцця, здароўя, спадчыннасці, маёмасці спажыўца і навакольнага асяроддзя, тэрмін службы якіх павінен вызначаць вытворца. Стварацца умовы для прымеркі, праверкі працаздольнасці, камплектнасці, колькасці тавараў, што набываюцца; весці разлікі за тавары як наяўнымі грашыма, так і ў безнаяўным парадку.

Прадавец павінен забяспечыць перадачу тавару спажыўцу ва ўпакаваным выглядзе без дадатковай платы за яе, за выключэннем харчовых тавараў, папярэдне расфасаваных прадаўцом у аднаразовыя ўпаковачныя матэрыялы (поліэтыленавыя пакеты, скрыні, шклянкі і іншыя), выкарыстанне якіх дапускаецца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі, без герметычнай упакоўкі. Па патрабаванні спажыўца прадавец абавязаны перадаць такі тавар у бясплатнай упакоўцы.

ДЗЯРЖАВА — НА АБАРОНЕ ПРАВОЎ СПАЖЫЎЦА

Такая абарона законных інтарэсаў спажыўца забяспечваецца праз упаўнаважаныя дзяржаўныя органы ў межах іх кампетэнцыі, а таксама праз суд. На плакатах будзе інфармацыя, куды спажывец можа звярнуцца ў выпадку канфлікту. У прыватнасці, будуць звесткі пра: уласніка гандлёвага аб'екта (найменне юрыдычнай асобы, прозвішча кіраўніка і індывідуальнага прадпрымальніка), дырэктара (загадчыка) гандлёвага аб'екта, орган кіравання, што выдаў спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на рознічны гандаль, упраўленне (аддзел) гандлю і паслуг мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, упаўнаважанага па абароне правоў спажыўцоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў — з адрасамі і тэлефонамі ва ўсіх выпадках.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Са спружынамі матрац або без?

Званок у карпункт

Такое канкрэтнае пытанне задала нашаму ўласнаму карэспандэнту па Віцебскай вобласці чытачка з Віцебска Аляўціна Паўлаўна Ярашэнка.

— Майму сыну яшчэ няма і пяці гадоў, — расказвае **Аляўціна Паўлаўна**. — Хачу купіць яму тахту. Але ўсё думаю, якую лепш: матрац са спружынамі або не? Што лепш для маленькага чалавека, на чым карысней спаць?

Звязаўся са спецыялістамі. Не вырабляюць у нашым Прыдзвінскім рэгіёне матрацы (ну, не знайшоў я вытворцу). А мэблю для дзяцей робяць.

— Я параіў бы купіць тахту або нешта іншае, каб матрац быў двухбаковы са спружынамі, — расказвае **намеснік дырэктара прадпрыемства «Паставы мэбля» Сяргей ЛАЦЕЦКІ**. — Мы матрацы не вырабляем. Але, вядома, матрац са спружынамі, хай і даражэйшы, але больш надзейны. Праслужыць доўга... Хаця, мо лепш у медыкаў спытаць?

Педыятр Раман Уладзіміравіч КАРАНЕВІЧ лічыць, што маладому арганізму лепш адпачываць на матрацы без спружын.

— Вы ж уявіце сабе, якія б ні былі моцныя спружыны, але яны не даюць эфекту поўнага прылягання цела да матраца, — тлумачыць урач. — А без спружын матрац у гэтым сэнсе больш эфектыўны. Наогул матрац без спружын, на мой погляд, і не вельмі адрозніваецца ад «брата» са спружынамі. А каштуе танней. Галоўнае, каб быў ён якасным. Як гэта зразумець? Падрабязна апытваць гандляроў, не саромецца папрасіць адпаведную дакументацыю наконт таго, хто вытворца матраца, колькі ў ім слаёў.

Наконт артапедычных магчымасцяў матрацаў. Усе яны нейкім чынам валодаюць гэтай асаблівасцю. Тыя ж спружынныя сістэмы бываюць розныя. Адпаведна, чым даражэйшыя, тым яны больш надзейныя. А недарагія спружынныя матрацы ў хуткім часе могуць і «прасесці». І давядзецца рамантаваць мяккую мэблю. Хаця, калі шчыра, не ведаю, каб нехта грунтоўна вывучаў, які матрац лепш выбіраць чалавеку...

Патэлефанаваў прадпрымальнікам, да якіх асабіста звяртаўся ў розны час, каб абнавіць мяккую мэблю.

Яны таксама не маглі канкрэтна адказаць на пытанне нашай паважанай чытачкі. Усё залежыць ад якасці напаўнення матраца. Пераважная большасць вытворцаў напаўняюць матрацы... какосам, какосавым «матэрыялам». Брэндавыя вытворцы спецыяльна для дзяцей робяць матрацы з выкарыстаннем бамбуку. Адпаведна можна зрабіць дапушчэнне: бамбук — матэрыял цвёрды, значыць, цвёрдасць — і ёсць тое, што патрэбна спіне дзіцяці?

Які матрац больш праслужыць? Натуральна, са спружынамі. І сумнявацца не трэба. Гэта ж, выходзіць, двайная гарантыя! Калі нешта здарыцца са спружынамі, верхні слой матраца будзе «працаваць». Але ці ўтульна будзе спаць пры такім раскладзе?

Упэўнены, што лепш купіць больш дарагую тахту ў краме, якая працуе не адзін год. І абавязкова не забыць пацікавіцца — на які час даецца гарантыя на мэблю. Верагодна, лепш за ўсё ўзяць з сабой у краму і само дзіця і паназіраць, на якім матрацы яму больш спадабаецца паляжаць. Заказваць мэблю ў прадпрымальнікаў або ў краме гатовую купляць ад вядомых вытворцаў? Я параіў бы апошняе. У выніку чаго і на начальства гандляроў выйсці можна. А індывідуальныя прадпрымальнікі — ужо прабачце, пры ўсёй павазе — сёння чалавек працуе, заўтра ўжо не. І што потым рабіць пасля няўдалай пакупкі?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗМЕНЕНЫ ЧАС АДПРАЎЛЕННЯ

З 8 верасня па аўторках, серадах, чацвяргах і нядзелях аўтобус Мінск — Масква адпраўленнем ад аўтавакзала «Усходні» ў 18.30, будзе адпраўляцца ў 18.10, ад д/с «Дружная» — у 18.30 (уводзіцца заезд для рэйса Мінск — Масква), ад аўтавакзала «Маскоўскі» — у 19.00.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Карысная «халва» на далонях

Белай глінай нашы продкі лячылі дзясяткі хваробаў

Пяцігадовая дачка маёй суседкі гэтым летам адпачывала ў вёсцы ў сваёй бабулі. Малая гойсала басанож усюды. Ужо праз два тыдні дзяўчынка пазбівала сабе ногі, а скура паміж пальцамі патрэскалася і месцамі пачала нават балюча падгніваць. Гарадская вандроўніца адразу запрасілася да бацькоў у вялікі горад. Аднак бабуля «адрамантавала» далікатныя ногі ўнучкі звычайнай мясцовай белай глінай усяго за 3 дні...

Яшчэ ў старажытныя часы беларусы ведалі, што ў гліне няма бактэрый. Яна паглынае вакол сябе вадкія і газападобныя таксіны, дрэнныя пахі і забівае мікробы. Калі моркву, бурак, рэдзьку і нават бульбу толькі абмакнуць у гліняную баўтуху, то яны не загніваюць усю зіму. Прыкладна па такім сцэнарыі вылечыла ногі бабуля сваёй унучцы. А яшчэ старая навучыла дзяўчынку мыць галаву гліністай вадой, пасля чаго знікла перхаць, а валасы раслі здаровыя, бліскучыя.

А вось для дарослых дзяўчат і жанчын баба Маша прапанавала наступны рэцэпт. Трэба белую гліну развесці да стану густой смятаны і нанесці тонкім слоем на твар. Прыкладна праз 15—20 хвілін змыць цёплай, а потым халоднай вадой. Пасля гэтай працэдуры скура набывае цудоўны аксаміцісты колер, згладжваюцца зморшчыны, знікаюць прышчы, святлее рабацінне. Маска з гліны робіцца больш дзейсная, калі ў яе даць сок агуркоў, таматаў, лімонаў ці журавін.

У далёкія мінулыя часы нашы продкі глінай уратоўваліся ад розных харчовых атручэнняў, а таксама ад халеры, дызентэрыі і многіх заразных хваробаў.

Аптэчную белую гліну медыкі прапаноўваюць і зараз у форме прысыпак, пастаў, мазяў пры скурных захворваннях, а таксама ўнутр пры харчовых атручэннях.

У народнай медыцыне белую гліну выкарыстоўваюць больш шырока. Ёю лечаць язву страўніка, панос, уздуцце жывата, жаўтуху, цыроз печані, парушэнне абмену рэчываў і нават **алкагалізм**. Для гэтага трэба ўзяць 15—20 грамаў белай гліны, разбавіць у 150 мл цёплай вады, прымаць за 10—20 хвілін да яды. Курс звычайнага лячэння доўжыцца 1—2 тыдні.

Для лячэння выбіраюць белую гліну без пяску, якая падсохла на сонцы, паблізу з берагамі рэк і азёр, абавязкова воддаль ад прамысловых прадпрыемстваў і населеных пунктаў. Захоўваюць белую гліну ў шкляным, драўляным ці фарфоравым посудзе. Перад лячэннем яе абавязкова прасушваюць на сонцы, а разбаўляюць расталай снежнай вадой ці чыстай вадой з крыніц або калодзежаў.

Я і сам зацікавіўся рэцэптамі мудрай бабы Машы і накапаў на беразе возера ў Магілёўскай вобласці гэтай цудоўнай белай гліны. Калі я паказваў яе сябрам, то яны вырашылі, што гэта нейкая вельмі якасная замежная халва. Не, гэта «халва» наша беларуская і вельмі карысная...

Сяргей ПАЛІНІН.

Праверана на сабе

«СЛОВА ПРАДПРЫМАЛЬНІКА...»

Купцы адышлі ў мінулае, на змену ім прыйшлі ІПэшнікі, якія гэтаксама купляюць тавар і прадаюць. Некалі слова купца было што крэмень. Калі ён нешта паабяцаў, то заключаць дагавор не трэба было. Купецкія дынастыі фарміраваліся пакаленнямі.

Падчас водпуску надумаў закупіць 5 м³ газасілікатных блокаў, дзясятак лістоў шыферу ды цэмент. Невялікая, яшчэ з польскага часу, пабудова асела, і трэба было паставіць новую.

Мясцовыя газеты стракацяць аб'явамі прадпрымальнікаў, якія абяцаюць прывезці будматэрыялы, і мне ў галаву не прыйшло, што могуць узнікнуць нейкія праблемы. Робіш заказ, табе прызначаюць час і прывозяць. А галоўнае, што без валакіты — табе прывезлі і ты заплаціў на месцы. Гэта я так думаў.

Акрамя баранавіцкіх прадпрымальнікаў, свае паслугі прапаноўваюць нясвіжскія, лунінецкія, бярозаўскія, ляхавіцкія. Вось і патэлефанаваў апошнім — усё ж землякі.

Паабяцалі прывезці блокі на наступны дзень а 15 гадзіне. На сваю дачу я прывёз знаёмага, адчыніў браму, на газон паклаў ліст бляхі і пачаў чакаць машыну. У вызначаны тэрмін матэрыялы не даставілі, не прывезлі іх і праз гадзіну, а потым патэлефанавалі і сказалі, што блокаў не будзе, бо... Тлумачэнне слухаць не стаў, а пайшоў наліваць знаёмаму — чалавека адарваў ад справы.

Бяда невялікая — не прывезлі гэтыя, то ёсць з каго выбіраць, ды і ўвесь водпуск наперадзе.

Пазваніў мясцоваму прадпрымальніку, і ён папрасіў патэлефанаваць яму вечарам, пры гэтым голасам, які не дапускаў ніякага сумнення, паабяцаў закрыць пытанне літаральна на наступны дзень. А вечарам я пачуў, што сапсавалася машына, але...

Падвёў і трэці прадпрымальнік — на складзе, адкуль ён прывозіў матэрыялы, блокаў не было.

Калі купляць, то адным махам — блокі, шыфер і цэмент, а тут высветлілася, што цэмент знік.

— Сёння апошні мех прадалі, а заўтра будзе, — супакоілі па тэлефоне.

Але таго цэменту не было і паслязаўтра.

З Нясвіжа даставіць блокі адмовіліся. Маўляў, пяць кубоў за пяцьдзесят кіламетраў — далекавата, а вось прадпрымальнік з Любані (дзе Баранавічы, а дзе Любань) даў згоду, і цана ў яго не 170 тысяч за м³, а 160, але ўдакладніў, што прывязе, калі ў маім баку будзе яшчэ заказчык, каб не гнаць машыну паўпустую.

І я махнуў рукой, бо высветлілася, што з маім аўтамабілем праблема — ціснеш на газ, рухавік набірае абароты, а не цягне. Дыягназ паставіў сам — трэба мяняць счапленне.

Паехаў на аўтарынак «Зорны». Запчастак, быццам бы, прадаецца многа, а які дыяметр счаплення, вызначыць не могуць. Гартаюць каталогі і гавораць пра два варыянты. Раяць мне зняць тое счапленне з машыны і прыехаць з ім на рынак. Але ж я ўмею толькі руліць.

— У панядзелак зробім, — сказаў знаёмы майстар, і я ў прызначаны час падагнаў машыну да яго гаража. Прастаяў гадзіну, а майстар не з'явіўся. Патэлефанаваў, а ён сябе кепска адчувае, бо ў нядзелю перабраў.

Дамовіўся з другім, што ён зніме счапленне ў маім гаражы, бо невядома, калі я здолею тую запчастку купіць.

Раніцай, а 9 гадзіне, расчыніў дзверы гаража і чакаю. Не дачакаўся і паехаў да майстра, а ён стаіць на сваім гаражы, расцягвае рубероід і кажа:

— Сонечны дзень выдаўся, то трэба выкарыстаць, а счапленне мы знімем.

Я стараюся прытрымлівацца сістэмнага распарадку ў жыцці. Калі нешта паабяцаў, то імкнуся выканаць, і хочацца такога ж стаўлення да сябе. Па сістэме «шаляй-валяй», можа, жыць і прасцей, але жыць заможна чалавек не будзе. Дарэчы, шмат чаго дамагліся тыя народы, у якіх парадак, усё арганізавана і адпрацавана.

Водпуск закончыўся — блокі прывезлі.

Аўтамашыну я адрамантаваў, хоць і набегаўся ў пошуках запчастак. І блокі на дачу прывезлі. Насеў на прадпрымальніка, патэлефанаваў раніцай, вечарам, потым яшчэ, і будаўнічыя матэрыялы прывезлі ў прызначаны час. Толькі вось водпуск закончыўся, і цяпер давядзецца чакаць вясны.

І яшчэ маленькі штрых. У пошуках рабочага для разгрузкі машыны падышоў да хлопцаў, якія сабраліся раніцай у скверы перад крамай.

— Хто хоча атрымаць за гадзіну работы 25 тысяч рублёў? — пытаюся ў іх. Дарэчы, амерыканская расцэнка. Ніхто не варухнуўся. Відаць, таму, што ад крамы ўжо спяшаўся калега з дзвюма бутэлькамі ў руках. І давялося адрываць ад працы прыяцеля.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Марыя ЕСЬМАН:

«БЫЛО ВЕЛЬМІ СТРАШНА, АЛЕ Я ЎСЁ Ж ПАДАІЛА КАРОВУ...»



Вось яна — наша надзея. 20-гадовая мінчанка Марыя Есьман. Менавіта ёй выпаў гонар прэзентаваць Беларусь на конкурсе прыгажосці «Міс інтэркАНТыненталь», які ўпершыню будзе праходзіць у Мінску. З больш чым трохсот чалавек, якія прыйшлі на кастынг тэлеканала АНТ, выбралі менавіта гэту грацыёзную, мілую і інтэлігентную дзяўчыну.

Калі мама нашай прыгажуні аддавала сваю дачку ў першы клас, то вельмі баялася, што маленькая Маша на ўроках будзе няўважлівай — такой порсткай і гаварлівай была дзяўчынка. А атрымалася так, што на ўроках дзяўчо сядзела ціха і настаўнікаў заўсёды слухала ўважліва (пазней Маша скончыць школу з залатым медалём), а на перапынках лётала як ураган...

— Я пастаянна прыносіла дадому разбітыя вазоны з кветкамі, — з усмешкай узгадвае першыя гады ў школе Марыя. — І шыбы мама пастаянна мяняла ў класе... Я была настолькі энергічным дзіцем, што гэтую энергію проста не было куды падзець. Таму я і не здзіўляюся, што ў 4 гады бацькі аддалі мяне на гімнастыку, у 6 — на бальныя танцы, а пасля і на вакал... Але я ім удзячная.

Любімы колер у Марыі Есьман — белы, а з любімых ласункаў — шакалад. Белае і чорнае як прыцягненне супрацьлегласцяў — законы прыроды.

Апошнім жа часам, як прызнаецца Маша, самым частым сярод пытанняў, якія задаюць журналісты, стала пытанне пра прыроду Машыных вуснаў: няўжо свае? Дзяўчына гучна паўтарае: «Кажу яшчэ раз, каб усе чулі: пластыку я не рабіла, у мяне ўсё натуральнае — ад прыроды!»

З Машай мы сустрэліся ў Моладзевым тэатры эстрады, дзе ў дзяўчыны праходзілі заняткі па аэробіцы.

«Лепшы сябар — брат»

— Які настрой у апошнія дні?

— Настрой нармальны, трымаюся. Толькі хутчэй ужо хочацца пазнаёміцца з дзяўчатамі, цікава ўсё ж — яны прыедуць з розных краін. А гэта розныя культуры, розныя нацыянальнасці, розныя менталітэты. Вельмі цікава. Лічу, што мне выпаў вельмі добры шанец.

— Можа быць, кагосьці асабліва баіцеся? Бачылі, відаць, ужо анкеты канкурсантак. З пункту гледжання канкурэнцыі...

— Ды не. Усе дзяўчаты прыгожыя — у кожнай бачу канкурэнтку. Проста прыгажосць — гэта заўсёды суб'ектыўная думка — яна ў кожнага свая, таму як яно будзе цяжка сказаць.

— Раней ужо ўдзельнічалі ў падобных конкурсах?

— Не, гэта мой першы конкурс прыгажосці.

— А на кастынг таксама прыйшлі першы раз у жыцці ці да гэтага дзесьці ўжо займаліся?

— Кастынг як адбор на конкурс прыгажосці быў ўпершыню. А так удзельнічала ў кастынгах, але не надта доўга. Паўгода я займалася ў агенцтве Сашы Варламава. Ездзіла на паказы. Але такі вось менавіта вопыт на конкурсе прыгажосці — гэта быў першы раз. Да гэтага яшчэ не было.

— А як да кастынгу рыхтаваліся?

— Кажучы шчыра, гэта ўсё было спантанна. Слова гонару. Я ўвогуле лічу, што ўсё спантаннае найбольш удала атрымліваецца. Бо калі рыхтуешся, то перажываеш, за ўсё хвалюешся. Насамрэч на кастынг я прыйшла з сяброўкай. Гэта яна расказала пра яго. Я згадзілася: «Ну, хадзем». Атрымалася ў самы раз.

— Сваім родзічам вы казалі, што ідзяце на кастынг?

— Толькі самым блізкім: тату, маме і любімаму брату. Ён мой самы лепшы сябар, працуе стаматолагам.

«Шакаладку дзяліла сумленна»

— А вы, як я ведаю, на юрыдычным факультэце вучыцеся.

— Так.

— А курсавыя працы ўжо былі?

— Пісала курсавую працу.

— На якую тэму?

— Не скажу *(усміхаецца)*.

— Гэта сакрэт?

— Так *(смяецца)*.

— А прадметы якія ў вас любімыя?

— Я не магу зараз сказаць пра штосьці канкрэтнае, бо зараз яны ўсе агульныя (нядаўна Маша перайшла на трэці курс універсітэта. — **Аўт.**). Але большасць — падабаецца, нават фізкультура. Асабліва даспадобы, відаць, крымінальнае права. Хоць гэта дастаткова цяжкі прадмет, у прыватнасці, для дзяўчыны. Па прафесіі цяжкавата ісці, але вельмі цікава.

— У будучыні хацелі б бачыць сябе суддзёй, следчым?.. Кім?

— Таксама цяжка яшчэ сказаць. Гэта яшчэ наперадзе.

— А тэма курсавой з чым была звязаная? Намякніце...

— Я не скажу. Гэта сакрэт. Не выпытвайце *(смяецца)*.

— Добра, не будзем. А адкуль вы ведаеце ўкраінскую мову?

— Я там нарадзілася. Ды і ў прынцыпе, гэта ж адна са славянскіх моў. Яны вельмі падобныя. І ўвогуле гэта вельмі прыгожая мова. Слухала ўкраінскія песні, трохі цікавілася.

— А наколькі зменіцца ваша жыццё ў плане вучобы? Ці прадбачыцца ў верасні вызваленне ад заняткаў?

— Думаю, што зменіцца. Мне сказалі, што ад заняткаў вызваляць, паколькі падрыхтоўка да конкурсу — гэта таксама вельмі сур'ёзна. Але я думаю, што буду як-небудзь старацца: падладжвацца, каб паспець таксама і на вучобу. Бо пытаюць часам: «А ці будзеш кідаць універсітэт?» Ні ў якім разе! Дакладна і адназначна: я буду вучыцца. Зразумела, цяжка будзе, але што рабіць — такое жыццё.

— Патлумачце, чаму менавіта юрыдычны факультэт? Бо ў нас, здаецца, зараз лішак юрыстаў?

— Не, не лішак. Я думаю, гэта непраўдзівая інфармацыя. Зараз шмат розных прадпрыемстваў адкрываецца. Прафесія юрыста сёння вельмі важная і карысная. Юрысты, якія ведаюць, што і як рабіць у розных жыццёвых сітуацыях, заўсёды патрэбныя. Юрыстам я хацела стаць з пятага класа. Хацелася, каб усё было сумленна. Калі дзяліла шакаладку ў дзяцінстве, то таксама заўсёды сумленна — на чатыры кавалкі *(смяецца)*.

— З пятага класа?

— Так.

— Я таксама на журфак яшчэ ў чацвёртым вырашыў паступаць. Бачыце, якія мы з вамі мэтанакіраваныя...

— А мой брат увогуле, як гаварыць навучыўся, ужо хацеў быць стаматолагам. Вось чалавек з самага дзяцінства ўжо ведаў...

«Стылістам давяраю»

— Як зараз праходзіць падрыхтоўка да конкурсу?

— Зараз працую са стылістамі. Яны будуць шыць касцюмы, меркі здымаюць. Меліраванне мне зрабілі. Да гэтага я ні разу валасы не фарбавала. Мой натуральны колер — русы. А зараз вырашылі зрабіць мяне святлейшай. Бачыце, я вам нават сакрэты раскрываю.

Увогуле я была супраць фарбавання валасоў. Але стылісты сказалі, значыць, яны больш ведаюць, дасведчаныя — я ім даверяю. Харошыя спецыялісты, харошая каманда АНТ, прафесійная, чаму б і не.

— Акрамя стылю, якія яшчэ заняткі праводзяцца?

— Для сябе займаюся харэаграфіяй, каб падтрымліваць форму. Дзесяць гадоў я займалася бальна-спартыўнымі танцамі прафесійна. Пасля кінула, таму што цяжкавата было знайсці высокага партнёра. Рост 177 см, яшчэ абцасы, з партнёрам няпроста.

— Відаць, трэба было мне з маім ростам у 189 см да вас у бальныя танцы ісці. Хоць танцы не мой «канёк», але па росце падышоў бы. А вы адмалку такая высокая?

— Не. Неяк заўсёды была сярэдняга росту. А пасля, дзесьці ў класе дзясятым (з дзевятага па дзясяты), літаральна за лета так вось вырасла. У класе нас было дзве такія — самыя высокія дзяўчынкі.

— А ў будучыні што хацелі б зрабіць сваім асноўным заняткам — юрыспрудэнцыю ці мадэльную справу?

— Мадэль — гэта хобі. Гэта як я займалася скрыпкай — для сябе, для душы. У якасці мадэлі вырашыла сябе паспрабаваць, таму што часта пыталіся, чаму я не іду ў мадэлі. Часта падыходзілі на вуліцах: «А вы не мадэль выпадкова?» Я падумала: а чаму б і не. Чалавек я цікаўны, то і вырашыла. Але гэта хобі, надалей я не бачу сябе там. Я бачу сябе з дзецьмі, з мужам.

— Адказнасць адчуваеце?

— Вядома ж, вельмі вялікую адказнасць, паколькі я прэзентую цэлую краіну. Трэба трымаць марку. Ёсць хваляванне, адказнасць адчуваецца. Але стараюся трымаць сябе ў руках. Бацькі мяне не гэтаму навучылі: якія сітуацыі ні былі б, заўсёды трымаць сябе ў руках.

— Ці ёсць у цябе якісьці жыццёвы дэвіз альбо ўстаноўка?

— Дэвіза няма, але я кіруюся тым, што трэба добрым чалавекам быць. Гэта значыць, такія пачуцці, як рэўнасць, зайздрасць — вельмі неразумныя пачуцці. Яны проста з'ядаюць чалавека знутры і нічога яму не даюць. Таму лічу, што проста трэба заўсёды атрымліваць асалоду ад жыцця і ніколі гэтыя пачуцці не выкарыстоўваць, старацца ад іх проста адмовіцца.

— А вось акрамя скрыпкі, танцаў, якія яшчэ маеш захапленні? Можа, кнігі чытаеш? Як адначываеш увогуле?

— Чытаць — так, кнігі я люблю. Зараз чытаю апавяданні Булгакава. Нядаўна прачытала Патрыка Зюскінда «Гісторыя спадара Зоммэра». Летам у вольны час люблю плаваць, катацца на веласіпедах, вельмі люблю гуляць на свежым паветры. Зімой — лыжы, канькі. Галоўнае, каб з карысцю для здароўя.

«Я падобная да лебедзя...»

— Цяпер будзе адказнае пытанне — за маімі плячыма мужчынская аўдыторыя: ці ёсць у Марыі хлопец?

— Не, хлопца ў мяне няма. Сяброў сярод хлопцаў шмат (самы галоўны сябар — мой брат), а хлопца няма. Лічу, што гэта вельмі сур'ёзны крок: не проста так — сустракалася, кінула, пасля яшчэ з кімсьці. Жахліва.

— Ці хацела б скокнуць з парашутам? Зрабіць што-небудзь рызыкоўнае?

— Хацела б! *(у вачах Марыі загараецца агеньчык)* Я хачу скокнуць з парашутам, але мяне адгаворваюць бацькі. Кажуць, навошта гэта табе і для чаго. Навошта сваё жыццё давяраць якомусьці там кольцу, за якое трэба тузануць, каб раскрыўся парашут?

— А аўтастопам ніколі не ездзіла?

— Не, ніколі ў жыцці. Трохі жудасна. Я такая больш цяплічная расліна, мне лепш дома.

— То калі параўнаць з раслінай, то гэта будзе якаясьці кветка ці нешта іншае?

— Я не ведаю, вам відней.

— Хоць у кветках я не спецыяліст, але па мне ты падобная больш да ружы...

— Праўда?..

— Так, толькі з меншай колькасцю шыпоў. Такая незвычайная ружа, не такая як астатнія...

— Дзякуй вялікі, вельмі прыемна. Мне проста хлопчык адзін сказаў, што я падобная да лебедзя, гэта калі параўноўваць з птушкай...

«Проста верыць...»

— У цябе ёсць мара?

— Я вельмі хачу падарожнічаць, прытым хачу падарожнічаць разам з бацькамі. Яны ў мяне таксама аматары падарожжаў. Мама вельмі хоча пабываць у Аўстраліі. І мая мара — звазіць бацькоў туды.

— А ў дзяцінстве бацькі адвозілі цябе да бабуль у вёску? Якія самыя цікавыя моманты можаш узгадаць... Карову даіць ці бульбу капаць умееш?

— Адзін раз было, калі дзядуля паказаў мне, як трэба даіць карову. Я паспрабавала. Было вельмі страшна, бо я баялася зрабіць карове балюча. Але ўсё прайшло нармальна, я нават нешта трохі надаіла *(усміхаецца)*.

— Маша, на сёння ты — адзін з прыкладаў таксама і для дзяўчат. Асабліва тых, якія вельмі хочуць паспрабаваць сябе ў мадэльным бізнэсе. Што магла б ім пажадаць?

— Проста верыць у сябе. Верыць у тое, што вы хочаце, і яно абавязкова ажыццявіцца. І вельмі важна пазбавіцца ад рэўнасці і злосці. Гэтыя пачуцці вельмі моцна перашкаджаюць. А людзі цягнуцца да тых, хто добры сэрцам.

— Дзякуй за размову і поспехаў! Шчыра жадаю ўдачы!

Ілья ЛАПАТО.
Фота прэс-службы тэлеканала АНТ.

Конрад ФРЭДЭРЫКС, кіраўнік англійскага тэатра:

«ПА ЎСІМ СВЕЦЕ ГОЙСАЮ, А КАРЫСНУЮ РЭЧ ДАЛІ ТОЛЬКІ Ў БРЭСЦЕ»

Брэст расквечваецца сцягамі краін-удзельніц штогадовага фэсту «Белая вежа» — значыць, надышла восень.

Кожнай восені заўзятыя тэатралы чакаюць як свята. Чым цяпер нас парадуе «Белая вежа»? Яе заўсёдныя арганізатары — генеральны дырэктар Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы Аляксандр Козак і начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Рыгор Бысюк — на прэс-канферэнцыі запэўнілі журналістаў, што «Вежа» абяцае і адкрыцці, і асалоду ад добрага класічнага тэатра. Сёлетні фэст прысвечаны 200-м угодкам з дня нараджэння вялікага пісьменніка і драматурга Мікалая Гогаля. Сем спектакляў па творах класіка ўключаны ў тэатральную афішу. Распачне фестываль 5 верасня таксама спектакль паводле твора Гогаля. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Горкага вязе да нас з Мінска «Жаніхоў».

Беларускіх тэатраў у праграме сёлетняга фэсту шмат, свае работы пакажуць чатыры сталічныя калектывы і тэатры з усіх абласных цэнтраў краіны. Гасцямі ў гэтым годзе будуць тэатральныя трупы з 13 краін свету. Расія, Польшча, Украіна, Малдова, Венесуэла, Літва, Германія — пастаянныя ўдзельнікі «Вежы», прапанавалі свае пастаноўкі таксама Іран, Азербайджан, Таджыкістан, нават далёкая Нігерыя. Ужо раскуплена 80 працэнтаў білетаў на фестывальныя прагляды. На маскоўскія тэатры, львоўскі «Уваскрэсенне» і некаторыя іншыя квіткі разышліся ў першы дзень продажу. І як не разысціся? Маскоўскі драмтэатр імя Астроўскага пакажа «Панначчу», а цэнтр Мейерхольда з расійскай сталіцы абяцае новае прачытанне «Вечароў на хутары паблізу Дзіканькі». Тэатр «Уваскрэсенне» з Львова заінтрыгаваў патэнцыйнага гледача, вызначыўшы сваю «Ноч для жанчын» як інтэгральны стрыптыз. Зразумела, што глядач пойдзе, хоць бы для таго, каб даведацца, чым, напрыклад, стрыптыз інтэгральны адрозніваецца ад стрыптызу дыферэнцыйнага.

На гэты раз запланавана аж чатыры вулічныя спектаклі. Згаданы львоўскі тэатр, акрамя паказу на сцэне, выступіць яшчэ і на цэнтральнай плошчы горада з паказам «Сустрэць Прасперо». Сёлета і брэсцкі тэатр падрыхтаваў вулічны спектакль «Мара пра Дон Кіхота». Па жанравасці праграма абяцае быць насычанай, а па змесце — стане магчымым меркаваць пасля праглядаў. У журы ўвайшлі тэатразнаўцы з чатырох краін.

Білеты на пастаноўкі каштуюць ад 4 да 40 тысяч рублёў. Такі кошт удалося ўтрымаць таму, што асноўныя выдаткі на фестываль узяў на сябе бюджэт Брэсцкай вобласці. Праўда, сёлета давялося ахвяраваць пэўнымі рэкламнымі мерапрыемствамі, уціснуцца з набыццём сувеніраў, адмовіць некаторым заяўнікам на ўдзел, бо ў цэлым затраты на фестываль паменшаныя прыкладна на 20 працэнтаў. Крызіс паціху дабраўся і да Мельпамены. Але не стаў перашкодай для правядзення тэатральнага фэсту года, і гэтым вельмі ганарацца яго арганізатары і стваральнікі.

Праўда, па фінансавых меркаваннях давялося адмовіцца ад некаторых калектываў, і перш за ўсё тых, якія разлічаны на пастаноўку ў малой зале. Зразумела, што выдаткі на паказ вялікія, а касавы збор адпавядае зале. Таму дзясяткі два ахвотных прывезці свае творы на брэсцкі агляд атрымалі ветлівую прапанову пачакаць яшчэ гадок, а ўжо на наступны фэст... будзе відаць.

Вось толькі дарэмна, на мой погляд, адмовіліся ад традыцыйных брэсцкіх дыванкоў у якасці падарункаў. Можа, якому снабісту-эстэту і падаецца, што такі сувенір занадта прымітыўны, то хіба варта на гэта зважаць? Але дываноў за многія гады стаў адметнай асаблівасцю менавіта гэтага фэсту. Акрамя таго, рэч практычная. Некалі, помніцца, Конрад Фрэдэрыкс, кіраўнік бліскучага англійскага вулічнага тэатра, той яшчэ жартаўнік, сказаў: «Па ўсім свеце гойсаю, а карысную рэч далі толькі ў Брэсце».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

РОДНЫЯ ГУКІ

Тураў разумее музыку роднай зямлі

Шануй сваё!

Асабліва калі яе стварылі сыны гэтай зямлі. Вось дзеля ўслаўлення музыкантаў, кампазітараў і іншых творцаў Беларусі з'явіліся святы камернай музыкі ў розных гарадах і мястэчках нашай краіны.

«Сёлета, калі шырокі мастацкі свет адзначае 190-годдзе Станіслава Манюшкі, мы вырашылі паставіць яго асобу ў цэнтр музычных імпрэзаў, якія ў Тураве маюць асаблівыя, старажытныя акцэнты», — адзначыў мастацкі кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіл Фінберг напярэдадні сустрэч з тураўскай публікай.

Свята камернай музыкі, якое прыйдзе ў горад 4 верасня, сёлета прысвячаюць Году роднай зямлі. Але славу гэтай зямлі ў розныя часы ствараліся выдатныя асобы. І нават калі мы лічым, што ведаем усіх сваіх славутых людзей і ведаем ўсё пра іх, то сённяшнія даследчыкі беларускай гісторыі і культуры могуць сказаць іншае: яшчэ ёсць і будуць моманты для адкрыццяў. Святы камернай музыкі, якія ладзіць Нацыянальны канцэртны аркестр, накіраваныя на тое, каб народ ведаў сваю культуру, якая часам сціпла хавалася ў пыле стагоддзяў, што пакрываў зборы рукапісаў, кнігі, аркушы з нотамі, ці ўвогуле на нейкі час эмігравала і лічылася замежнай. Як постаць самога Манюшкі, які належыць адразу тром народам: беларускаму, польскаму, літоўскаму. Аднак ён з дзяцінства выхоўваўся ў пашане да беларускага слова і беларускай народнай музыкі. І ўсё гэта пазней вылілася ў яго музыку. Яна — смелая, фантастычная, багатая — прывяла яго ў польскую сталіцу і зрабіла заснавальнікам польскай оперы.

Аднак у Тураве разам з музыкай Станіслава Манюшкі прагучаць творы яго суайчыннікаў і сяброў — Напалеона Орды, Мечыслава Карловіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Асобная праграма «Знакамітыя сыны Беларусі» будзе паказана ў гарадскім доме культуры.

Што да сыноў, а таксама дачок, то яны і зараз услаўляюць сваю радзіму. Напрыклад, піяністка Даша Мароз — лаўрэат міжнародных конкурсаў. Яна ў рамках імпрэзы правядзе майстар-клас у Жыткавічах. А ў самім Тураве кампазітар Эдуард Зарыцкі сустрэнецца з педагогамі і вучнямі дзіцячай школы мастацтваў. Аднак жа сыны самой Тураўшчыны сябе пакажуць — народны хор гарадскога дома культуры пад кіраўніцтвам Васіля Птушко, ды народныя майстры са сваімі роднымі вырабамі. Таму і народныя, што родныя...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Свята ў рамках

Дзень горада ў Мінску пройдзе пад узмоцненай аховай. «У месцах, дзе будуць збірацца больш за 500 чалавек, арганізуюцца кантрольна-прапускныя пункты. Гледачы будуць праходзіць як праз стацыянарныя, так і праз ручныя металадэтэктары», — паведаміў намеснік начальніка ГУУС Мінгарвыканкама, кіраўнік міліцыі грамадскай бяспекі Уладзімір Навіткевіч.

Пры гэтым прадстаўнікі ГУУС абяцаюць мінімізаваць нязручнасці для жыхароў і гасцей сталіцы. Так, ля кожнага з пунктаў сталічная міліцыя ўсталюе стэнды з пералікам рэчаў, якія забаронена праносіць на масавыя гулянні. Дакладная колькасць рамак не называлася, але ўжо вядома, што дзейнічаць яны будуць і ў цэнтры, і ў раёнах — у прыватнасці, на пляцоўцы ля Нацыянальнай бібліятэкі і ля стэлы «Мінск — горад-герой», дзе 12 верасня пройдзе Мінскі міжнародны марафон, а ўвечары адбудзецца святочны феерверк. Дарэчы, каб убачыць усе запланаваныя мерапрыемствы ў поўнай красе, рэкамендуецца прыходзіць загадзя — за 1—1,5 гадзіны. Пры гэтым неабходна памятаць, што з алкагольнымі і слабаалкагольнымі напоямі праз рамку не прапусцяць, дазваляецца толькі мінеральная вада ў празрыстай упакоўцы.

Продаж алкаголю ў месцах масавых гулянняў на час правядзення свята таксама будзе забаронены — у радыусе 500 метраў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Муз-news

Можна ў «Афрыку» прыйсці!

1 верасня гурт «БЕЗ БІЛЕТА» зрабіў прыхільнікам незапланаваны падарунак — на афіцыйным сайце www.bezbileta.net музыканты змясцілі песню «Афрыка» з новага альбома, выпуск якога запланаваны ў кастрычніку. Яна будзе даступная для свабоднага спампоўвання да 15 верасня. А паралельна з песняй на экраны айчынных тэлеканалаў выходзіць кліп «Афрыка».

«Мы зрабілі маляўнічае, добрае і вясёлае відэа з прыгодамі, поўнае любові да жыцця і з марамі пра Афрыку, — расказвае лідар калектыву Віталь Артыст. — Кліп стылізаваны пад 70—80-я гады. Удзельнікі гурта ў кадры з'яўляюцца пакрытыя афрыканскімі татуіроўкамі і танчаць таксама не па-нашаму. Пры гэтым, заўважу, ніводны кракадзіл на здымачнай пляцоўцы не пацярпеў! Так што ўставай, танцуй і спявай, дарагі глядач!».

Між іншым, летам скарбонка гурта папоўнілася яшчэ адным кліпам, які зняла жонка і муза саліста Таня Кушнер на песню «Дзіўнае жыццё». І калі «Афрыку» здымалі ў Беларусі, то «Дзіўнае жыццё» ствараліся якраз на тэрыторыі чорнага кантынента...

«Канцэртная зала» ў прыёмніку

Штодзённая 1,5-гадзінная праграма з такой назвай з 1 верасня ўзяла старт на канале «Культура». Як сцвярджаюць яе стваральнікі, аналагаў праекта ў беларускім радыёвяшчанні няма.

Падрыхтоўка да гэтага «канцэртнага сезона» распачалася яшчэ ў 2006 годзе, калі канал «Культура» пачаў насычаць эфір актуальнымі музычнымі запісамі, зробленымі як Беларускім радыё, так і замежнымі ўдзельнікамі Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Цяпер жа матэрыялу назбіралася дастаткова, каб 2 разы на тыдзень прапаноўваць слухачам трансляцыі адметных імпрэзаў з усёй Беларусі і 3 разы — канцэрты з лепшых музычных пляцовак свету.

Адметнасцю праекта стануць прамыя трансляцыі з музычных студый Дома радыё — слухачы змогуць не толькі пабываць на выступленнях выдатных музыкантаў, але адразу задаць ім пытанні, выказаць свае пажаданні гасцям. Выбраныя фрагменты гэтых сустрэч трапяць на прэзентацыйны кампакт-дыск. Першая такая трансляцыя запланаваная на 2 кастрычніка з удзелам джазавага трыо Таццяны Старчанкі.

...І яшчэ раз вучыцца

Аляксей Хлястоў стаў студэнтам, паступіўшы ў сталічны Інстытут сучасных ведаў імя М. Шырокава на спецыяльнасць «прадзюсаванне», прычым на дзённае аддзяленне. Але самае цікавае нават не гэта, а тое, што для Аляксея гэта будзе першая вышэйшая адукацыя!

— Так, гэта праўда, — пацвердзіў спявак, да якога мы дазваніліся неўзабаве пасля «першага званка» — сходу першакурснікаў. — Я пачаў працаваць з 13 гадоў, бо вельмі хацеў стаць сапраўдным артыстам; гэта забірала ўсе сілы, і часу на вучобу раней проста не было. Думаў паступіць яшчэ летась, але з-за ўдзелу ў тэлепраекце гэта не атрымалася, сёлета ўсё паспеў і вельмі задаволены. Аднакурснікі прынялі добра, я нават праспяваў дзве песні для знаёмства. А калі хто і пазіраў скоса — думаю, праз пэўны час усе зразумеюць, што я нармальны чалавек, які вельмі хоча вучыцца.

Уступны экзамен па творчасці, да слова, Хлястоў здаў на «дзясятку» — падрабязна распісаў канцэпцыю фестывалю класічнай музыкі. Але ўпэўнены, што яшчэ ёсць чаму павучыцца — у тэорыі прадзюсавання, на занятках па рэжысуры, PR-менеджменту і г.д., каб потым прымяняць гэтыя веды на практыцы, для прасоўвання маладых таленавітых артыстаў. «Давядзецца перакройваць графік, каб сумяшчаць вучобу і канцэрты, але я ўпэўнены, што мне вельмі спадабаецца вучыцца і што праз некалькі гадоў я пайду на другую вышэйшую адукацыю — хацелася б засвоіць яшчэ эканамічную спецыяльнасць», — разважае новы студэнт.

Абсалютна жывы «Калдун»

Праз некалькі гадоў чакання і блукання па прадзюсарах спявак Дзмітрый Калдун, нарэшце, выпусціў дэбютны сольны альбом, які і назваў немудрагеліста — «Калдун». Сёння ў маскоўскім клубе «Б2» адбудзецца прэзентацыя гэтай пласцінкі. Як падкрэслівае прэс-служба артыста, гэта першая вялікая самастойная работа Дзмітрыя, да таго ж запісаная яго калектывам цалкам у жывым гучанні, без выкарыстання сінтэтычных гукаў.

«Дыск атрымаўся разнапланавы, але ў той жа час усе песні на ім пра адно — пра каханне. Каханне ўзаемнае і нераздзеленае, сумнае і радаснае, каханне да канкрэтных людзей і любоў да жыцця ўвогуле, — прэзентуе сваю работу Дзмітрый Калдун. — Мне здаецца, праслухаўшы гэты альбом, кожны абавязкова знойдзе нешта сваё». У прыватнасці, у альбом трапілі ўсе вядомыя радыёхіты выканаўцы — ад знакамітай пасля Еўрабачання-2007» песні «Дай мне сілу» да «Настройся на мяне», знаёмай слухачам з сярэдзіны гэтага лета.

Падтрымаць Дзіму на прэзентацыі збіраюцца сябры і калегі па сцэне, сярод якіх кампазітар Аляксей Рыбнікаў, у абноўленай рок-оперы якога «Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты» малады артыст выканаў галоўную ролю. Чакаецца ў госці Філіп Кіркораў, якому Дзіма ў немалой ступені абавязаны поспехам на «Еўрабачанні»; Фёдар Бандарчук, Ціна Кандэлакі, Агнія Дзіткаўскітэ, а таксама выпускнікі «Фабрыкі зорак» розных гадоў — Святлана Свецікава, Дакота, гурты «Корні» і «Чэлсі» і многія іншыя.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Віталь ГРЫНКЕВІЧ

КАЛІ ЗОРКІ ПОБАЧ

Захар апусціў два старыя, пачарнелыя пярсцёнкі ў шклянку са свянцонай вадою. Узбоўтаў рукою і стаў назіраць. Пярсцёнкі ляглі побач, нібыта прыклеіліся адзін да аднаго. Потым ад іх пачалі аддзяляцца чорныя камячкі і ўсплываць на паверхню. Неўзабаве яны цалкам ачысціліся, і праз шкло стаў бачны жоўты метал. Старыя пярсцёнкі былі з золата.

...Захар ехаў на рыбалку. Ужо якое лета запар не выпадала яму магчымасці пасядзець на беразе возера альбо рачулкі. У вёсцы, дзе жылі бацькі, увесь час знаходзілася праца. Не паспееш адну справу завяршыць, як трэба брацца за іншую. Неяк ён паспрабаваў упарадкаваць, што пасля чаго рабіць, але хутка зразумеў, што спланаваць сялянскую працу — немагчыма. Бацькі ўносілі змены ў яго планы пастаянна. І ён іх разумеў. Бацька з маці ўвесь час усё робяць самі. Але калі з'яўляўся Захар — і адтэрмінаваныя да прыезду сына, і надзённыя справы клаліся на яго плечы. З гэтым Захар даўно пагадзіўся.

Любая праца мае свой пачатак і сваё заканчэнне. Таму, калі большая частка ўсяго ўжо зроблена, наведвае Захара думка пра рыбалку. Асцярожна пытаўся тады ён у бацькоў, ці няма яшчэ неадкладных і цяжкіх спраў, а калі адказвалі, што нібыта няма, хапаўся за рыдлёўку і — у агарод. Там капаў чарвякоў. Потым на кухні замешваў цеста. Так было і на гэты раз. Папярэдзіў маму, што заўтра ў іх будзе юшка, сеў у машыну і выехаў за вароты.

Пра адно з азёраў Захару даўно расказваў выпадковы спадарожны, рыбак. Што яно вельмі прыгожае і, з-за таго што ў адаленасці ад дарог, не надта абязрыбленае. Злавіць можна і плотку, і карася, і яршa, і шчупака, калі пашанцуе.

Туды Захар і адправіўся. Дарога не стамляла. Заставалася толькі праехаць райцэнтр, і праз паўгадзіны ён быў бы на месцы. Але вось гэтыя местачковыя звілістыя вузкія вуліцы, скрыжаванні без святлафораў... Хаця пешаходныя пераходы размечаныя, мясцовыя жыхары па звычцы пераходзяць вуліцу, а то і перабягаюць перад машынай, дзе каму ўздумаецца.

...Інвалідная каляска выкацілася на праезную частку дарогі так нечакана, што Захар ледзь паспеў націснуць на тормаз і рэзка вывернуць руль управа. Але, відаць, гэтага было недастаткова. Глухі ўдар аб левыя дзверцы — і чалавек выкуліўся з каляскі. З яго галавы зляцела шапачка, доўгія чорныя валасы раскінуліся па асфальце. Гэта была жанчына.

— Божа мой... — толькі і змог прамовіць Захар.

Яго цела стала ватным, рукі затрымцелі. У тое ж імгненне ён выскачыў з машыны, кінуўся да жанчыны, перавярнуў яе на спіну, агледзеў.

«Пераломаў адкрытых, здаецца, няма, крыві таксама не відаць, — ліхаманкава канстатаваў Захар. — Трэба штосьці рабіць».

Ён узяў яе на рукі, данёс да машыны і пасадзіў на сядзенне ў салоне. Потым забраў каляску. Агледзеўся. Наўкол нікога не было відаць. Захар хутка сеў у машыну і, паціху вывернуўшы джып, паехаў па вуліцы.

Думка была адна: як найбліжэй праехаць да бальніцы, каб адвезці да доктара пацярпелую. Раптам яна застагнала. Значыць, апрытомнела.

— Пацярпі, хутка будзем у бальніцы...

— Хіба я жывая? — прамовіла жанчына.

— Жывая, жывая, — супакоіў яе Захар. — Зараз паварочваю на цэнтр, а там неўзабаве і раённая бальніца.

— Не трэба нікуды ехаць.

— Слухай, — у ціхім шаленстве сказаў Захар, — мала таго што ты, як чорт з бутэлькі, выскачыла на сваёй калясцы, дык яшчэ і выбрыкваеш. Цябе доктару неабходна паказаць.

— Як чорт з бутэлькі... выскачыла, — аблізнуўшы сасмяглыя вусны, паўтарыла яна. — Трэба запомніць.

— Я табе паўтару гэта яшчэ не раз, — паабяцаў ён. — Хвілін праз дзесяць будзеш у прыёмным пакоі.

— Не трэба мяне ў бальніцу. Я сама доктар і ведаю, што са мною ўсё добра. Калена вось толькі баліць, ударыла моцна.

— Табе што, жыць надакучыла, што пад машыну кінулася?

— Надакучыла, абрыдзела... А табе не надакучыла б? — запыталася цяпер яна. — Табе хацелася б жыць калекам?

— Не пад машыну ж кідацца!

— У мяне ўжо ніякіх сіл не засталося.

— Божа літасцівы! І чаму гэта менавіта са мною здарылася?! — Ён стукнуў кулакамі па рулі. — Распранайся!

— Што?

— Распранайся, я сказаў. Сам цябе агледжу.

Захар спыніў джып і выйшаў. Адчыніў дзверцы з яе боку.

— Я чакаю.

— Сам распранай. Пагляджу, які ты спрактыкаваны ў гэтым.

Шчыра кажучы, ён не ведаў, што рабіць. Яго проста ліхаманіла пасля здарэння, дык яшчэ і нейкія выпады гэтай жанчыны. Ён адчыніў бардачок, дастаў трубку — «піпку», як жартуе яго мама, — набіў тытунём і, прысеўшы на траву на ўзбочыне дарогі, закурыў. Трэба было ўсё абдумаць. Захар упершыню ўважліва паглядзеў на спадарожніцу.

З выгляду ёй было гадоў трыццаць пяць. Правільныя рысы твару, цёмныя вочы, грэчаскі нос і прыгожыя вусны, чорныя валасы. На шыі — залаты ланцужок з крыжыкам. Пад джынсавай курткай — цёмна-чырвоная сарочка. Крыху падношаныя блакітныя джынсы і белыя, з сінімі палоскамі, адзідасаўскія красоўкі. Невысокага росту, танклявая. Пальцы таксама тонкія, без манікюру і пярсцёнкаў.

— Мяне завуць Інай, — раптам сказала яна.

— Захар, — пыхкнуў трубкаю ён.

— Старадаўняе імя.

— Можа, і так...

— Паслухай, а калі скласці нашы імёны — Захар і Іна, то атрымаецца разам Захар'Іна, здорава, праўда?

— Калі так добра разважаеш, то, відаць, ёсць Бог на свеце, які ўратаваў мяне ад турмы, а цябе ад могілак. І ўсё ж такі дазволь, я цябе агледжу.

— Добра, дазваляю. А трубку можна тваю патрымаць?

— Вось, вазьмі.

Яна працягнула сваю далонь, і Захар аддаў трубку.

— Грэе яна, як нешта жывое.

Ён пачаў асцярожна абмацваць яе плечы, рукі, спіну ўздоўж пазваночніка, парэбрыны. Хацелася пераканацца, што ў Іны няма траўмы і не трэба везці яе ў бальніцу.

— Ай!

— Што, тут баліць?

— Не, проста я адчуваю твае рукі на сваёй таліі, і мне слокатна.

Захар пазірнуў з дакорам і перамясціў рукі ёй на сцёгны, паціху дайшоў да каленяў. Закасаў джынсы, агледзеў.

— Ногі можаш не мацаць, усё адно я іх не адчуваю.

— Чаму?

— Доўгая гісторыя... Я сама доктар і ведаю, што са мною ўсё ў парадку. Я жывучая, на жаль...— з сумам сказала Іна. — А ты куды ехаў?

— На рыбалку.

— Слухай, Захар, вазьмі мяне з сабою. Калі ласка, — папрасіла, умольваючы, яна. Я даўно не лавіла рыбку і не сядзела каля вады з вудай. Тут паблізу добрае возера ёсць, я ведаю, як да яго пад'ехаць. І чарвяка ўмею на кручок насаджваць.

Іна сагнула палец кручком і стала паказваць, як яна гэта робіць. Потым паплявала на ўяўнага чарвяка і запытальна кіўнула: ну, як?

Захар засмяяўся. У яго адлягло на сэрцы. Гэтая маленькая пантаміма канчаткова заспакоіла: з жанчынаю ўсё добра. Ён дастаў аптэчку, пачаў змазваць перакісам вадароду збітае да крыві калена. Іна зморшчылася. Ён падзьмуў на калена і заклеіў ранку пластырам.

— Добра, паказвай дарогу да возера.

Ехаў Захар на невялікай хуткасці і пільна глядзеў на дарогу. Іна з натхненнем гаварыла пра тое, што зловіць вялікую рыбіну, і яшчэ пра нешта... Калі ім пашанцуе і рыба будзе добра брацца, то абавязкова звараць юшку. Лепш за ўсё трайную. Толькі маленькіх рыбак не трэба браць. Калі трапяцца на кручок, дык адпусцім іх назад у возера. Няхай падрастаюць.

Захар быў засяроджаны на дарозе, ад маналога Іны, які яна прамаўляла з такім захапленнем, яму хацелася ўсміхацца. Хаця яшчэ не пакідала сумненне, ці правільна зрабіў, што не адвёз яе ў бальніцу.

— Паслухай, а што скажуць бацькі, калі ўбачаць, што цябе няма дома? — спытаў Захар.

— Яны да родзічаў паехалі і будуць толькі паслязаўтра, — адказала Іна. — Я іх сама адправіла. На выхадныя, так бы мовіць. Яны стамляюцца са мною няньчыцца. Што рабіць, бацькі — ёсць бацькі. Дарэчы, вось і возера. Мы прыехалі. Ты толькі паглядзі, якое харастваю!

Возера было вельмі прыгожае. Захар спыніў машыну, агледзеўся наўкола і зразумеў, што нікуды пад'язджаць і не трэба. Бераг добры, пакаты.

Ён адчыніў багажнік, дастаў раскладны ўслончык і паставіў на траву каля вады. Потым падышоў да машыны, асцярожна ўзяў на рукі Іну. Яна з захапленнем глянула яму ў вочы. Ад гэтай блізкасці ў Захара па целе прайшла цёплая хваля. Злёгку збянтэжаны і як бы нехаця пасадзіў яе на ўслончык. Выбраў таўсцейшага чарвяка, насадзіў на кручок, закінуў вуду ў ваду. Паплавок мякка плюхнуўся, некалькі разоў гайдануўся і замёр.

— Трымай, — сказаў ён Іне. — А я зараз другою вудаю займуся.

— Давай, раскручвай, усё адно я першая злаўлю.

Першая дык першая. Захар нічога на гэта не адказаў. Неўзабаве два паплаўкі стаялі на вадзе побач. Звычайна трэба пачакаць пэўны час, каб рыба падышла да насадкі. Але зараз рыба пачала брацца хутка. Як ні дзіўна, першай пашанцавала Іне. Даволі спрытна яна зрабіла падсечку, і вось ужо першы акунь біў хвастом на беразе. Не мінула і дзвюх хвілін, як яе паплавок зноў пачаў даваць нырца — і чарговы, наравісты, акунь гойстрым плаўніком так і стараўся ўкалоць руку, калі яго здымалі з кручка.

Возера сапраўды было рыбнае. Пачало шанцаваць і Захару.

— А спінінг у цябе ёсць?

Нечаканае пытанне Іны здзівіла. Спінінг быў, але лавіць на блешню — гэта ўсур'ёз паспрабаваць рыбацкага шчасця. Захар пакінуў сваю вуду пад наглядам Іны, прынёс спінінг і з усмешкай аддаў:

— Толькі, калі ласка, не злаві сама сябе. Акуратна закідвай. Здолееш?

На ўсялякі выпадак паназіраў, як яна карыстаецца спінінгам. Першыя спробы былі малапаспяховымі, але затое супакоілі Захара: навыкі ў Іны ёсць.

Каб не перашкаджалі адно аднаму, на некалькі метраў адышоўся ўбок. Моўчкі назіраў то за сваім паплаўком, то за Інай. На слых лічыў яе закідванні спінінга: лёгкі посвіст рассякаемага вудзільнам паветра, ціхі ўсплёск вады ад блешні, мернае патрэскванне катушкі пры намотванні лёскі. Трэці, пяты, сёмы кідок... І раптам:

— Захар, За-хар!..

Ён падбег да Іны, забраў з яе рук спінінг і па тым, як струной напялася лёска, зразумеў: рыбіна вялікая. Толькі б утрымаць, каб не сарвалася, выцягнуць на бераг!

Рыбіна выбралася ў вадзе такія выкрунтасы, што Захар ад напругі, хвалявання, барацьбы сам узмок, як рыбіна. Так і было — амаль мятровы шчупак.

— Вось гэта ўдача, — выдыхнуў Захар. — Пашанцавала, дык пашанцавала. І як гэта ў цябе атрымалася?

— Я ж табе казала: я — удачлівая!

— Сапраўды, удачлівая, — пагадзіўся Захар. — Цяпер у нас з табою будзе і царская юшка, і шчупак на вуголлі. Здорава! Ну што, пачынаем гатаваць?

— Давай.

Спачатку пачысцілі дробную рыбу. Управіліся хутка. Захар узяў шчупака і распароў яму пузо. Усярэдзіне, разам з рыбіным нутром, знаходзіўся невялікі ком. Хацеў выкінуць яго ў возера, але чамусьці стаў размінаць у пальцах.

— Што там такое? — пацікавілася Іна.

— Камячок нейкі, падобна, каменьчык.

— Дай паглядзець.

— Трымай.

Захар аддаў ёй камячок.

— Не падобна, што гэта каменьчык, — сказала Іна. — Хутчэй, гліна. Ды і блішчыць тут нешта збоку. — Прыгледзелася, паспрабавала падрапаць пазногцем. Уздыхнула: — Не атрымліваецца...

— У мяне ў машыне ёсць малаток, зараз прынясу.

Захар паклаў камячок на плоскі камень, прытрымаў яго пальцамі і асцярожна ўдарыў. Адкалоўся невялікі кавалачак. Яшчэ ўдар — і ў руцэ ў Захара апынуліся кружочкі з металу, як бы ўціснутыя адзін у другі. Ён працягнуў іх Іне.

Яна ўважліва разглядвала знаходку і раптам сказала:

— Захар, гэта пярсцёнкі.

— Што?

— Пярсцёнкі гэта. Бачыш, адзін пасярэдзіне другога. Тое, што яны не з жалеза, — факт. Былі б паржавелыя. А яны чорныя і нібыта лакам пакрытыя. Што б гэта азначала?

— Можа, спачатку зварым юшку і паядзім. А з гэтым крыху пазней разбяромся.

...Вогнішча весела патрэсквала, часам выстрэльвала іскрамі. У пачарнелым ад дыму кацялку булькала юшка. Даўно прыкмечана, што прыгатаванае на ўлонні прыроды варыва надзвычай смачнае. Ежа, звараная ў кацялку, засмажаная на шампурах, запечаная ў гліне або лапушыне, не павярэдзіць страўнік, не пашкодзіць здароўю. І гэта без асаблівых кулінарных вынаходніцтваў і прыпраў: усё надзвычай проста і неверагодна смачна.

Ад вогнішча Захар стараўся далёка не адыходзіць. Ён часам азіраўся, каб бачыць Іну. Ужо ў які раз Захар лавіў сябе на думцы, што яму з ёй на дзіва проста і лёгка. А чаму гэтак — адразу і не патлумачыш.

— Ну, як юшка, рыбачка? — запытаўся Захар і кінуў абарэмак сухога голля каля вогнішча.

— Трэцяя порцыя рыбы ўжо наварваецца. Так што неўзабаве ў нас будзе трайная юшка. А ты згатаваць шчупака паспееш?

— Я яго на вуголлі запяку. Гэта хутка. Спадзяюся, шчупак не будзе цвёрды.

— Не будзе, — пацвердзіла Іна. — Калі рыбу есці гар-р-ачаю, тады яна і мяккая, і смачная.

Захар выбраў дубец, насадзіў на яго рыбіну, пасаліў і адклаў убок. Потым зняў кацялок, паставіў на жалезную трыногу. Адкаркаваў бутэльку гарэлкі і ўліў у кацялок грамаў з дзвесце.

— Гэта для большай смакаты, — патлумачыў Захар. — Рыбакі заўсёды так робяць.

— Ведаю, — адказала Іна. — Бацька таксама гэтак гатуе юшку.

— Ну, калі ты ўсё ведаеш, дык запрашаю, спадарыня, на няхітрую царскую вячэру.

Ён падаў ёй лыжку, кавалак хлеба. Асцярожна, каб не апячыся, яны старанна дзьмулі на варыва і паціху смакавалі страву. Захар яшчэ некалькі разоў падкінуў сухога голля ў агонь, а калі яно перагарэла, па-над вуголлем паклаў на рагаціну рыбіну. Захар і Іна раз-пораз абменьваліся кампліментамі, якія яны добрыя кухары.

Нарэшце, дачакаліся шчупака. Рыбіна сапраўды «дайшла» на вуголлі, пакрылася коркаю і, нягледзячы на з'едзеную юшку, распальвала апетыт.

— Вось гэта я разумею, вось гэта здорава, вось гэта — смаката! — прыгаворвала Іна, няспешна з'ядаючы кавалачак за кавалачкам. — Не кожнаму цару выпадае такое задавальненне. Як думаеш, нам усміхнулася ўдача сёння?

— Самай шчырай усмешкай. Нам не толькі пашанцавала — нават пашчасціла! Ці сустрэў бы я калі такую ўдалую рыбачку? Па праўдзе, дык я і каля вогнішча даўно не сядзеў. Не глядзеў на агонь, не марыў.

— А як мараць каля вогнішча?

— Кожны па-рознаму. Звычайна людзі глядзяць на агонь, праводзяць позіркам іскры, што падымаюцца ўгару, і, нарэшце, любуюцца зоркамі. І што ў гэты момант у чалавека на душы, пра што ён найчасцей за ўсё думае, пра тое і марыць. І просіць Усявышняга дапамагчы яму.

— І што, Бог дапамае нам?

— Пэўна ж, толькі трэба моцна верыць.

— Ах, не ведаю я, не ведаю. Колькі ў малітвах звярталася да Яго, каб дапамог стаць на ногі, колькі слёз выплакала — старонкі Біблііі сталі салёнымі. Я так шчыра малілася, «Ойча наш», іншыя малітвы чытала... Часам мне здавалася, што ўсё гэта не мае сэнсу. Адным сябе суцяшала: да д'ябла не звярталася. Вось так, па сённяшні дзень, жыву калекаю.

— А з-за чаго ў цябе такая траўма?

— Калі мы сюды пераехалі жыць, я ўжо скончыла медінстытут і пачала працаваць доктарам. Бацька будаваў дом. Заставалася толькі дах накрыць. Мне захацелася з вышыні паглядзець на наш гарадок, убачыць, што там, за гарызонтам. Вось і паглядзела. Упала няўдала, спінаю на шыфер. Абломак успароў спіну, закрануў нерв. У бальніцы мяне праперыравалі, наклалі швы, астатняе... Не для палёту я нарадзілася. Цяпер толькі бацькам абуза.

— Скажаш таксама, абуза.

— А ці не так? Фізічны боль мінуў, а душэўны застаўся. І я пакутую, і яны разам са мною. Каму я такая, калека, патрэбная, для чаго мне выццё Бог пакінуў? Таму і выскачыла ў калясцы табе пад колы. Даруй ужо, калі ласка.

— Дараваў даўно. Добра, што ехаў павольна, затармазіць паспеў. А іначай цяпер бы і я да Бога з малітвамі звярталася...

Захар і Іна змоўклі. Глядзелі на агонь. Потым на зоркі. У іхніх душах узнікалі, раіліся сотні думак. І ў іх было ўсё: жаль, спачуванне, страх, горыч крыўды, водбліскі былых расчараванняў, надзея на паразуменне, натхнёнасць, жаданне спадабацца адно аднаму, імкненне хоць нечым, хоць ненадоўга сашчапіць іхнія жыццёвыя паралелі, якія раптам сышліся, перасякліся, скрыжаваліся. Яны былі ў гэты вечар, нібыта хлеб і вада, пяро і чарнілa, лук і цеціва, удых і выдых — словам, ДЗВЕ ПАЛАВІНКІ аднаго цэлага. Яны глядзелі на зоркі і разумелі гэта. Разумелі, што ў бясконцай далечы і вечнасці Млечнага Шляху ім пашчасціла сустрэцца. Няхай і такім незвычайным чынам. Лёс і з дна возера дастане і падорыць чалавеку тое, што яму належыць, чым ён павінен валодаць па справядлівасці.

...Іна не сумняваецца, што думка зрабіць перакрыжаваную, пад рознымі вугламі, рэнтгенаскапію яе хворай спіны належала менавіта Захару. Пры скрупулёзным вывучэнні здымкаў высветлілася, што паміж пазванкамі «сядзела» не выдаленая падчас першай аперацыі драбнюткая пласцінка шыферу. Гэта яна разладзіла работу апорна-рухальнага апарату Іны, прыкавала яе да інваліднага крэсла.

Пасля чарговай аперацыі Іна паступова пачала ажываць. Цяпер з ёю ўсё добра... Не, цяпер з імі ўсё добра. Яны любяць па вінтавой лесвіцы, якую змайстраваў Захар, падымацца на дах, каб паглядзець — а што там, за гарызонтам. І ў ясныя зорныя ночы, і ў захмараныя, і ўдзень, калі на небе зіхаціць сонца, яны ведаюць: зоркі — побач.

Супрацоўніцтва

БелАЗы і МАЗы будуць збіраць у В'етнаме

Пра стварэнне ў В'етнаме зборачных прадпрыемстваў беларускіх аўтамабіляў МАЗ і БелАЗ паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол В'етнама ў Беларусі Данг Хыу Чан.

Па словах пасла, на міжурадавым пасяджэнні па супрацоўніцтве, якое прайшло ў Ханоі сёлета ў красавіку, былі адзначаны некаторыя праекты. Гэта, у прыватнасці, стварэнне сумеснага прадпрыемства Мінскага аўтамабільнага завода і Генеральнай кампаніі па вытворчасці аўтамабіляў В'етнама.

— Гэты праект прадугледжвае сумесную вытворчасць не толькі запчастак, але і аўтамабіляў МАЗ у В'етнаме, — кажа Данг Хыу Чан.

В'етнамскія ўлады таксама зацвердзілі план вытворчасці БелАЗаў для горнай здабычы ў В'етнаме.

Гандлёва-эканамічныя ўзаемаадносіны паміж дзвюма краінамі пайшлі на спад у параўнанні з мінулым годам. Па словах пасла, гэта звязана перш за ўсё з сусветным эканамічным крызісам. Калі ў 2008 годзе таварагварот паміж В'етнамам і Беларуссю дасягнуў 124 млн долараў, то ў першай палове гэтага года ён знізіўся на 38 працэнтаў і склаў 33,4 млн долараў.

Беларусь пастаўляе В'етнаму калійныя ўгнаенні, трактары, самазвалы, запчасткі для аўтамабіляў. В'етнам, у сваю чаргу, экспартуе ў нашу краіну рыс, морапрадукты, каўчук, кансервы, адзенне і г.д.

Пасол адзначыў, што ўзровень гандлёвых узаемаадносінаў не адпавядае эканамічнаму патэнцыялу абедзвюх краін. Менавіта для ўмацавання супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы сёлета ў кастрычніку Беларусь наведае з афіцыйным візітам першы намеснік прэм'ер-міністра В'етнама Хуанг Чунг Хай. На сустрэчы будзе абмеркавана рэалізацыя плана супрацоўніцтва краін у галіне эканомікі да 2010 года.

Настасся ЗАНЬКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	г. Брест, ул. Я. Купалы, 6/1
Продавец недвижимого имущества	Концерн «Беллегпром» (в лице ОАО «Брестский чулочный комбинат», тел.: 80172 00 31 41, 80162 46 62 62
Сведения о предмете аукциона	Здание 1968 г.п., площадь – 80,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,0438 га, для размещения объекта производственно-складского назначения, срок аренды – 5 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	32 811 517
Сумма задатка, руб.	3 280 000
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 20 87 85, 23 12 63, www.brest-region.by**

Аукцион состоится **6 октября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 05.10.2009 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 5 октября 2009 года включительно.

НА АЛЕНЯ І ЛАСЯ

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванння, у краіне распачаўся восеньскі сезон палявання на лася і высакароднага аленя. Доўжыцца ён будзе з 1 па 30 верасня, паляваць дазваляецца на працягу сутак.

Здабываць можна дарослых самцоў трафейнай якасці і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Спосаб палявання — стрэльбавы з засады, з падыходу, з падманьваннем (з вабікам).

Па 30 верасня, нагадаем, працягваецца і летне-асенні сезон палявання на дзіка (дарослых самцоў старэйшых за 2 гады і маладняк да 2 гадоў любога полу) і еўрапейскую казулю (дарослых самцоў трафейнай якасці і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту) стрэльбавым спосабам з засады, з падыходу, а таксама з выкарыстаннем вабіка — для здабычы казулі. Паляваць можна з 18 да 9 гадзін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

проводит 14-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 15 сентября 2009 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи партии (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
39.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, 4 кат. — 36 шт.	Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи	1977	70 %	9 000 000	900 000
40.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат. — 17 шт.	Гомельская обл. войсковая часть 01264 н.п. Бобровичи	1989	65 %	5 270 000	527 000

Аукцион состоится в **11.00 15 сентября 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17.00 11 сентября 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 15 сентября 2009 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: р/с 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

По ранее проведенным торгам извещения опубликованы в газете «Звязда» 31 июля 2009 года.

Арт-тэрапія

Што напісана пяром...

альбо Пра «сямейную кнігу», ініцыял і не толькі

Даўно даказана, што прыгажосць ва ўсіх сваіх праявах станоўча ўплывае на псіхіку і эмацыйны стан чалавека. Падобнае правіла ўніверсальнае і распаўсюджваецца не толькі на краявіды прыроды, прадметы мастацтва, але, напрыклад, і на каліграфію (мастацтва прыгожага пісьма), якая таксама валодае пэўным аздараўленчым эфектам.

У псіхіятрыі існуе спецыяльны тэрмін «каліграфатэрапія» ці «каліграфічная арт-тэрапія» (від арт-тэрапіі, заснаваны на выкарыстанні каліграфічных жанраў і прыёмаў у псіхатэрапеўтычных мэтах: арт-тэрапеўтычны падыход да пісьма ўключае не столькі працу са зместам, колькі з яго формай).

Прыгожае пісьмо ва ўсе часы было крыніцай станоўчых эстэтычных эмоцый. Пісары і каліграфы заўсёды займалі асаблівае месца ў сацыяльнай іерархіі. Сёння рукапісны спосаб перадачы і захавання інфармацыі амаль цалкам замешчаны электронным, і на першы план выходзіць эстэтычны аспект, калі рукапісны тэкст разглядаецца як арт-аб'ект, дзе галоўнае значэнне мае менавіта форма. У гэтым сэнсе пісьмо можа скласці канкурэнцыю іншым выяўленчым сродкам мастацтва.



Каліграма

Каліграфатэрапія не з'яўляецца адкрыццём новага часу. Ва ўсходніх культурах (кітайскай, японскай, арабскай) каліграфія ніколі не здавала сваіх пазіцый і да нашых часоў застаецца дзейсным метадам псіхатэрапеўтычнай самарэгуляцыі. Спецыялісты сцвярджаюць, што заходнееўрапейскія і рускія каліграфічныя традыцыі таксама могуць быць паспяхова задзейнічаны ва ўсіх формах псіхатэрапіі (індывідуальнай, сямейнай, групавой).

Прыкладаў выкарыстання каліграфічных жанраў у выглядзе арт-тэрапеўтычных тэхнік існуе шмат. Напрыклад, **ініцыял** (ад лацінскага initialis — «пачатковы»). У заходняй каліграфіі гэта адмысловым чынам аформленая першая літара слова, сказа, главы ці часткі кнігі. У славянскай каліграфіі для яго ёсць іншая назва — **літара**. Існуюць самыя розныя традыцыі і стылі напісання вялікіх літар. Толькі ў славянскай традыцыі іх можна налічыць не менш за дзясятак (варта ўзгадаць першыя друкаваныя кнігі Францыска Скарыны). Не заставалася славянам і Заходняя Еўропа, дзе за стагоддзі склаліся свае традыцыі афармлення ініцыялаў. На аснове вялікіх літар можна стварыць і свой уласны (асабіста значны) ініцыяльны алфавіт. Прызначаны ён, безумоўна, не для напісання вялікіх аб'ёмаў тэксту, а для афармлення асобных слоў, напрыклад, імені ці невялікіх выразаў (свайго дэвіза ці жыццёвага прынцыпу). Паводле сцвярджанняў псіхолагаў, такія словы ці фразы, афармленыя з дапамогай каліграфічных жанраў, з'яўляюцца матэрыяльна-эстэтычным выражэннем перажыванняў і каштоўнасцяў аўтара. Больш за тое, яны пачынаюць уплываць на аўтара, становяцца своеасаблівымі матэрыялізаванымі псіхалагічнымі ўстаноўкамі.



Ініцыял

Яшчэ адзін прыклад выкарыстання каліграфіі — **манаграма**. У рукапіснай традыцыі — гэта знак, складзены са спалучаных ці пераплеценых літар, напрыклад, пачатковых літар імені і прозвішча (так званы вензель).

У псіхатэрапіі гэта можа быць манаграма, пабудаваная не толькі з некалькіх літар уласнага імені, імені па бацьку і прозвішча, але таксама манаграма сям'і (першыя літары імёнаў усіх членаў сям'і збіраюцца ў адзіны знак, які ўяўляе сабой збалансаванае эстэтычнае цэлае і сімвалізуе гармонію і з'яднанасць). Такая манаграма можа стаць часткай сямейнага герба (таксама добра вядомая арт-тэрапеўтычная тэхніка).



Манаграма

Вельмі багаты па сваіх тэрапеўтычных магчымасцях каліграфічны жанр — **каліграма**. З'яўленнем гэтага тэрміна мы абавязаны вядомаму паэту Гіёму Апалінэру, некаторыя свае вергафічныя вобразаў, валі змест тэксту. Наяго вершаў размяме фантана, птушкі, французскаму, які запісваў шы ў выглядзе якія ілюстрапрыклад, радкі шчаліся ў форкропляў дажджу і г.д. У форму каліграмы могуць увасабляцца асобныя словы, выказванні ці больш разгорнутыя тэксты.

У псіхатэрапіі каліграма можа заняць асобнае месца, паколькі можа быць выкарыстана ў самых разнастайных формах. Уявіце сабе старонку асабістага дзённіка, на якім тэкст размешчаны нейкім адмысловым чынам, з каліграмамі свайго імені, асабліва значных фраз, любімага верша, выразу і г.д. Пабудова каліграмы — гэта захапляльны арт-тэрапеўтычны працэс, у якім фрагменты тэксту, словы і літары разглядаюцца як «цаглінкі» для графічнага вобраза. Не ўсё атрымліваецца адразу. Як правіла, даводзіцца шмат «папацець», перш чым «цаглінкі» «складуцца» найлепшым чынам і ўтвораць ідэальную кампазіцыю.

Цікавым прыкладам выкарыстання розных каліграфічных жанраў у псіхатэрапіі можа стаць так званая «сямейная кніга» (абавязкова рукапісная!). Гэта нешта падобнае на сямейны архіў ці хроніку, дзе захоўваецца ўся значная для сям'і інфармацыя (сямейныя паданні, выпадкі з жыцця і г.д.) у выглядзе рукапісных тэкстаў і малюнкаў членаў сям'і. Псіхолагі сцвярджаюць, што такая кніга з'яўляецца больш «жывой» альтэрнатывай звыклым фотаальбомам і дазваляе кожнаму пакінуць свой след у сямейнай гісторыі.

Бясспрэчны станоўчы эфект каліграфатэрапіі — у пашырэнні кругагляду асобы. Знаёмства з айчыннымі і замежнымі каліграфічнымі традыцыямі спрыяе далучэнню да здабыткаў сус

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (2 верасня). Па гарызанталі: Велатрэк. Тайга. Цана. Лотас. Лёд. Рынг. Арала. Гель. Карагод. Клуні. Лета. Спас. Карыта. Марка. Кар. Корт. Талака. Смуга. Сал. Бра. Граб. Бай. Пума. Міра. Рака. Судак. Трамплін. **Па вертыкалі:** Капралактам. Ост. Тарос. Акула. «Парог». Сігма. Краб. Сват. Лад. Папірус. Акцёр. Урад. Рой. Адат. Самакат. Гон. Акр. Аракс. Тля. Хата. Інгул. Луг. Генетыка. Літ. Такса. Язь. Атара. Басейн.

PRASTORA.BY
БЕЛАРУСКАЯ ІНТЭРНЭТ-КРАМА
Ліцэнзія на рознічны гандаль № 50000/0346994 да 23.04.2014 г. УНП 190909586.

Да ведама

КАЛІ ВЫ ЎЯЗДЖАЕЦЕ Ў МІНСК...

З 5 верасня па маршрутах Слуцкага і Капыльскага кірункаў руху аўтобусаў, што прыбываюць у Мінск па Слуцкай шашы (аўтадарога М7), вызначаецца наступны шлях следавання ў сталіцы: аўтадарога М7, вуліцы лейтэнанта Кіжаватава, Брылеўская (за мостам направа), Вакзальная (высадка — станцыя метро «Інстытут культуры»), Талстога (высадка — прыпыначны пункт «вул.Талстога»), Магілёўская, Аранская, Трасцянецкая, аўтавакзал «Усходні».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Занатоўкі мастака

МАДЭЛЬ І ЦЭЛЬ

Не бывае непрыгожых жанчын, але бываюць жанчыны з брутальнай гісторыяй. Кароткая шыя ці апендыцытны шрам на жываце мяне ніколі не раздражнялі ў натуршчыцах, як і крываногасць з валасатасцю не бянтэжылі. Формы жаночых целаў мяне натхнялі і натхняюць заўжды, а іх разнастайнасць падштурхоўвае да стварэння характараў у малюнках і на палотнах. Але жудасная гісторыя жанчыны можа мяне адвярнуць ад самага прывабнага цела. Пазнаёміўся я з натуршчыцай Іраю з вайсковага пасёлка Цэль. Яна падпрацоўвала фотамадэллю ў маёй дачкі. Да Іры, як да фотамадэлі, ніякіх прэтэнзій у мяне няма. Яна выдатна працавала і выдатна атрымлівалася на здымках. Я збіраўся прапанаваць ёй папазіраваць для жывапіснага эцюда. Іра сядзела ў мяне дома на кухні, піла чырвонае віно, і я збіраўся сказаць ёй пра свой намер. Збіраўся і не сказаў, бо даведаўся, што яе дзядзька адрэзаў нажом галаву яе бацьку. Браты выпівалі, панапіваліся, пасварыліся і адзін другому адрэзаў галаву. Іра ў адзін вечар засталася і без бацькі, і без дзядзькі ў лясным пасёлку Цэль. Пры першай магчымасці яна ўцякла са зненавіднага месца ў Мінск, дзе ўладкавалася ў мадэльнае агенцтва да Тамары. Менавіта Тамара і прывяла Іру да мяне дамоў. Іра піла чырвонае віно, а мне здалося, што яна п'е кроў. Я так і не прапанаваў ёй пазіраваць... Іра не затрымалася ў мадэльным агенцтве. Іра з'ехала ў Італію, у горад Перуджа і там жыве. Спадзяюся, яна там за бутэлькаю чырвонага віна не распавядае тамтэйшым мастакам пра адрэзаную галаву свайго бацькі, і ў яе ўсё складаецца выдатна.

ТАНЕЦ НА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ

Вяртаюся з кніжнага кірмашу. Там распродаж, тое, што каштавала дваццаць, цяпер прадаюць па сем. Замест адной заўсёднай нядзельнай кнігі ўзяў тры. Я-кнігавыдавец засмуціўся, але ж я-чытач узрадаваўся. Добры настрой перамог маркоту. Я-шпацырнік перайшоў мост праз Свіслач і павярнуў да рэстарацыі «Журавінка». Па вуліцы Інтэрнацыянальнай насустрач ішла загарэлая дзяўчына ў блакітнай сукенцы. Яна заступіла мне-мужчыне дарогу і пачала танчыць. «Я прыгожая?» — спытала танцорка. «Ты прыгожая!» — кажу я-мінак, а я-мужчына думае: «На ўсіх мяне не хопіць!»

ТАЦЦЯНА І ЗВАНОК

Звоніць мне Таццяна Заміроўская. Мой сотавік паказвае, што звоніць Заміроўская, і я яму веру. «Прывітанне, Таццяна!» — кажу. «Паглядзі, паглядзі якая птушачка!» — чую голас Заміроўскай. Аглядаюся навокал. Няма ніякай птушачкі. «Адчапіся!» — чую ў слухаўцы чужы мужчынскі голас і разумею, што мне пазваніў тэлефон, а не Таццяна. Яго выпадкова прыціснулі, і ён мне затэлефанаваў, і я ненаўмысна стаў сведкам інтымнай размовы пра птушачку. Раней казалі, што сорамна чытаць чужыя лісты, зараз можна сказаць, што сорамна падслухоўваць чужы інтым праз выпадкова ўключаны сотавы тэлефон. Я чалавек не сарамлівы, але, зразумеўшы, што птушачку я не пабачу, тэлефон свой ад сувязі з Заміроўскай адключыў.

ТАТА І АП'ЯНЕННЕ

П'ю і не п'янею! Са мною такога ніколі не было. Як выпіваў, дык заўсёды хмялеў. Дзеля ж таго і п'юцца віно ды гарэлка. Тата мой скардзіўся, што ў маладосці ён раптоўна страціў здатнасць хмялець. Ён выпіваў, не п'янеў і баяўся гэтага так моцна, што кінуў піць на цэлы год. Ён лічыў, што страта здатнасці п'янець ідзе ў яго ад нервовага расстройства. Пэўна, яно так і было. Пазней да таты вярнулася жаданне выпіваць, ён выпіваў і хмялеў, і радаваўся жыццю. А мяне ён папярэджваў, што калі вып'еш і не захмялееш, гэта кепска. Я яму верыў. А цяпер я навучыўся хмялець без віна і гарэлкі, я хмялею ад паўнаты жыцця. Я п'ю жыццё і п'янею. Жыць і не п'янець! Я так не ўмею...

Адам ГЛОБУС.

Барацьба з раслінай

СОК І АПЁК

Цеплыня плюс вільгаць, і вось ужо барацьба з такой раслінай, як баршчэўнік Сасноўскага ўзведзена ў ранг праблемы, якая патрабуе больш пільнай увагі, чым у папярэднія гады.

Наогул вядома некалькі дзясяткаў відаў роду баршчэўнік. У Беларусі перавагу ў распаўсюджанасці мае баршчэўнік Сасноўскага. Ён, дарэчы, шырока распаўсюджаны ва Усходняй Еўропе і толькі пачынае сваю экспансію на захад. Іншы від гіганцкага баршчэўніку — Мантэгацы распаўсюджаны ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе і паступова прасоўваецца на ўсход. Беларусь знаходзіцца на стыку экспансіі двух гэтых відаў, гаворыцца ў рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча «Гіганцкія баршчэўнікі — небяспечныя інвазіўныя віды для прыродных комплексаў і насельніцтва Беларусі».

Паводле звестак выдання, пачынаючы з 50-х гадоў мінулага стагоддзя баршчэўнік Сасноўскага выпрабоўваўся ў вытворчых умовах з мэтай увядзення ў культуру як кармавая сіласная расліна. Адным словам, завозілі калісьці апошнюю ў нашу краіну з Каўказа з добрымі намерамі. І спачатку эксперымент быў досыць удалым. Па-першае, таму, што расліна надзвычай добра расце, а, па-другое, вылучаецца высокай спажыўнасцю.

Сёння палёў, спецыяльна засеяных баршчэўнікам, безумоўна, няма, аднак расліне ўжо і не патрэбны асаблівыя ўмовы. Галоўнае для яе — дачакацца нараджэння «парасончыкаў», з якіх выйдуць на волю дробныя зярняткі — насенне, якое ў наступны раз дасць яшчэ большы ўраджай. Вецер, людзі, машыны разносяць гэтых «дзетак», і баршчэўнік заявіць аб сабе на новых тэрыторыях.

Найбольш магутнай экспансіі баршчэўніку Сасноўскага падвергліся Мінская і Віцебская вобласці, а дакладней, Мінскі, Браслаўскі, Лагойскі, Міёрскі, Дзяржынскі, Віцебскі, Гарадокскі, Ваўкавыскі, Талачынскі і Астравецкі раёны.

Спецыялісты **Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі** кажуць, што супрацьстаяць буйному росту баршчэўніку Сасноўскага можна ў асноўным трыма метадамі: з дапамогай ручнога або механічнага вынішчэння, выпасу жывёл і выкарыстання гербіцыдаў. Адным з першачарговых у нашай краіне з'яўляецца вынішчэнне расліны — неаднаразовае скошванне на працягу сезона або некалькіх сезонаў спустошвае запасы спажыўных рэчываў у сцябле і карані, а самае важнае — не дае расліне магчымасці сфарміраваць насенне. Апошняе ж дасягаецца выдаленнем толькі раслін, якія цвітуць.

«Калі пастаўлена мэта абмежаваць распаўсюджванне баршчэўнікаў і нават выкараніць іх у прыродных папуляцыях, — наяўнасць асобінаў, якія цвітуць, павінна разглядацца як надзвычайнае здарэнне ў дзейнасці работнікаў лясных, прыродаахоўных і камунальных службаў, мясцовых саветаў і сельскагаспадарчых вытворчых арганізацый, фермераў і садовых таварыствах. Неабходна дакладна ўяўляць, што калі адна расліна гіганцкага баршчэўніку здольная пакінуць пасля сябе да 100 000 нашчадкаў, то ўсе іншыя меры з'яўляюцца дапаўненнем да галоўнага — не даць магчымасці расліне ажыццявіць насенную экспансію» (з выдання «Гіганцкія баршчэўнікі...», 2009 г.).

Спецыялісты **УП «Мінскзелянбуд»** — тыя, хто «ідзе ў атаку» на расліну, апранаюцца ў спецадзенне, так што сярод апошніх ахвяраў жорсткага нораву баршчэўніку не назіралася. Чаго не скажаш пра некаторых радавых суайчыннікаў, большасць якіх ведае аб асаблівасцях расліны, аднак веды чамусьці не дапамаглі ім пазбегнуць непрыемнага кантакту. Непрыемным жа яго робіць пякучы сок, які ўтрымліваецца ва ўсіх частках расліны. Сляды апёкаў на целе чалавека баршчэўнік Сасноўскага праяўляе ў выпадку ўздзеяння ультрафіялетавых промняў, ці, прасцей кажучы, у сонечнае надвор'е, а таксама калі скура была мокрай.

— У выпадку такіх апёкаў мы маем справу з уздзеяннем таксічных рэчываў расліннага паходжання, — кажа **загадчыца дэрматавенералагічнага аддзялення № 6 Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансэра Алена РЫМКО**. — Апёк можа быць рознай ступені цяжкасці, у залежнасці ад таго, як доўга працягвалася неспрыяльнае ўздзеянне на скуру, ці трапілі промні сонечнага святла на скуру і як хутка чалавек атрымаў урачэбную дапамогу. Калі нехта з вашых блізкіх атрымаў падобны апёк, неабходна тэрмінова выдаліць з паверхні скуры рэшткі рэчыва з дапамогай вялікай колькасці халоднай вады. Пасля прамывання раны не прымяняйце ёд. У выніку адтэрміноўкі візіту да ўрача, у прыватнасці, да ўрача-дэрматолага, пацярпелы рызыкуе набыць гіперпігментацыю, цёмныя плямы на скуры. Каб прадухіліць гэта, урач прызначыць лячэнне — антыгістамінныя і дэсэнсібілізуючыя прэпараты для ўнутранага ўжывання і гарманальныя — для вонкавага...

З практыкі ўрача-дэрматолага вядомы і такі выпадак, калі жанчына хоць і засцерагалася ад расліны з дапамогай пальчатак, аднак сур'ёзныя апёкі далоняў усё ж такі атрымала. Так ці інакш, але інфармаваны, значыць, узброены. Баяцеся расліны — не падыходзьце да яе, не вынішчайце самастойна. Калі ж кантакт з пякучым сокам баршчэўніка аказаўся непазбежным, спяшайцеся па ўрачэбную дапамогу.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.22	19.55	13.33
Віцебск —	6.09	19.47	13.38
Магілёў —	6.12	19.45	13.33
Гомель —	6.11	19.39	13.28
Брэст —	6.37	20.10	13.33
Гродна —	6.40	20.08	13.28

Месяц

Поўня 4 верасня.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Васы, Абрама, Агапія, Аляксандра, Паўла.*

К. *Ізабелы, Рыгора, Яўхіма.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

3 верасня

1927 год — у вёсцы Канюхі на Капыльшчыне нарадзіўся Алесь Адамовіч, выдатны беларускі пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца. Член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар. Аўтар дылогіі «Партызаны», «Хатынскай аповесці», адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі...» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1976).

1783 год — Парыжскім мірам завяршылася Вайна за незалежнасць ЗША. Брытанія прызнала суверэнітэт Злучаных Штатаў.

Цытата дня:

«Мужчыны звяртаюць увагу на тое, што пра іх думаюць, а для жанчын важней — што пра іх гавораць».

Тэадор Гіпель (1741—1796), нямецкі пісьменнік.

ЛЯСУН

Лесавік, ляшак, лясны чалавек, лясны гаспадар, лясны дзед, ляснік, лесавы — у народнай культуры славян ён стаў гаспадаром лесу, звычайна надзеленым рысамі варожасці ў дачыненні да чалавека. Лясун мае вялікую сілу і ўладу не толькі над лесам, але і ў пэўнай ступені над жыццём чалавека ўвогуле.

● Аб паходжанні лесуноў у народзе было некалькі меркаванняў. Лічылася, што яны — людзі, на якіх быў насланы праклён (у першую чаргу — ад маці). З распаўсюджваннем хрысціянства ўзнікла павер'е, што лесуны (як і дамавікі, вадзянікі і іншая нячыстая сіла) — гэта паўшыя анёлы, якіх Бог скінуў з нябёсаў.

● Лічылася, што знешне лясун падобны на чалавека — дзеда з доўгай сівой бародай, у лапцях і доўгай кашулі: «Сядзіць дзед на пні, лапці калупае, на месяц паглядае...». У некаторых паданнях вобраз лесуна атаясамліваўся з самім лесам, яго цяжка было заўважыць, адрозніць ад дрэва ці высокага куста: на бровах у яго куст, валасы і барада — доўгая трава, а сам — быццам корч; і г.д.

● Лічылася, што ў вёскі лясун не наведваецца, каб не сварыцца з дамавіком і лазнікам.

● Лесуны не столькі шкодзяць людзям, колькі проста гарэзяць. Але іх гарэзлівасць іншым разам становіцца бядой для чалавека. Напрыклад, з дапамогай грыбоў і ягад лясун можа зацягнуць чалавека ў непразлясныя мясціны, дзе можна застацца назаўсёды.

● У народзе лічылі, што самы надзейны сродак ад выбрыкаў лесуна — малітвы, а таксама адзенне, апранутае на левы бок. Таксама раілі ўсім тым, хто згубіўся ў лесе, сесці на пень, корч і абуць боты з правай нагі на левую, рукавіцы — з правай рукі на левую і г.д.

● На год прыпадае адзін дзень — 17 кастрычніка, — калі нельга хадзіць у лес. Лічыцца, што з гэтага дня лесуны пачынаюць хавацца на доўгую зіму: яны злуюцца і руйнуюць усё навокал, рвуць з карэннем дрэвы, завальваюць лясныя сцежкі і г.д.

● У народзе лічылася, што лясун не кране таго, хто не будзе ў лесе крычаць, ламаць голле, таптаць грыбы і ягады. Калі вы ўваходзіце ў лес, абавязкова спытайцеся ў лесуна дазволу, а калі выходзіце з лесу, скажыце словы падзякі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Нешта галава забалела.

— Ага, я б таксама піва выпіў...

☺

А вы можаце апісаць Ганну Семяновіч, заклаўшы рукі за спіну?

☺

Два прыяцелі.

— Ты чаго такі хмурны?

— Ды вось, з жонкай пасварыўся...

— З-за чаго?

— Ніяк не можам з ёй дамовіцца, дзе правесці адпачынак.

— А ў чым праблема?

— Ды разумееш, я хачу ў Тайланд, а яна хоча паехаць са мной...

☺

У вады чатыры агрэгатныя станы: цвёрды, вадкі, газападобны і кавун.

☺

Мама з дзіцем 3-4 гадоў у краме. Наваколле — шмат розных тавараў, усё выглядае вельмі прывабна, ярка, асабліва для дзіцяці. Нечакана маці пытаецца:

— Дачушка, табе што-небудзь купіць?

Дзіця (замерла, але адказала імгненна):

— Так!

— Што?

— Ммм, эээ... Дзве!

Дыспут



Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 29 (318)

Паклапаціцеся пра лілеі

«Калі і як зразаць сцёблы лілеі, якая адцвіла»?

П. Лукашэвіч, *г. Барысаў.*

Калі вы не збіраецеся займацца размнажэннем лілей праз насенне, то адразу ж пасля таго як кусцік адцвіце, акуратна абарвіце кветкі, якія завялі. Калі сцябліна з лістамі не пашкоджана ніякай хваробай, яе трэба захаваць да восені. Гэта дазволіць сцябліне развівацца каранёвую сістэму і забяспечваць цыбуліну пажыўнымі рэчывамі. З першымі вовеньскімі замаразкамі сцёблы лілей абразаюць на ўзроўні зямлі. Калі правесці абрэзку вельмі высока, то рэшткі сцяблін будуць выступаць над снежным покрывам, што можа прывесці да падмярзання цыбулін.

Півоні ў вашым садзе

Півоні растуць на ўсіх відах глебаў. Толькі вось непрыдатныя для іх кіслыя і моцнашчолачныя. На лёгкіх супясчаных глебах у півоняў хутка развіваецца каранёвая сістэма, цвітуць на тыдзень раней звычайнага, але цвіценне бывае не вельмі моцным, кусты хутка старэюць.

Супясчаныя глебы можна палепшыць, калі дадаць крыху гліны і торфу. На гліністых глебах развіццё раслін затрымліваецца і цвіценне бывае больш маляўнічым і працяглым.

Лепшы час для пасадкі півоняў — з сярэдзіны жніўня да сярэдзіны верасня. Глыбіня ямы пад півоні — 70—80 см, шырыня — 50—60. На дно насыпаюць 1-1,5 вядра перагною, 100—200 г суперфасфату, 20—30 г калійных угнаенняў або жменьку попелу. Усё старанна перамешваюць, затым яму напаўняюць земляной сумессю і заліваюць вадой.

Свежы гной выкарыстоўваць не рэкамендуецца. Зямля ў пасадачнай яме павінна быць добра перамешана. Нельга засыпаць кампост у яму слаямі. Лёгка можа спаліць карані і камкаваты кампост. Больш шкоды, чым карысці прыносіць і залішняе ўнясенне перагною.

Пасадачныя ямы напаўняюць загадзя, каб зямля паспела асесці. Калі ж пасадка будзе праводзіцца ў хуткім часе пасля падрыхтоўкі ямы, зямлю трэба добра ўшчыльніць, інакш пры асяданні глебы могуць агаліцца каранёвыя шыйкі ці наадварот карані моцна заглыбяцца. У гэтым выпадку расліну трэба адкрыць і зноў пасадзіць, але ўжо на патрэбную глыбіню.

Верасень сухі і цёплы — да позняй зімы

Першы восеньскі месяц сумяшчае дзве пары года: калі настае «бабіна лета», забываешся на тое, што на дварэ восень, але ж сапраўднага цяпла ў верасні не чакай. Хоць удзень бывае цёпла, але верасняўскія ночы — не летнія. У народзе заўважалі, калі верасень сухі і цёплы — пазней надыдзе зіма.

Асноўныя садова-агародныя работы верасня звязаны са зборам ураджаю і падрыхтоўкай раслін да зімы.

У першую дэкаду верасня ў **садзе** пачынаюць перакопваць глебу, уносіць арганічныя ўгнаенні. Пад яблынямі і грушамі глыбіня перакопкі не павінна перавышаць 10—12 см, у вішань і сліў — 10 см (каб не пашкодзіць карані). Сухую глебу перакопваюць праз 2—3 дні пасля дажджу або паліву. Пасля збору садавіны, у пачатку лістапада (калі ападае 5—20 працэнтаў лістоў), кроны пладовых дрэў апырскваюць 5-працэнтнай мачавінай (500 г на 10 л вады) супраць паршы яблык і груш, гніляў і плямістасцяў.

Да сярэдзіны верасня павінна быць закончана восеньская пасадка суніц садовых (клубніц), таму што да канца вегетацыі расада павінна прыжыцца і разрасціся. Пасля пасадкі ў градах суніц праводзяць рыхленне і мульчыраванне глебы торфам або перагноем.

У сярэдзіне верасня ў кустоў парэчкі, агрэсту, маліны выразаюць секатарам усе пашкоджаныя галінкі. У пасадках маліны абразаюць каранёвыя атожылкі. У канцы верасня парасткі маліны першага года росту прыгінаюць да зямлі, падвязваючы адзін куст маліны да другога.

У агародзе трэба своечасова ўбраць цеплалюбівыя культуры: таматы, агуркі, баклажаны, перац, бо ў гэтым месяцы могуць быць замаразкі. Часам ад халаднаватага надвор'я перац робіцца бэзавафіялетавым, але смак ад гэтага не псуецца. З чырвоных пладоў, якія выспелі на градцы, можна сабраць насенне. Пры рэзкім пахаладанні невялікія кусты можна перасадзіць у пластмасавыя вёдры і перанесці ў памяшканне, на акне яны будуць працягваць расці і спець. Калі вы запазніліся са зборам баклажанаў, гэта можа прывесці да загрублення пладоў і яны будуць гаркаватыя на смак.

Першымі з караняплодаў убіраюць буракі сталовыя, таму што яны выступаюць над зямлёй і пры замаразках ім дастаецца больш за іншых караняплодаў. Моркву перад уборкай з вечара паліваюць, каб караняплоды былі сакавітыя. Зрэзаўшы маркоўнік, яе не мыюць і не сушаць, а складваюць у скрыні для захоўвання.

Сабраныя ў верасні кабачкі і патысоны можна захоўваць на працягу некалькіх тыдняў, загарнуўшы іх у паперу, альбо паклаўшы на ніжнюю паліцу халадзільніка. Гарбузы пажадана ўбраць да замаразкаў у сухое надвор'е.

У верасні працягваюць убіраць сярэдняспелыя гатункі капусты. З-за рэзкіх перападаў вільгаці і тэмпературы белакачанная ці чырвонакачанная капуста пачынае растрэсквацца, каб не дапусціць гэтага, трэба спыніць доступ вільгаці да каранёў.

Для многіх садаводаў работа ў **кветніку** — вельмі прыемны занятак. У верасні спыняюць паліванне руж, каб яны паспелі падрыхтавацца да зімы, і каб у іх спыніўся рост парасткаў, лепш выспела драўніна. Для таго ж прышчыкваюць верхавінкі маладых парасткаў. Да сярэдзіны месяца можна дзяліць і перакопваць шматгадовыя кветкі. Садзяць цыбульныя расліны: спачатку дробныя кветкі, а затым буйныя (гіяцынты, нарцысы, цюльпаны). Баразёнкі, падрыхтаваныя для пасадкі, паліваюць растворам марганцоўкі малінавага колеру і пасыпаюць пяском. Цыбуліны пратраўліваюць у растворы карбафосу (50 г на 10 л вады) на працягу 10—15 хвілін. Пасля пасадкі мульчыруюць торфам, перапрэлым гноем, а з надыходам маразоў уцяпляюць лісцем клёна ці дуба.

Як абараніцца ад пладажэркі і пладовай гнілі?

«Вось ужо другі год дрэвы ў нашым садзе апанавала пладажэрка, многія плады гінуць ад пладовай гнілі. Як змагацца з гэтай немаччу».

У. Сычоў, *Бярэзінскі раён.*

Пры своечасовым правядзенні механічных, агратэхнічных мерапрыемстваў і біялагічных сродкаў у барацьбе з пладажэркай можна абысціся без прымянення пестыцыдаў. Рана вясной ці ўвосень праводзіцца ачыстка штамбаў ад старой кары, прыбіранне і знішчэнне раслінных рэшткаў, перакопка глебы пад дрэвамі для знішчэння вусеняў.

З дзейных народных сродкаў можна параіць пасля цвіцення ў садзе развешваць бляшанкі з **кіслым малаком**, разбаўленым вадой 1:5. Раніцай вылаўлівайце з іх патанулых матылёў. Гэты спосаб дазваляе моцна скараціць колькасць шкоднікаў. Трэба сказаць, што дрэвы, крона ў якіх разрэджаная і добра праветрываецца, менш прыцягваюць матылькоў пладажэркі, чым дрэвы з густой кронай, таму штогадовая абрэзка садзейнічае барацьбе з гэтым шкоднікам.

У другой палове лета на ствалы дрэў накладваюць **лоўчыя паясы** для адлову вусеняў, якія запаўзаюць на іх для акуклівання. Папярэдне ствалы ў месцы знаходжання паясоў ачышчаюць ад адмерлай і адсталай кары, трэшчыны замазваюць глінай, змешанай з каравяком. Для паясоў выкарыстоўваюць гафраваную паперу шырынёй 20—25 см або мешкавіну, складзеную ўдвая. Ніжні край пояса ў адрозненне ад верхняга не павінен быць шчыльна прыціснуты да штамба. Пасля збору ўраджаю паясы здымаюць і знішчаюць.



Пры вялікай колькасці шкодніка і недастатковай эфектыўнасці агратэхнічных і механічных прыёмаў праз 2—3 тыдні пасля цвіцення трэба правесці апырскванне дрэў адным з інсектыцыдаў: **арыво, дэціс, каратэ, сумі-альфа, шэрпа**.

Ад пладовай **гнілі** (маніліёзу) трэба апырскаць плады прэпаратам **хорус** з дабаўленнем гаспадарчага мыла. Прычым спецыялісты раяць апрацоўваць па першых прыкметах хваробы (загнівання) і ў сухое надвор'е. Затым паўтарыць апрацоўку 1—3 разы праз 5—7 дзён, але не пазней чым за месяц да збору ўраджаю. У мэтах прафілактыкі ўсе пашкоджаныя плады — як на дрэве, так і ападзе — неабходна збіраць і спальваць, а сухія лісты можна кампасціраваць, перакладваючы слоем торфу або глебы. Пасля збору лістоў трэба перакапаць прыствольныя кругі, прарэзаць загушчаную крону.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 4801. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12